Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны»

**А. П. ГРАХОЦКІ**

# Прававое становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях (1863–1905 гг.)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гомель
ГДУ імя Ф. Скарыны
2017

УДК 94:348(476)„1863–1905”:271.2(476)-9:272/273(476)-9

**Грахоцкі, А. П.** Прававое становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях (1863–1905 гг.) / А. П. Грахоцкі ; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя. Ф. Скарыны, 2017. – 150 с. – ISBN 978-985-577-293-5

Манаграфія з'яўляецца комплексным даследаваннем прававога становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг. У ёй прааналізавана шырокае кола заканадаўчых актаў і нормаў кананічнага права, у якіх змяшчаліся асноўныя палажэнні прававога статусу рэлігійных канфесій у Расійскай дзяржаве, дадзена аўтарская характарыстыка мадэлі дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін у імперыі, выяўлены тэндэнцыі, пад уздзеяннем якіх фарміравалася прававое становішча канфесій, даследавана адміністрацыйная структура Цэркваў, асаблівасці прававога становішча праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства, прааналізавана спецыфіка прававога рэгулявання маёмаснага становішча Цэркваў.

Будзе карысна навуковым супрацоўнікам, выкладчыкам, студэнтам, практыкуючым юрыстам.

Рэкамендавана да выдання навукова-тэхнічным саветам установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

**Рэцэнзенты:**
доктар юрыдычных навук Т. І. Доўнар,
кандыдат юрыдычных навук Л. А. Краснабаева

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**ISBN 978-985-577-293-5**

© Грахоцкі А. П., 2017
© Установа адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», 2017

## ЗМЕСТ

Уводзіны………………………………………………… 4
Глава 1. Гістарыяграфія праблемы,
крыніцы і метады даследавання…………………………….. 7
Глава 2. Прававое становішча Рускай Праваслаўнай Царквы на беларускіх землях (1863–1905 гг.)…………….. 18
2.1 Афармленне прававога статусу Рускай Праваслаўнай Царквы ў заканадаўстве Расійскай імперыі…………….. 18
2.2 Адміністрацыйная структура
Рускай Праваслаўнай Царквы…………………………….. 26
2.3 Прававое становішча
праваслаўнага духавенства…………..…………………… 39
2.4 Прававое рэгуляванне маёмаснага становішча
Рускай Праваслаўнай Царквы…………………………… 57
Глава 3. Прававое становішча Рымска-каталіцкай Царквы на беларускіх землях (1863–1905 гг.)…………………… 68
3.1 Афармленне прававога статусу Рымска-каталіцкай Царквы ў заканадаўстве Расійскай імперыі……………. 68
3.2 Адміністрацыйная структура
Рымска-каталіцкай Царквы………..……………………… 75
3.3 Прававое становішча
рымска-каталіцкага духавенства…..………..................... 91
3.4 Прававое рэгуляванне маёмаснага становішча
Рымска-каталіцкай Царквы……………………………. 109
Заключэнне……………………………………………… 117
Бібліяграфічны спіс……………………………………... 125

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# УВОДЗІНЫ

На працягу многіх стагоддзяў Хрысціянства адыгрывала ролю галоўнага культурна-каштоўнаснага падмурка еўрапейскага грамадства. Асновы хрысціянскага веравучэння былі і застаюцца па сённяшні дзень важнай крыніцай сучаснага права. Зыходзячы з гэтага, даследаванні рэлігійнага права, прававога рэгулявання дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін, прававога становішча хрысціянскіх канфесій з’яўляюцца неад’емнай часткай навуковай праблематыкі. Аднак у розныя гістарычныя перыяды сутнасць і накірункі такіх даследаванняў залежалі ад дамінуючых ідэалагічных падыходаў. Усёабдымная сацыяльная трансфармацыя, выкліканая атрыманнем Беларуссю дзяржаўнага суверэнітэту, актуалізавала неабходнасць аб’ектыўнай пераацэнкі ролі рэлігійнага фактару ў айчыннай гісторыі і ступені яго ўплыву на фарміраванне нацыянальнай прававой сістэмы.

Пераасэнсаванне духоўных каштоўнасцей на мяжы 80-х–90-х гадоў ХХ ст. прывяло да росту ўзроўню рэлігійнасці беларускага грамадства. Каля 65% дарослага насельніцтва Беларусі лічаць сябе веруючымі. Сярод веруючых прыкладна 81% праваслаўных, 10,5% католікаў, 1% іўдзеяў, 0,5% пратэстантаў і столькі ж мусульман [198, с. 44]. Дадзеныя лічбы сведчаць аб узрастанні грамадскага прэстыжу і рэальнай ролі рэлігіі, рэлігійных канфесій у сацыяльных працэсах. Беларуская Праваслаўная і Рымска-каталіцкая Цэрквы, як найбольш масавыя і ўплывовыя інстытуты грамадзянскай супольнасці, знаходзяцца ў пастаянным супрацоўніцтве з дзяржавай у разнастайных сацыяльных сферах.

12 чэрвеня 2003 г. было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой, у адпаведнасці з якім былі вызначаны прыярытэтныя накірункі сумеснай дзейнасці дзяржавы і Царквы: грамадская мараль; выхаванне і адукацыя; культура і творчая дзейнасць; ахова, аднаўленне і развіццё гістарычнай і культурнай спадчыны; ахова здароўя; сацыяльнае забеспячэнне; міласэрнасць; дабрачыннасць; падтрымка інстытута сям’і, бацькоўства і дзяцінства; апека над асобамі, што знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі; выхаваўчая, сацыяльная і псіхалагічная работа з ваеннаслужачымі; ахова навакольнага асяроддзя [226].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Традыцыйнымі і ўстойлівымі сталі кантакты кіраўніцтва беларускай дзяржавы з Маскоўскай Патрыярхіяй. На якасна новы ўзровень выйшла ўзаемадзеянне Рэспублікі Беларусь і Ватыкана [113; 114]. Для далейшай гарманізацыі партнёрскіх узаемаадносін паміж дзяржавай і вядучымі хрысціянскімі канфесіямі ў рэгіёне, забеспячэння міжканфесійнай згоды і ўдасканальвання нацыянальнай мадэлі дзяржаўна-царкоўных адносін значымым з'яўляецца вывучэнне гістарычнага вопыту рэгламентацыі прававога статусу рэлігійных аб'яднанняў.

Генетычна першаснай хрысціянскай канфесіяй на беларускіх землях з'яўляецца Праваслаўная Царква. Шырокае распаўсюджванне Праваслаўя на тэрыторыі нашай краіны пачалося з Х ст. Менавіта Праваслаўнае Хрысціянства стаяла ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці і на працягу многіх стагоддзяў вызначала сацыякультурнае аблічча рэгіёна. З 1385 г. на беларускіх землях распачалося распаўсюджванне Рымскага каталіцызму. Адносіны паміж гэтымі двума Хрысціянскімі Цэрквамі адлюстроўвалі спецыфіку міжканфесійнага і, больш за тое, міжцывілізацыйнага супрацьстаяння на беларускіх землях. Палітыка-прававая дыскрымінацыя Праваслаўнай Царквы ў Вялікім княстве Літоўскім (у перыяд пасля Крэўскай уніі) і затым у Рэчы Паспалітай негатыўна паўплывала на натуральны ход этнакультурнага развіцця беларускага народа, прывяла да страты (паланізацыі) нацыянальнай эліты.

Далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі не прывяло да імгненных змен у канфесійным ландшафце рэгіёну. Паўстанні 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг. з'яўляліся яскравым пацвярджэннем далейшага абвастрэння міжканфесійнага і міжэтнічнага супрацьстаяння на тэрыторыі Беларусі. Рымска-каталіцкая Царква, якая падтрымлівала паўстанцкі рух, прыязна ставілася да ідэі аднаўлення Рэчы Паспалітай і імкнулася да вяртання сваіх дамінуючых пазіцый у краі, з'яўлялася асноўным праваднікам ідэй польскасці на беларускіх землях. Руская Праваслаўная Царква ва ўмовах мадэрнізацыі («Вялікіх рэформ» Аляксандра II) і інтэграцыі Паўночна-Заходняга краю ў склад Расійскай імперыі разглядалася расійскімі ўрадавымі і грамадскімі коламі як асноўны маркер рускай нацыянальнай ідэнтычнасці (рэлігійна-этнічнай супольнасці велікарусаў, маларосаў і беларусаў) [32, с. 129–150; 135, с. 31–41].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Такім чынам, праваслаўная і рымска-каталіцкая канфесіі ў адзін са складаных і неадназначных перыядаў айчыннай гісторыі (1863–1905 гг.) апынуліся ў цэнтры руска-польскага супрацьстаяння, ад вынікаў якога залежаў далейшы вектар цывілізацыйнага развіцця Беларусі. Менавіта гэтымі акалічнасцямі абумоўлены выбар храналагічных рамак дадзенага даследавання. Ніжняя храналагічная мяжа звязана з рэалізацыяй новага ўрадавага курсу на беларускіх землях пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. Верхняй мяжой служыць дата прыняцця ўказа аб верацярпімасці ад 17 красавіка 1905 г., які істотна змяніў характар дзяржаўна-канфесійных адносін у краі. Зыходзячы з таго, што шэраг заканадаўчых актаў, які рэгламентаваў прававое становішча канфесій на беларускіх землях у даследуемы перыяд, прымаўся на працягу XVIII–першай паловы XIX ст., у мэтах больш поўнага і дакладнага асвятлення тэмы ў некаторых выпадках дапускаецца выхад за храналагічныя рамкі работы. Геаграфічнымі межамі даследавання з'яўляюцца беларускія землі, што ўваходзілі ў склад Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў Расійскай імперыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ГЛАВА 1
# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Вывучэнне навуковай літаратуры па тэме даследавання сведчыць аб адсутнасці спецыяльных работ, прысвечаных аналізу прававога становішча Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг. Аднак нельга абыйсці ўвагай кола даследаванняў, у якіх закранаюцца асобныя пытанні прававога статусу канфесій і дзяржаўна-канфесійных адносін у Расійскай імперыі ў адзначаны перыяд.

Першыя спробы асэнсавання праблем дзяржаўна-царкоўных і міжканфесійных стасункаў у Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі ажыццяўляліся яшчэ *дарэвалюцыйнымі навукоўцамі*. Комплекс урадавых мерапрыемстваў (палітыка Віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва і яго паслядоўнікаў), скіраваных на падаўленне паўстання 1863–1864 гг., прадухіленне актыўнага ўдзелу ў ім рымска-каталіцкага духавенства і адраджэнне пазіцый Праваслаўнай Царквы ў краі разгледжаны ў работах М.В. Каяловіча, П.Н. Бацюшкава, А.І. Мілавідава, А.П Уладзімірава, Г.Я. Кіпрыяновіча, П. Марозава, І. Наўмовіча, І.А. Нікоціна, Д. Чыхачова [118–120; 4; 137–140; 20–21; 107–108; 143; 151; 154–155; 263]. Аднак спецыфіка прававога становішча праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій у беларуска-літоўскім рэгіёне не разглядалася ў работах гэтых аўтараў у якасці прадмета комплекснага навуковага даследавання.

Праблемам царкоўнага права ў Расійскай імперыі прысвечаны працы вучоных-кананістаў М.С. Суворава, А.С. Паўлава, І.С. Берднікава. У гэтых даследаваннях разглядалася эвалюцыя мадэлі дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін у Расіі, асаблівасці кананічнага права хрысціянскіх канфесій [231; 164; 10–11]. Практыка прымянення рэлігійных нормаў у рэгуляванні грамадскіх адносін у імперыі аналізавалася ў работах спецыялістаў у галіне грамадзянскага (К. Пабеданосцаў), сямейнага (М. Гарчакоў, С. Грыгароўскі, І. Аршанскі), крымінальнага (А. Лохвіцкі, М. Таганцаў) права [34; 36; 131; 161; 168; 234–235].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Грунтоўны аналіз становішча праваслаўнага прыходскага духавенства ў Расійскай імперыі здзейсніў П.В. Знаменскі [92]. Над напісаннем гісторыі Мінскай і Літоўскай праваслаўных епархій у XIX ст. працавалі М.Д. Ізвекаў і С.Г. Рункевіч [95; 203].

Істотная праца была праведзена расійскімі дарэвалюцыйнымі даследчыкамі па збору і сістэматызацыі імперскага заканадаўства аб прававым рэгуляванні дзейнасці праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій, пастаноў Найсвяцейшага Сінода, дакументаў з адміністрацыйнай практыкі духоўных кансісторый [5; 89; 159; 202; 207; 256; 257].

*У першае дзесяцігоддзе савецкай улады ў Беларусі*, ва ўмовах палітыкі беларусізацыі, з'явіліся працы У.М. Ігнатоўскага і А.І. Цвікевіча. Абодва даследчыкі сцвярджалі, што ў другой палове XIX–пачатку XX ст. Праваслаўная Царква, як саюзнік манархіі, выкарыстоўвалася імперскімі ўладамі ў якасці інструмента русіфікацыйнай палітыкі на беларускіх землях [94; 260].

Першы ў савецкай гістарыяграфіі шырокі агляд гісторыі Рускай Праваслаўнай Царквы, напісаны ў рэчышчы марксісцка-ленінскай атэістычнай ідэалогіі, належыць М.М. Нікольскаму. Яго праца «История русской церкви» выйшла ў 1931 г. і затым перавыдавалася ў 1983 і 1988 гадах [153]. У рабоце пастуліраваўся тэзіс аб рэакцыйнай ролі Царквы, якая з'яўлялася інструментам занявольвання працоўных масаў эксплуататарскімі класамі. Абгрунтаванне высноў аб супрацоўніцтве самадзяржаўя і Рускай Праваслаўнай Царквы ў справе падаўлення народных рэвалюцый працягвалася ў работах А.Ф. Грэкулава, П.М. Зыранава [35; 93]. Аб адпаведнай ролі Ватыкана ў расійскай і беларускай гісторыі пісалі Я.М. Мараш, П.М. Кірушын, М.М. Шэйнман, Э. Вінтэр [133–134, 109; 265–266; 17].

У час хрушчоўскай адлігі стаў магчымым зварот савецкіх гісторыкаў да вывучэння падзей паўстання 1863–1864 гг. Аб ролі рымска-каталіцкага духавенства ў паўстанцкім руху і рэпрэсіях супраць кліру ў час і пасля паўстання 1863–1864 гг. пісалі А.Ф. Смірноў, В.М. Зайцаў, С.М. Самбук [224; 88; 206].

Да пытанняў прававога становішча рэлігійных аб'яднанняў у Расійскай імперыі звяртаўся савецкі вучоны-правазнаўца В.В. Клачкоў [110–111]. Нягледзячы на ідэалагізаванасць высноў аўтара, яго даследаванні, якія грунтаваліся на разглядзе шырокага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кола заканадаўчых актаў, унеслі істотны ўклад у гісторыка-прававую навуку.

*Пасля набыцця Беларуссю дзяржаўнага суверэнітэту* імкліва ўзрос інтарэс даследчыкаў да канфесійнай праблематыкі. Значным дасягненнем беларускай гістарыяграфіі было выданне калектыўнай працы «Канфесіі на Беларусі» [104]. Другая глава кнігі прысвечана разгляду канфесійнай палітыкі расійскіх улад на беларускіх землях у 1861–1904 гг. Яе аўтар В.В. Грыгор’ева (Яноўская) разгледзела адносіны ўрада да Праваслаўя, Каталіцтва, Стараверства і Пратэстантызму [104, с. 58–110]. Вынікам далейшых навуковых пошукаў даследчыцы сталася выданне ў 2002 г. манаграфіі «Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863–1914 гг.» [268]. У гэтых працах разглядаецца епархіяльная структура канфесій, колькасць духавенства, паствы, храмаў, манастыроў і рэлігійных дабрачынных арганізацый, функцыянаванне сістэмы духоўнай адукацыі, роля кліру ў падзеях паўстання 1863–1864 гг. Аднак пытанні прававога статусу хрысціянскіх канфесій у рэгіёне амаль не закранаюцца ў названых работах.

Асаблівасці расійскай канфесійнай палітыкі ў Беларусі, спецыфіка міжканфесійных узаемаадносін у XIX ст. і на пачатку XX ст. разглядаюцца ў даследаваннях В.М. Лінкевіча, В.В. Табунова, А.М. Філатавай [126; 232–233; 251–252]. У той жа час у дадзеных працах, на нашу думку, не надаецца належнай увагі заканадаўчым асновам дзейнасці расійскай адміністрацыі ў краі, амаль адсутнічае аналіз правапрымяняльнай практыкі мясцовых улад.

У 2008 г. выйшла манаграфія А.І. Ганчара «Римско-католический костёл в Беларуси (1864–1905 гг.)». Асобная глава ў гэтым даследаванніпрысвечана прававому становішчу Рымска-каталіцкай Царквы ў Расійскайімперыі [26, с. 41–50]. Аднак матэрыял, выкладзены ў гэтай главе, мае абагульняючы характар: аўтар абмежаваўся сціслым аглядам расійскага заканадаўства адносна каталіцкай канфесіі. За межамі даследавання засталіся пытанні прававога становішча рымска-каталіцкага духавенства, прававога рэгулявання маёмаснага становішча Царквы.

Рэлігійная палітыка імперскага ўрада ў 1861–1900 гг. разглядалася ў манаграфіі А.Ф. Свіб [210, с. 31–48]. Даследчыца характарызавала Праваслаўную Царкву як інструмент расійскіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

улад у правядзенні палітыкі русіфікацыі Беларусі. У той жа час аўтар не адзначыла ролю Рымска-каталіцкай Царквы ў працэсе паланізацыі беларусаў. А.Ф. Свіб апісала анцікаталіцкія ўрадавыя мерапрыемствы, што праводзіліся на беларускіх землях у перыяд пасля паўстання 1863–1864 гг, аднак не вызначыла прычыны іх рэалізацыі і наступствы адпаведнай палітыкі ўлад.

А.Ю. Бендзін у сваіх артыкулах робіць спробу рэканструкцыі веравызнаўчай сістэмы Расійскай імперыі, тлумачыць асаблівасці разумення паняцця «верацярпімасць» у імперскім дыскурсе [6–8]. Праблемам верацярпімасці ў Паўночна-Заходнім краі прысвечана яго манаграфія [9]. Аўтар даследаваў гэты феномен праз прызму ўзаемаадносін дзяржавы, Праваслаўя і Каталіцтва ў перыяд пасля паўстання 1863–1864 гг. і да Першай сусветнай вайны. У даследаванні разглядаюцца канфесійная палітыка М.М. Мураўёва і яго пераемнікаў, кампанія па масавым пераходзе католікоў у Праваслаўе і яе наступствы, палітыка «распалячвання» Каталіцкай Царквы, асаблівая ўвага ў кнізе надаецца аналізу зменаў у прававым рэгуляванні дзейнасці канфесій пасля выдання імператарскага ўказа ад 17 красавіка 1905 г.

У пабудове аўтарскай канцэпцыі даследавання аўтар абапіраўся на даследаванні айчынных навукоўцаў у вобласці тэорыі і гісторыі дзяржавы і права: А.Ф. Вішнеўскага, Т.І. Доўнар, С.Р. Драбязкі, С.А. Калініна [19; 78–80; 82–85; 99–103].

Вывучэнне канфесійнай праблематыкі актывізавалася і ў *сучаснай расійскай навуцы*. Расійская юрыдычная навука перажывае сёння сапраўдны бум дысертацыйных даследаванняў, прысвечаных прававым аспектам дзяржаўна-канфесійных адносін. Прававое становішча Рускай Праваслаўнай Царквы ў перыяд правядзення царкоўнай рэформы Пятра І разгледжана ў кандыдацкай дысертацыі М.Г. Дробінай [81]. Спецыфіку ўзаемадзеяння Царквы і дзяржаўных органаў у працэсе барацьбы з рэлігійнымі злачынствамі ў XIX–пачатку XX ст. даследаваў В.Ф. Левін [124–125]. Роля міністэрства ўнутраных спраў у прававым рэгуляванні дзейнасці неправаслаўных веравызнанняў у Расійскай імперыі прааналізавана ў доктарскай дысертацыі А.С. Лук'янава [132]. Над праблемамі царкоўнага права працавалі А.П. Гаранава, А.А. Дорская [30; 76–77].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пытанні прававога статусу Рускай Праваслаўнай Царквы ў Савецкім Саюзе разгледжаны ў работах А.М. Пецюковай, І.А. Шаршнёвай-Цытульскай [167; 267]. Прававому становішчу рэлігійных аб'яднанняў у сучаснай Расіі прысвечаны дысертацыі Т.Ю. Архірэйскай, А.М. Гудзяніцы, Я.Л. Шапашнікава [2; 37; 264].

У два апошнія дзесяцігоддзі выйшаў шэраг грунтоўных прац расійскіх гісторыкаў. У даследаваннях С.В. Рымскага разглядаліся царкоўныя рэформы Аляксандра ІІ [199–201]. Вывучэннем праблем функцыянавання інстытута Найсвяцейшага Сінода і дзейнасці яго обер-пракурора займаліся С.І. Аляксеева, А.Ю. Палуноў [1; 196]. Пытанні гісторыі Рускай Праваслаўнай Царквы ў познаімперскі перыяд разгледжаны ў манаграфіях М.А. Бабкіна, С.Л. Фірсава. Гэтыя гісторыкі пераканаўча паказалі, што на пачатку ХХ ст. у асяродку праваслаўнага духавенства актывізаваўся рух за абнаўленне Праваслаўнай Царквы і вызваленне яе ад празмернага дзяржаўнага кантролю [3; 253].

Актыўнай навуковай працай займаюцца і некаторыя расійскія царкоўныя дзеячы. Шэраг работ па гісторыі Рускай Праваслаўнай Царквы, царкоўнаму праву належыць протаіерэю Уладзіславу Цыпіну [261–262]. Праваслаўны святар Аляксей Ніколін ажыццявіў аналіз узаемаадносін Царквы і дзяржавы на розных гістарычных этапах з пункту гледжання кананічнага права [152].

Узбагацілася і расійская гістарыяграфія рымска-каталіцкай канфесіі. Гісторыі і прававому становішчу Рымска-каталіцкай Царквы ў Расіі прысвечана манаграфія В.А. Ліцэнбергер [130]. Асноўная ўвага даследчыцы была скіравана на асвятленне падзей, што разварочваліся ў Ціраспальскай рымска-каталіцкай епархіі. У 2005 г. была абаронена яе доктарская дысертацыя [129]. Гэта работа стала першым у расійскай гістарыяграфіі даследаваннем, у якім быў праведзены параўнальны аналіз прававога становішча іншаслаўных хрысціянскіх канфесій у Расійскай імперыі.

Шырокае асвятленне ў сучаснай расійскай гістарычнай навуцы атрымалі праблемы імперскай канфесійнай палітыкі [18; 141–142; 236–237]. Гісторыкі Л.Я. Гарызонтаў, М.Д. Далбілаў, А.А. Камзолава, А.І. Міллерў сваіх даследаваннях, прысвечаных расійскай урадавай палітыцы на заходніх ускраінах

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

імперыі, разглядалі і ўзаемаадносіны расійскай адміністрацыі з хрысціянскімі канфесіямі ў рэгіёне [32–33; 72–75; 90; 115; 135–136].

У 2010 г. выйшла манаграфія М.Д. Далбілава, прысвечаная этнаканфесійнай палітыцы імперыі ў беларуска-літоўскім рэгіёне ў эпоху Аляксандра II [74]. Даследчык прааналізаваў імперскія падыходы да прававога рэгулявання дзейнасці «замежных» веравызнанняў: на прыкладзе Рымскага каталіцтва, Іўдаізму і Уніяцтва аўтар адлюстраваў спецыфіку расійскай верацярпімасці, якая, на яго думку, спалучала ў сабе апеку і рэпрэсіі, дысцыплінаванне і дыскрэдытацыю канфесій. У манаграфіі змяшчаецца аналіз палітыкі віленскай адміністрацыі, якая ўвабрала ў сябе ўладныя ініцыятывы па пераводу католікоў у Праваслаўе, «распалячванню» Каталіцкай Царквы, ліквідацыі Мінскай рымска-каталіцкай епархіі.

Значная ўвага праблемам узаемаадносін расійскіх улад і Рымска-каталіцкай Царквы ў Беларусі традыцыйна надаецца ў *даследаваннях польскіх навукоўцаў*. Для шэрагу работ польскіх гісторыкаў (А. Важынскі, С. Кшэменскі, Р. Архутоўскі, П. Кубіцкі) характэрна тэндэнцыйнасць, апалогія дзейнасці Рымска-каталіцкай Царквы, адназначна негатыўная ацэнка канфесійнай палітыкі расійскіх улад. Гэтыя даследчыкі, вызначаючы беларускія землі як неад'емную частку Польшчы, характарызавалі Каталіцкую Царкву як найважнейшы фактар захавання польскіх нацыянальных традыцый, мовы і культуры на «ўсходніх крэсах» ва ўмовах «расійскага панавання» [279; 272; 274; 269; 273]. Сучасныя польскія гісторыкі М. Радван, Е. Яблоньска-Дэптула, Л. Яськевіч, В. Радкевіч засяроджваюць сваю ўвагу на этнаканфесійнай праблематыцы, адзначаюць істотны ўплыў канфесійнай палітыкі на нацыятворчыя працэсы ў беларуска-літоўскім рэгіёне [276; 270; 271; 278]. Вялізная археаграфічная праца па пошуку, сістэматызацыі і апублікаванні крыніц па гісторыі Рымска-каталіцкай Царквы ў Расійскай імперыі здзейснена прафесарам Каталіцкага ўніверсітэта ў Любліне М. Радванам [106; 275].

*Літоўскі* даследчык Д. Сталюнас у сваіх артыкулах звярнуў увагу на такія важныя для нашай работы пытанні, як мерапрыемствы адміністрацыі М.М. Мураўёва ў дачыненні да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Рымска-каталіцкай Царквы, увядзенне рускай мовы ў касцёлах Паўночна-Заходняга краю [228–230].

Істотны гістарыяграфічны пласт уяўляюць сабой працы *заходнееўрапейскіх і амерыканскіх гісторыкаў-русістаў*. Амерыканскі гісторык Г. Фрыз у сваіх артыкулах апісаў ролю праваслаўных кансісторый у кантролі над шлюбам і разводам у Расійскай імперыі, надаў увагу аналізу дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін у позніімперскі перыяд [254–255].

Роля рэлігійнага фактару ў палітыцы імперыі на беларуска-літоўскіх землях разгледжана ў работах Т. Уікса [16]. Узаемаадносінам імперскіх улад і канфесій нададзена ўвага ў даследаваннях Р. Вульпіўса, А. Капэлера, М. ван Крэвельда, А. Рэнэра, П. Верта [25; 105; 121, с. 328–347; 277; 280]. Месца Праваслаўя ў імперскай ідэалогіі асэнсоўваецца ў даследаваннях Р. Уортмана, Д.С. ван дер Ойе [23; 243; 160].

*Найважнейшай групай крыніц* па тэме даследавання з'яўляюцца нарматыўныя прававыя акты Расійскай імперыі: законы і ўказы імператараў, цыркулярныя распараджэнні цэнтральных і мясцовых органаў улады, указы Найсвяцейшага Сінода. Гэтыя дакументы знаходзяцца як у архіўных фондах, так і ў апублікаваных зборніках.

Вялізны масіў заканадаўчых актаў змяшчаецца ў «Полном собрании законов Российской империи». Гэты зборнік налічвае 133 тамы і ахоплівае заканадаўчыя акты, выдадзеныя ў перыяд з 1649 г. па 1913 г. У ім апублікаваны ўказы імператара, зацверджаныя манархам пастановы Камітэта міністраў, «мнения» Дзяржаўнага савета, указы Правячага Сената, Найсвяцейшага Сінода і шэраг іншых дакументаў. У зборніку змяшчаюцца найважнейшыя крыніцы па вывучэнні прававога статусу канфесій – «Духоўны рэгламент» Рускай Праваслаўнай Царквы, імператарскія ўказы аб стварэнні епархій, Рымска-каталіцкай Духоўнай калегіі ў Санкт-Пецярбургу і інш. [169–195].

Не менш істотнае значэнне мае 16-цітомны «Свод законов Российской империи», які ўпершыню быў выдадзены ў 1832 г. і затым неаднаразова перавыдаваўся (у 1842, 1857, 1892 гг.). У Зводзе законаў змяшчаліся тыя ці іншыя заканадаўчыя нормы, звязаныя з правамі і абавязкамі праваслаўных і католікаў: «Основные государственные законы» [211], «Устав лесной» [213], «Законы о состояниях» [214], «Законы гражданские» [215],



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«Устав строительный» [248], «Устав о цензуре и печати» [247], «Устав о паспортах и беглых» [245], «Устав о предупреждении и пресечении преступлений» [246], «Уложение о наказаниях уголовных и исправительных» [219; 241] і іншыя. У структуру Звода законаў уваходзіў і «Свод учреждений и уставов Управления Духовных Дел иностранных исповеданий христианских и иноверных» – важнейшая крыніца па вывучэнні афіцыйнага статусу «замежных» хрысціянскіх канфесій у імперыі [217; 218].

Крыніцай па вывучэнні прававых асноў дзейнасці праваслаўных духоўных кансісторый з'яўляецца выдадзены ў 1841 г. «Устав духовных консисторий» [244]. Аналіз Статута дазваляе высветліць кампетэнцыю, структуру гэтага органа, парадак вядзення справаводства, механізмы супрацоўніцтва духоўных кансісторый з дзяржаўнымі органамі ўлады.

Акрамя таго, нарматыўныя прававыя акты, якія вызначалі прававое становішча хрысціянскіх канфесій у імперыі, дастаткова поўна прадстаўлены ў шматлікіх зборніках дакументаў, выдадзеных даследчыкамі ў розныя гістарычныя перыяды [5; 39; 89; 159; 207–208; 257].

Шэраг заканадаўчых і падзаконных актаў (цыркуляраў міністраў, віленскіх генерал-губернатараў, мясцовых губернатараў) змяшчаецца ў фондах Нацыянальных гістарычных архіваў Беларусі ў г. Мінску (НГАБ у г. Мінску) і г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). Асаблівую каштоўнасць у гэтай сувязі маюць фонды канцылярый грамадзянскіх губернатараў, што знаходзяцца у НГАБ у г. Мінску: фонд 295 (Мінская губ.), 1430 (Віцебская), 2001 (Магілёўская) [41; 59–60; 65–66; 259]. Адпаведныя дакументы па Гродзенскай губерні змяшчаюцца ў фондзе 1 НГАБ у г. Гродна [258].

Матэрыялы дзяржаўнага справаводства адлюстроўваюць механізмы распрацоўкі, прыняцця, рэалізацыі заканадаўчых і адміністрацыйных ініцыятыў цэнтральных і мясцовых органаў улады ў дачыненні да праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій у Беларусі. Справаводчыя дакументы знаходзяцца ў фондах 295, 1430, 2001, 299 (Мінскае губернскае праўленне), 1461 (Віцебскае губ. праўл.), 2003 (Магілёўскае губ. праўл.) НГАБ у г. Мінску і фондах 1, 2 (Гродзенскае губ. праўл.) НГАБ у г. Гродна [42–43; 46; 50–51; 55–57; 58; 63–64; 165–166].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Матэрылы справаводства царкоўных органаў змяшчаюцца ў фондах праваслаўных і рымска-каталіцкіх духоўных кансісторый: 136 (Мінская праваслаўная), 2301 (Магілёўская праваслаўная), 2531 (Полацкая праваслаўная), 1781 (Магілёўская рымска-каталіцкая), 937 (Мінская рымска-каталіцкая) у НГАБ у г. Мінску, а таксама ў фондзе 561 (Гродзенская праваслаўная духоўная кансісторыя) у НГАБ у г. Гродна. Гэтыя фонды змяшчаюць указы Сінода, пастановы і інструкцыі царкоўных іерархаў, загады і справаздачы кансісторый, заклікі да веруючых, звароты да дзяржаўных органаў. У дадзеных фондах знаходзіцца вялізная колькасць спраў, якія адлюстроўваюць юрысдыкцыю канфесій у сферы рэгулявання шлюбна-сямейных адносін, дэманструюць спецыфіку кансісторскіх шлюбаразводных працэсаў [40; 44–45; 47–49].

*Метадалагічную аснову даследавання* склалі разнастайныя па сваім характары і накіраванасці прынцыпы і метады навуковага пазнання. Падчас правядзення даследавання першараднае значэнне надавалася прынцыпу гістарызму. У адпаведнасці з ім вывучэнне прававога становішча канфесій на беларускіх землях ажыццяўлялася з улікам генезісу праблем фарміравання іх афіцыйнага статусу ў Расійскай імперыі. Гэта акалічнасць прымушала нас адыходзіць ад вызначаных храналагічных рамак, звяртацца да разгляду важнейшых заканадаўчых актаў аб прававым рэгуляванні дзейнасці праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій, якія прымаліся на працягу XVIII–першай паловы XIX ст.

Аксіалагічны прынцып садзейнічаў асвятленню разнастайных гістарычных фактаў і аналізу тагачасных прававых нормаў з пазіцый нацыянальных духоўных каштоўнасцяў. Прымяненне аксіалагічнага падыходу ў спалучэнні з прынцыпам аб’ектыўнасці стрымлівала нас ад выказвання суб’ектыўных ацэнак ролі Праваслаўя і Рымскага каталіцызму ў айчыннай гісторыі, садзейнічала ўсведамленню гістарычнага ўкладу канфесій у гісторыю і культуру народа Беларусі.

Практычным інструментарыем з’яўляліся як агульна-навуковыя (параўнальны, аналізу, сінтэзу, індукцыі, дэдукцыі), так і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны), спецыяльна-прававыя метады (параўнальна-прававы, структурна-прававы, сістэмна-прававы, тлумачэння прававых нормаў).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Параўнальна-супастаўляльны аналіз дазволіў нам вызначыць агульнае і асаблівае ў прававым становішчы праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій на беларускіх землях. Гісторыка-генетычны метад дапамог раскрыць дынамізм дзяржаўна-канфесійных адносін, вызначыць змены парадзігмаў расійскай канфесійнай палітыкі ў краі.

Параўнальна-прававы метад дазволіў супаставіць нарматыўна-прававыя акты, што рэгламентавалі прававое становішча канфесій у Расійскай імперыі, выявіць іх характэрныя асаблівасці, аналогіі, калізіі, адрозненні паміж імі. Сістэмна-прававы метад садзейнічаў вылучэнню заканадаўчых нормаў аб прававым становішчы Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў у якасці падсістэм агульнай сістэмы расійскага імперскага права. Спецыфіка даследавання патрабавала выкарыстання структурна-прававога метаду, паводле якога зварот да заканадаўства, што на сённяшні дзень згубіла юрыдычную сілу, з'яўляецца неабходнай перадумовай для разумення сучасных працэсаў і выпрацоўкі адпаведных рэкамендацый на будучыню. Дзеля раскрыцця сэнсу і аналізу імперскіх прававых нормаў, у мэтах вызначэння правільнасці (ці няправільнасці) іх прымянення ў канкрэтных гістарычных абставінах намі выкарыстоўваліся разнастайныя прыёмы тлумачэння нормаў права: граматычны (філалагічны), сістэматычны, гісторыка-палітычны.

Такім чынам, канфесійная праблематыка традыцыйна выклікае інтарэс гісторыкаў і правазнаўцаў, аднак накірункі навуковага пошуку і аўтарскія ацэнкі ў розныя часы залежалі ад дамінуючых ідэалагічных падыходаў. Істотны ўклад у распрацоўку праблемы ўнеслі дарэвалюцыйныя навукоўцы, якія ажыццяўлялі даследаванні праблем царкоўнага права, вывучалі асаблівасці мадэлі дзяржаўна-канфесійных адносін у Расійскай імперыі, спецыфіку канфесійнай палітыкі расійскай адміністрацыі на заходніх ускраінах імперыі. Савецкія гісторыкі і правазнаўцы, якія працавалі ў рэчышчы марксісцка-ленінскай атэістычнай ідэалогіі, давалі негатыўныя ацэнкі ролі рэлігіі ў жыцці грамадства, абгрунтоўвалі высновы аб тым, што Праваслаўная і Рымска-каталіцкая Цэрквы выступалі саюзнікамі пануючых класаў у працэсе эксплуатацыі народных масаў. У сучаснай навуцы адбываецца пераасэнсаванне ролі рэлігійных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

канфесій у працэсе грамадскага развіцця, удасканальваюцца метадалагічныя падыходы, істотна пашыраецца крыніцавая база даследаванняў (за кошт выяўлення шырокага пласта невядомых да гэтага часу архіўных крыніц, выдання зборнікаў дакументаў), пашыраецца праблематыка даследаванняў, аднак пытанні прававога становішча праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій на беларускіх землях у 1863–1905 гг. даследаваны толькі фрагментарна, таму на сённяшні дзень выразна выявілася задача глыбокага і цэласнага тэарэтычнага асэнсавання гэтай праблематыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ГЛАВА 2
# ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ (1863–1905 гг.)

## 2.1 Афармленне прававога статусу Рускай Праваслаўнай Царквы ў заканадаўстве Расійскай імперыі

Усходнеславянскі рэгіён, які пераняў Хрысціянства ад Візантыі, спрадвеку з'яўляецца кананічнай тэрыторыяй Праваслаўнай Царквы. Менавіта праваслаўная рэлігія была першапачатковым універсальным сацыяльным рэгулятарам на тэрыторыі сучасных рускіх, украінскіх і беларускіх зямель. Аднак на працягу гістарычнага працэсу рэлігія паступова страчвала гэты статус, саступаючы пазіцыі іншым сацыяльным рэгулятарам, у першую чаргу, праву [101, с. 49; 103, с. 130–131]. Права і рэлігія – гэта рознапрыродныя сацыяльныя рэгулятары, якія маюць уласныя мэты і межы ўздзеяння. Разнастайныя задачы і спосабы інстытуцыялізацыі права і рэлігіі прадугледжваюць наяўнасць узаемных чаканняў і прэтэнзій на рэгуляванне з улікам уласных пазіцый: «В итоге такое взаимодействие порождает одновременные тенденции участия государства в регламентации внешних проявлений сакральных отношений и наличие у религиозных организаций собственных представлений о роли и функциях государства в социуме, что может приводить к определённому конфликту (коллизии) мировоззренческих ожиданий» [101, с. 42]. Права само па сабе не мае ўласнай сістэмы каштоўнасцей, яно толькі надае форму тым каштоўнасцям, якія склаліся ў межах іншых сацыяльных рэгулятараў. Таму права можа абараняць рэлігійную маральнасць і духоўныя каштоўнасці, калі апошнія адпавядаюць інтарэсам дзяржавы, ці ігнараваць іх у выпадку калізіі інтарэсаў дзяржавы і рэлігійнай канфесіі [101, с. 49, 52].

Так, у выніку шэрагу гістарычных абставін частка кананічнай тэрыторыі Праваслаўя (беларускія і ўкраінскія землі) з 1385 г., калі была падпісана Крэўская ўнія паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай, знаходзілася пад юрысдыкцыяй дзяржавы, права якой фарміравалася пад уздеяннем не праваслаўных, а рымска-каталіцкіх каштоўнасцей. У выніку

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

палітыка-прававая дыскрымінацыя Праваслаўнай Царквы ў Вялікім княстве Літоўскім (з 1385 г.), а затым у Рэчы Паспалітай прывяла да катастрафічнага стану праваслаўнай канфесіі ў рэгіёне. На момант першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) толькі 250 тыс. жыхароў Вялікага княства Літоўскага належалі да Праваслаўя. На тэрыторыі дзяржавы існавала адна праваслаўная епархія – Беларуская (Магілёўская). На працягу другой паловы XVII–сярэдзіны XVIII ст. рымска-каталіцкія і ўніяцкія іерархі пры падтрымцы Ватыкана і ўрада Рэчы Паспалітай імкнуліся ліквідаваць праваслаўную канфесію ў дзяржаве «абодвух народаў». У 1755 г. Папа Бенядзікт XIV звярнуўся да караля і ўрада Рэчы Паспалітай з патрабаваннем перадаць Беларускую епархію пад уладу Полацкага ўніяцкага архіепіскапа. Аднак істотную ролю ў захаванні гэтай апоры Праваслаўя на беларускіх землях адыграла расійская дыпламатыя ў Рэчы Паспалітай. Справа ў тым, што яшчэ па ўмовах «Вечнага міру» (1686 г.) праваслаўных епіскапаў у Рэчы Паспалітай прызначаў Кіеўскі мітрапаліт, які з'яўляўся падданым Расійскай дзяржавы. У адпаведнасці з гэтым Руская Праваслаўная Царква лічыла Беларускую епархію сваёй кананічнай тэрыторыяй [31, с. 304–306; 104, с. 31].

Другая ж частка кананічнай тэрыторыі Праваслаўнай Царквы (рускія землі) развівалася ва ўмовах існавання Маскоўскай дзяржавы, дзе Праваслаўе, як адзіная традыцыйная канфесія ў рэгіёне, з'яўлялася асноўнай светапогляднай крыніцай фарміравання права. У Масковіі, дзе падаўляючая большасць насельніцтва вызнавала праваслаўную веру, рэлігія дасканала выконвала інтэграцыйную функцыю, забяспечваючы ідэнтыфікацыю насельніцтва, што цалкам адпавядала інтарэсам дзяржавы. У такіх умовах узаемаадносіны Маскоўскай дзяржавы і Царквы будаваліся на падставе візантыйскай дактрыны «сімфоніі» дзяржаўнай і царкоўнай улад. Як адзначыў даследчык дзяржаўна-царкоўных адносін святар Аляксей Ніколін, «сімфонія» – гэта «союз Церкви и государства, в основе которого лежит не идея их противопоставления, а идея гармонии и согласия»: царкоўная і свецкая ўлады суіснуюць, але не зліваюцца адна з адной, яны ўзаемадзейнічаюць, але не імкнуцца падначаліць адна другую [152, с. 15]. Сутнасць гэтай дактрыны яскрава ілюстравалася ў 131 Навэле імператара Юсцініяна: «Церковные каноны имеют такую же силу в государстве, как государ-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ственные законы: что дозволено или запрещено первыми, то дозволяется или запрещается последними. Посему преступления против первых не могут быть терпимы в государстве по законам государственным» [152, с. 17]. Нягледзячы на тое, што прынцыпы «сімфоніі» неаднаразова парушаліся маскоўскімі царамі, істотная дэфармацыя гэтай дактрыны адбылася толькі падчас пераўтварэнняў Пятра І.

Пятроўская мадэрнізацыя распачала працэс вестэрнізацыі Расійскай дзяржавы. Менавіта стратэгіяй вестэрнізацыі быў прадыктаваны трансфер з еўрапейскіх імперый у Расію абсалютысцкай формы праўлення [25, с. 19]. Фарміраванне абсалютызму дыктавала неабходнасць «адзяржаўлення» Царквы, інтэграцыі яе адміністрацыйнага апарату ў бюракратычную структуру імперыі і выкарыстанне патэнцыялу канфесіі ў мэтах сацыяльнага дысцыплінавання, забеспячэння законапаслухмянасці і лаяльнасці вернікаў дзяржаве [122, с. 49].

25 студзеня 1721 г. імператарам быў выдадзены Маніфест і «Регламент, или Устав Духовной коллегии» [171, с. 314–346 (№ 3718)]. Гэты заканадаўчы акт канстытуяваў асновы функцыянавання кіруючых органаў Рускай Праваслаўнай Царквы на працягу ўсяго сінадальнага перыяду (1721–1917 гг.). У аснову Рэгламенту была закладзена пратэстанцкая (па сваім паходжанні) дактрына «дзяржаўнай царкоўнасці», якая абгрунтоўвала заканамернасць вяршынства ўлады самадзержца над Царквой. Замест Памеснага Сабора і пасады патрыярха ствараўся новы орган кіравання – Духоўная калегія (21 лютага 1721 г. перайменавана ў Найсвяцейшы Сінод). З гэтага часу царкоўнае кіраўніцтва рабілася часткай дзяржаўнай адміністрацыі, пераходзіла ў падначаленне расійскаму манарху.

На нашу думку, «сінадальная» форма дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін спалучыла ў сабе прынцыпы дактрын «дзяржаўнай царкоўнасці» (напрыклад, прынцып «чыя ўлада, таго і вера») і «сімфоніі» (супрацоўніцтва, узаемапавагі і згоды паміж Царствам і Свяшчэнствам). У адпаведнасці з гэтым імперскае права не стала атэістычным і персонацэнтрычным, яго далейшае фарміраванне па-ранейшаму зыходзіла з праваслаўных традыцый і адпаведнага светапогляду, прыняцце прававых нормаў дыктавалася праваслаўнай маральнасцю.

Так, у артыкуле 40 «Асноўных дзяржаўных законаў» прама адзначалася: «Первенствующая и господствующая в Российской



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Империи вера есть Христианская православная Кафолическая Восточного исповедания» [211, с. 10]. «Пануючае» становішча Праваслаўя падкрэслівалася нормай аб тым, што расійскі імператар не мог вызнаваць ніякай іншай веры, акрамя праваслаўнай [211, ст. 41]. Закон прадпісваў ажыццяўляць каранаванне ўзыходзячага на прастол манарха праз святое мірапамазанне па абраду Праваслаўнай Царквы [211, ст. 35]. Артыкул 42 «Асноўных законаў» замацоўваў вяршынства імператара над Рускай Праваслаўнай Царквой: «Император, яко Христианский Государь, есть верховный защитник и хранитель догматов господствующей веры, и блюститель правоверия и всякого в Церкви святой благочиния» [211, с. 10; 171, с. 316]. У заўвазе да гэтага артыкула адзначалася: «В сем смысле Император в акте о наследии Престола именуется Главою Церкви» [211, с. 10]. Далей закон фіксаваў: манарх ажыццяўляе кіраванне Праваслаўнай Царквой «посредством» Найсвяцейшага Сінода [211, ст. 43].

У той жа час у артыкуле 44 «Асноўных законаў» вызначалася: «Все не принадлежащие к господствующей Церкви подданные Российского государства, природные и в подданство принятые, также иностранцы, состоящие в Российской службе, или временно в России пребывающие, пользуются повсеместно свободным отправлением их веры и богослужения по обрядам оной» [211, ст. 44]. Наступная заканадаўчая норма вызначала, што залогам «цярпімага» стаўлення да той ці іншай канфесіі з'яўлялася яе лаяльнасць імперскаму правапарадку [211, ст. 45]. Такім чынам, пашырэнне правасуб'ектнасці «пануючай» Царквы не памяншала права іншых канфесій на рэлігійную і іншую звязаную з ёй дзейнасць. Больш за тое, па меры пашырэння межаў імперыі і ператварэння Расіі ў поліканфесійную дзяржаву двор Раманавых імкнуўся пазіцыянаваць сябе як хрысціянская манархія, якая стаіць на варце агульнахрысціянскіх каштоўнасцей. Нормы «Свода законов Российской империи» ў поўнай меры пацвярджаюць дадзеную тэзу.

Так, у «Законах о состояниях» праваслаўнае, каталіцкае і пратэстанцкае духавенства абвяшчалася прывілеяваным саслоўем [214, ст. 394–397]. У той жа час артыкул 404 закону вызначаў: «Лица, отправляющие богослужение по обрядам вер нехристианских, не составляют особых в государстве сословий» [214, с. 50].

Расійскае заканадаўства ў аднолькавай ступені абараняла ўсе хрысціянскія веравызнанні ад празелітызму з боку нехрысціянскіх канфесій. Згодна з артыкулам 200 «Уложения о наказаниях уголовных и исправительных», «за отвлечение кого-либо от Христианской веры Православного или другого исповедания в веру магометанскую, еврейскую или иную нехристианскую» вінаваты караўся бізуном, накладаннем кляйма, пазбаўленнем усіх правоў стану, ссылкай на катаргу тэрмінам ад 8 да 10 год, а за выкарыстанне падчас «спакушэння» гвалту тэрмін ссылкі павялічваўся да 15 год [219, ст. 200]. Крымінальнаму пераследу падлягалі і самі асобы, што «отступили» ад хрысціянскай веры ў нехрысціянскую. Згодна з законам, вінаватага накіроўвалі да «духоўнага начальства» для «увещания и вразумления». Галоўнае ж, да моманту вяртання ў Хрысціянства «адступнік» пазбаўляўся правоў свайго стану. Зразумела, што для прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў такая санкцыя мела істотнае значэнне [219, ст. 201].

У той жа час сурова каралася «спакушэнне» праваслаўных у іншыя хрысціянскія веравызнанні. Напрыклад, артыкул 205 за такое злачынства прадугледжваў пазбаўленне ўсіх правоў стану і ссылку «на жыццё» ў Сібір ці адпраўку ў папраўчыя арыштанцкія роты [219, с. 50]. Крымінальная адказнасць узнікала і за ажыццяўленне іншаслаўным клірам духоўнай дзейнасці сярод праваслаўных [219, с. 51–52]. Расійскае заканадаўства не прадугледжвала прававых магчымасцей пераходу з Праваслаўя ў іншую канфесію [246, ст. 36]. «Отступившие» ад Праваслаўя ў іншае хрысціянскае веравызнанне перадаваліся «духовному начальству для увещания, вразумления их и поступления с ними по правилам церковным» [219, ст. 206].

Згодна са Зводам законаў, права ажыццяўлення місіянерскай дзейнасці ў імперыі належала толькі «пануючай» канфесіі. Аднак у артыкуле 70 «Устава о предупреждении и пресечении преступлений» адзначалася: «…господствующая церковь не дозволяет себе ни малейших понудительных средств при обращении последователей иных исповеданий и вер к Православию…» [246, с. 13–14]. Гэты ж статут прадугледжваў магчымасць пераходу з аднаго хрысціянскага неправаслаўнага веравызнання ў іншае, але толькі з непасрэднага дазволу міністра ўнутраных спраў [246, ст. 82]. Толькі з санкцыі гэтага ж міністра духавенства хрысціянскіх

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«замежных» канфесій магло знаёміць з асновамі свайго веравучэння мусульман і язычнікаў, якія выкажуць на тое сваю згоду [246, ст. 85]. Так абмежаванне місіянерскай дзейнасці неправаслаўных канфесій і наданне права негвалтоўнага «обращения» ў праваслаўнае веравызнанне сведчыла аб тым, што дзяржава выступала гарантам захавання адноснага парытэту канфесій (з Праваслаўем на чале) і падтрымання status quo ў веравызнаўчай палітры імперыі.

Дзяржаўная ахова Праваслаўя ад празелітызму з боку іншых канфесій знайшла сваё адлюстраванне і ў шлюбным праве. Артыкул 67 «Законов гражданских» прадпісваў асобам неправаслаўнага веравызнання, якія бралі шлюб з прадстаўнікамі «пануючай» веры, даваць падпіску (юрыдычнае абавязацельства) аб тым, што яны «… не будут ни поносить своих супругов за Православие, ни склонять их чрез прельщение, угрозы или иным образом, к принятию своей веры, и что рождённые в сем браке дети крещены и воспитаны будут в правилах Православного исповедания» [215, с. 7].

Гарантыі аховы хрысціянскіх веравызнанняў вызначаліся і ва «Уставе о цензуре и печати». Артыкул 184 гэтага статута забараняў выданні нехрысціянскіх канфесій, «... кои заключают в себе умствования и мнения противные главным началам христианской веры, или опровергающие учение Православной церкви», таксама не дазвалялася распаўсюджванне і атэістычнай літаратуры. Акрамя таго, забараняліся кнігі, напісаныя заходнехрысціянскімі багасловамі, у якіх крытыкаваліся догматы Праваслаўнай Царквы [247, с. 80].

Ахова хрысціянскіх веравучэнняў забяспечвалася нормамі расійскага крымінальнага заканадаўства. «Уложение о наказаниях уголовных и исправительных» у главе «О богохулении и порицании веры» змяшчала наступныя саставы злачынстваў: «порицание Христианской веры или Православной церкви» (артыкул 194), неданясенне «о порицании христианского закона вообще, или в особенности церкви Православной» (артыкул 195), «богохуление, поношение Святых Господних или порицание Христианской веры, или церкви Православной» у друкаваных ці рукапісных сачыненнях (артыкул 197); «кощунство, то есть язвительные насмешки, доказывающие явное неуважение к правилам или обрядам церкви Православной, или вообще Христианства» (артыкул 198) [219, с. 47–48].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Істотнае значэнне для афармлення прававога статусу праваслаўнай канфесіі мела прыняцце ў 1841 г. «Устава духовных консисторий». У 1883 г. Статут быў выдадзены ў новай рэдакцыі з нязначнымі праўкамі. «Устав» рэгламентаваў парадак фарміравання і кампетэнцыю духоўных кансісторый, працэдуру кансісторскага судаводства, правы і абавязкі прыходскага духавенства, парадак кіравання царкоўнай гаспадаркай, будаўніцтва храмаў і стварэння новых прыходаў, змяшчаў палажэнні аб ахове і распаўсюджванні праваслаўнай веры, кадыфікаваў нормы шлюбаразводнага працэсу [244].

Неабходна адзначыць, што сфера шлюбных адносін у Расійскай імперыі ў даследуемы перыяд па-ранейшаму рэгулявалася рэлігійнымі нормамі. З часоў прыняцця Хрысціянства ў Старажытнай Русі, дзе адсутнічала дзяржаўнае заканадаўства аб сям'і і шлюбе, Царква прымала на сябе ролю рэгулятара шлюбна-сямейных адносін. Старажытнарускія прававыя зборнікі (Статуты Уладзіміра Святаславіча, Яраслава Мудрага і інш.) толькі пацвярджалі юрысдыкцыю Праваслаўнай Царквы ў дадзенай сферы [110, с. 85–86; 168, с. 61]. Таксама і нормы «Свода законов Российской империи» (Т. 10, ч. 1 «Законы гражданские») і «Устава духовных консисторий», якія рэгулявалі парадак заключэння і скасавання шлюбу асоб праваслаўнага веравызнання, толькі субсідыярна ахоўвалі рэлігійна-маральныя асновы, што на працягу стагоддзяў складваліся ў гэтай сферы. Адпаведны функцыянал у дачыненні да неправаслаўных падданых даручаўся кліру тых «замежных» канфесій, да якіх належалі суб'екты шлюбна-сямейных адносін [215, ст. 1112, 61]. Гэта сфера была не адзінай, дзе рэлігія заставалася асноўным сацыяльным рэгулятарам, а права толькі пацвярджала рэлігійныя нормы. Да юрысдыкцыі прызнаных у імперыі канфесій у грамадзянска-прававой сферы належалі пытанні рэгулявання парадку заключэння і скасавання дагавароў пазыкі і арэнды ў адносінах да царкоўнай маёмасці. Кампетэнцыя хрысціянскіх канфесій у сферы крымінальнага права ўяўляла сабой шырокі спектр разнастайных царкоўных пакаранняў за ўчыненне свецкімі асобамі і свяшчэннаслужыцелямі шэрагу злачынных дзеянняў (грэшныя праступкі, парушэнні грамадскага парадку і г. д.) [129, с. 22].

Вышэйапісаныя акалічнасці вылучалі Расійскую імперыю з агульнаеўрапейскага кантэксту. У краінах Еўропы, пачынаючы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

з другой трэці XIX ст., назіраліся карэнныя змены ў сістэме дзяржаўна-царкоўных адносін, што вяло да аддзялення Царквы ад дзяржавы і абвяшчэння свабоды сумлення. Так, у 1831 г. свабода сумлення занатоўвалася ў канстытуцыі Бельгіі [11, с. 13]. Пасля рэвалюцыйных падзей 1848 г. свабода сумлення прызнавалася ў германскіх дзяржавах, Францыі і Аўстрыйскай імперыі [11, с. 14–15, 51]. Тры «майскія законы» 1868 г., прынятыя ў Аўстрыі, замацоўвалі аддзяленне канфесій ад дзяржавы і ўраўноўвалі ўсе рэлігійныя аб'яднанні імперыі перад законам [11, с. 15–16]. Прынцып аддзялення Царквы ад дзяржавы атрымліваў паступовую рэалізацыю (пачынаючы з сярэдзіны 1860-х гадоў) у Італіі [11, с. 16]. Ажыццяўлялася і секулярызацыя шлюбу: у 1860-я гады абавязковы грамадзянскі шлюб быў уведзены ў Італіі, Румыніі, Іспаніі, Партугаліі, у 1875 г. – у Германіі [164, с. 266]. Секулярызацыя, якая праводзілася ў краінах Заходняй Еўропы з часоў Рэфармацыі і Контр-рэфармацыі, была скіравана на замацаванне прынцыпаў суверэнітэту дзяржавы, вяршынства права і такім чынам павінна была ідэалагічна забяспечыць выцісканне Рымска-каталіцкай Царквы з палітычнай, а затым і іншых сфер жыцця грамадства [101, с. 40, 43, 45, 49]. У Расійскай жа імперыі, дзе Праваслаўная Царква, у адрозненне ад Ватыкана, ніколі не прэтэндавала на палітычную ўладу, а дзяржаўна-царкоўныя адносіны абапіраліся на прынцыпы «сімфоніі», з боку свецкіх улад не ўзнікала аб'ектыўнай неабходнасці ў аддзяленні Царквы ад дзяржавы.

Такім чынам, фарміраванне ў Расійскай дзяржаве ад пачатку XVIII ст. абсалютысцкай формы праўлення заканамерна вяло да трансфармацыі мадэлі дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін. У выніку чаго ў імперыі сфарміравалася «сінадальная» форма адносін Царквы і дзяржавы, якая спалучыла ў сабе традыцыйную для Маскоўскай дзяржавы дактрыну «сімфоніі» і характэрную для заходнееўрапейскіх абсалютных манархій пратэстанцкую дактрыну «дзяржаўнай царкоўнасці». Асноўнымі рысамі «сінадальнай» формы былі наступныя: 1) кіраўніком Рускай Праваслаўнай Царквы абвяшчаўся імператар Расійскай імперыі; 2) за Праваслаўем у расійскім заканадаўстве замацоўваўся статус дзяржаўнага («пануючага») веравызнання; 3) наяўнасць у імперыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзяржаўнай рэлігіі спалучалася з заканадаўчымі гарантыямі свабоднага ажыццяўлення рэлігійнай дзейнасці іншымі «цярпімымі» (як хрысціянскімі, так і нехрысціянскімі) канфесіямі пры ўмове, што апошнія не будуць пасягаць на асновы імперскага ладу і распаўсюджваць сваю місію на праваслаўнае насельніцтва; 4) пазіцыянаванне Расійскай імперыі ўнутры краіны і на міжнароднай арэне ў якасці праваслаўнай хрысціянскай дзяржавы пацвярджалася заканадаўчымі гарантыямі аховы і прывілеяванага становішча ўсіх хрысціянскіх канфесій (не толькі Праваслаўнай Царквы, але і рымска-каталіцкай і пратэстанцкіх канфесій); 5) замацаванне за Праваслаўем статусу дзяржаўнай рэлігіі сведчыла аб тым, што праваслаўная рэлігія з’яўлялася важнейшай крыніцай духоўных каштоўнасцей, светапогляднай асновай імперскай ідэалогіі, адпаведна, Праваслаўе непасрэдным чынам уплывала на афармленне норм імперскага права, з’яўлялася індыкатарам асноў маральнасці права; 6) у Расійскай імперыі захоўвалася даволі шырокая (у параўнанні з іншымі еўрапейскімі краінамі) прастора грамадскіх адносін (шлюбная сфера, прымяненне царкоўных пакаранняў у сферы крымінальнага права, рашэнне некаторых маёмасных спрэчак з удзелам духоўных устаноў), урэгуляваных рэлігійнымі нормамі, калі права толькі пацвярджала легітымнасць рэлігійна-маральных нормаў; прычым адпаведныя адносіны, што тычыліся падданых іншаслаўных веравызнанняў, рэгуляваліся паводле кананічных нормаў «замежных» хрысціянскіх канфесій; 7) «сінадальная» форма дзяржаўна-царкоўных адносін аб’ектыўна выключала неабходнасць для свецкіх улад аддзялення Царквы ад дзяржавы, таму што ў адпаведнасці з характэрнымі для гэтай формы прынцыпамі «сімфоніі» Праваслаўная Царква выступала сацыяльным партнёрам, а не канкурэнтам дзяржавы ў барацьбе за ўплыў на палітычныя працэсы і грамадства ў цэлым.

## 2.2 Адміністрацыйная структура Рускай Праваслаўнай Царквы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Арганізацыя вышэйшага кіравання Рускай Праваслаўнай Царквой.* Паводле кананічнага права, Усяленская Праваслаўная Царква ўяўляе сабой супольнасць аўтакефальных памесных Цэркваў. Згодна з кананічнымі правіламі, асноўнай формай вышэйшага кіравання памеснай Царквой з'яўляецца Памесны Сабор. На Памесным Саборы адбываецца абранне першаіерарха (мітрапаліта, экзарха ці патрыярха) адпаведнай памеснай Царквы. Падчас вырашэння царкоўных спраў першаіерарх дзейнічае не адзінаасобна, а ад імя ўсёй памеснай іерархіі, якая прадстаўлена на Памесным Саборы [262, с. 155]. Першаіерарх Рускай Праваслаўнай Царквы атрымаў тытул патрыярха ў 1589 г. і з'яўляўся роўным па сане Усяленскаму (Канстанцінопальскаму), Анціахійскаму, Іерусалімскаму, Александрыйскаму патрыярхам [204, с. 4–7].

Як ужо адзначалася вышэй, пасада патрыярха Рускай Праваслаўнай Царквы была ліквідавана ў выніку царкоўнай рэформы Пятра I (1721 г.). З гэтага часу пад забаронай апынулася і скліканне Памесных Сабораў. Так воляй свецкага манарха быў парушаны асноўны прынцып кананічнай структуры праваслаўнага ладу – саборнасць.

Першае пасяджэнне Найсвяцейшага Сінода адбылося 21 лютага 1721 г. На працягу XVIII–пачатку XIX ст. яго склад неаднаразова трансфармаваўся. У XIX ст. Сінод складаўся з «першапрысутнага» члена (звычайна гэту пасаду займаў мітрапаліт Санкт-Пецярбургскі); членаў (епархіяльных архірэяў, якія пажыццёва прызначаліся ўказам імператара); прысутных (архірэяў, якія прызначаліся імператарам на пэўны тэрмін, «до воспоследования Высочайшей воли на обратное возвращение их в епархию») [207, с. 8–9].

Сінод з'яўляўся вышэйшай адміністрацыйнай і судовай інстанцыяй Рускай Праваслаўнай Царквы. Згодна з шэрагам заканадаўчых актаў, ён надзяляўся наступнымі паўнамоцтвамі: стварэнне новых епіскапскіх кафедр; вярхоўнае назіранне за выкананнем царкоўных законаў, за духоўнай асветай прыхаджан; устанаўленне новых царкоўных свят і абрадаў, кананізацыя святых; выданне і цэнзураванне духоўнай літаратуры і г. д. Як вышэйшая царкоўная судовая ўлада, Сінод з'яўляўся судом першай інстанцыі па абвінавачваннях епіскапаў у антыкананічных учынках і апеляцыйнай інстанцыяй па справах, што вырашаліся ў

епархіяльных судах (напрыклад, вынясенне канчатковых рашэнняў па шлюбаразводных справах) [207, с. 1–10].

У 1722 г. указам імператара была ўведзена пасада обер-пракурора Сінода. Згодна з «Інструкцыяй обер-пракурору» на гэту пасаду прызначаліся афіцэры. Обер-пракурор абвяшчаўся «оком государя и стряпчим по делам государственным». На працягу XIX ст. яго паўнамоцтвы істотна пашырыліся: з чыноўніка, які кантраляваў вядзенне сінадальных спраў, ён стаў паўнамоцным міністрам (з 1865 г.) і членам Камітэта міністраў (з 1880 г.). Такім чынам вышэйшы царкоўны орган трапляў пад абсалютны кантроль дзяржавы: у распараджэнні обер-пракурора знаходзіліся сінадальнае справаводства, зносіны Сінода з дзяржорганамі, архірэйскімі кафедрамі, духавенствам. Обер-пракурор меў права непасрэднага звароту да імператара, менавіта па яго «прадстаўленні» прымаліся тыя ці іншыя імператарскія ўказы, што тычыліся вышэйшага царкоўнага кіравання [207, с. 11–21; 296].

*Епархіяльнае кіраванне.* Паводле норм кананічнага права, епархія – гэта частка Усяленскай і Паместнай Царквы, на чале якой знаходзіцца епіскап. Епіскапы – пераемнікі апосталаў, якія праз парадак пасвячэнняў маюць Божую сувязь з апошнімі, архіпастыры, першасвяшчэннікі і вышэйшыя настаўнікі сваіх Цэркваў [262, с. 97].

Кананічны парадак абрання епіскапаў канстытуяваны ў 1-м правіле «Дзеянняў святых Апосталаў», 4-ым правіле І Усяленскага Сабора, 3-ім правіле VII Усяленскага Сабора. Гэтыя каноны патрабавалі, каб абранне епіскапа ладзілася на Саборы, у якім удзельнічалі ўсе епіскапы рэгіёну. Адсутныя на Саборы архірэі павінны былі перадаць свой голас у пісьмовай форме. Епіскап лічыўся абраным, калі за яго прагаласавала большасць з ліку галасаваўшых. Паводле 19-га правіла Анціахійскага Сабора, прызначэнне епіскапа, якое адбылося насуперак апісанаму кананічнаму парадку, прызнавалася несапраўдным [86, с. 68; 204, с. 41–42].

Пасля пятроўскай рэформы кананічны парадак абрання епіскапаў быў ліквідаваны. Духоўны рэгламент замацоўваў за імператарам права прызначэння архірэяў: Сінод прапаноўваў спіс з двух кандыдатаў (з 1822 г. – з трох) на разгляд імператара,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пасля чаго манарх прызначаў аднаго з іх на епіскапскую кафедру [207, с. 101; 159, с. 89].

Згодна з кананічным правам, епархіяльны архірэй з’яўляўся вышэйшай інстанцыяй у епархіі. Яму належала поўная ўлада над духавенствам і паствай у справах веры. Таму абмежаванне адзінаўладдзя епіскапа ў епархіі з’яўлялася адной з асноўных тэндэнцый у працэсе «адзяржаўлення» Царквы. У Духоўным рэгламенце змяшчаўся раздзел «аб справах епіскапа», які ўтрымліваў 15 правіл аб кіраваннні і «аб’ездах» епархій, адносінах да падначаленага духавенства, епархіяльным судзе і стаўленні да епіскапскіх слуг. Дакумент падкрэсліваў, што епіскап падначальваўся юрысдыкцыі Найсвяцейшага Сінода. Архірэй штогод дасылаў у Сінод дзве справаздачы аб стане епархіі. Аб неадкладных справах епіскап абавязваўся паведамляць тэрмінова [171, с. 322–325]. Як падкрэсліў у сваёй манаграфіі святар А. Ніколін: «Главенствующими обязанностями епископов, по Регламенту, являлись фактически соглядатайство, выслеживание, выспрашивание и доношение Духовному коллегиуму» [204, с. 86].

Парушэннем кананічных нормаў з’яўлялася і ўстанаўленне Духоўным рэгламентам парадку падсуднасці епіскапаў Сіноду. Згодна з 74-м правілам Св. Апосталаў, суд над епіскапамі мог ажыццяўляць толькі Сабор. У выпадку ж немагчымасці склікання Сабора епіскап падлягаў суду 12-ці епіскапаў (12-е правіла Карфагенскага Сабора) [204, с. 86].

Пацвярджэннем інтэграванасці епіскапату ў адміністрацыйна-бюракратычны апарат імперыі з’яўлялася шырока распаўсюджаная ў Расіі практыка перамяшчэння епіскапаў з епархіі ў епархію. Згодна з кананічным правам (14-е правіла Святых Апосталаў), перавод епіскапа з адной епархіяльнай кафедры на другую з’яўляўся недапушчальным [86, с. 68]. Сістэма перамяшчэння архірэяў выкарыстоўвалася імператарам і сінадальнай бюракратыяй як механізм для ўзнагароджвання лаяльных уладам іерархаў ці, наадварот, пакарання непажаданых. У сярэднім архірэй за час свайго служэння змяняў 3 кафедры, а кожная з епархій праз кожныя 7 гадоў атрымлівала новага ўладыку [200, с. 69–70].

Межы праваслаўных епархій у Расійскай імперыі, як правіла, адпавядалі межам губерняў. Па стане на 1891 г. у Расійскай імперыі налічвалася 62 праваслаўныя епархіі. Чатыры з іх (Літоўская, Мінская, Магілёўская і Полацкая) знаходзіліся на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларускіх землях [197, с. 12]. Найстарэйшай з іх з'яўлялася Магілёўская (Беларуская). Бядотнае становішча гэтай епархіі пачало змяняцца ўжо пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. У 1780 г. з санкцыі Кацярыны ІІ намаганнямі Беларускага праваслаўнага епіскапа Георгія Каніскага з Уніяцтва ў Праваслаўе былі пераведзены 385 тыс. чалавек [252, с. 101].

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 г. на далучаных да імперыі землях была створана Мінская, Ізяслаўская і Брацлаўская епархія, якую ўзначаліў архіепіскап Віктар (Садкоўскі) [104, с. 32]. Неўзабаве, згодна з указам імператрыцы ад 22 красавіка 1794 г. «Об устранении всяких препятствий к обращению униат к Православной Греческой церкви», распачалася новая хваля пераходу ўніятаў у Праваслаўе: у выніку місіянерскай дзейнасці расійскіх улад і праваслаўных іерархаў у Мінскай і Магілёўскай губернях праваслаўнымі сталі каля 200 тыс. уніятаў [178, с. 509–511 (№ 17199); 252, с. 102].

Трэцяя праваслаўная епархія на беларускіх землях – Полацкая – была створана 3 красавіка 1833 г. У перыяд з 1833 г. па 1835 г. намаганнямі Полацкага праваслаўнага епіскапа Смарагда (Крыжаноўскага) з Уніяцтва ў Праваслаўе перайшлі 122418 чалавек [252, с. 105]. Пасля канчатковага далучэння Уніяцкай Царквы ў 1839 г. праваслаўнымі стала больш за 1,5 млн. уніятаў. У гэтым жа годзе была створана Літоўская праваслаўная епархія, якую ўзначаліў архіепіскап Іосіф (Сямашка) [104, с. 38]. Так Праваслаўная Царква аднавіла свае пазіцыі і стала найбуйнейшай канфесіяй на беларускіх землях. Згодна з перапісам 1897 г., праваслаўныя складалі 70,8 % (4599,4 тыс. чал.) ад агульнай колькасці насельніцтва беларускіх губерняў (без уліку Віленскай) [104, с. 75]. Апошнія змены ў епархіяльнай структуры Рускай Праваслаўнай Царквы на беларускіх землях у сінадальны перыяд адбыліся ў 1900 г., калі на частцы тэрыторыі Літоўскай епархіі была створана Гродзенская і Брэсцкая епархія [268, с. 19]. Першым яе архірэем быў архіепіскап Іакім (Лявіцкі).

Кананічнае права прадугледжвала і штат памочнікаў епіскапаў у кіраванні епархіяй. З IV ст. Праваслаўнай Царкве вядомы інстытут вікарных епіскапаў. Асобныя кафедры вікарных архірэяў, г. зн. намеснікаў епіскапаў, ствараліся для дапамогі архірэю ў кіраванні вялізнымі і шматлюднымі епархіямі. У Расійскай імперыі вікарыяцтва атрымала адносна шырокае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

распаўсюджванне толькі з другой паловы XIX ст. [231, с. 240; 207, с. 112–125]. Напрыклад, з 1843 г. пры епархіяльным Літоўскім архірэі працавалі два вікарных епіскапы: Ковенскі, кафедра якога размяшчалася ў г. Коўна, і Брэсцкі, які знаходзіўся ў г. Гродна [95, с. 13–17].

Акрамя таго, у канонах (2-е, 3-е, 23-е, 25-е, 26-е правілы IV Усяленскага Сабора) знайшлі сваё замацаванне прэсвітэрскія саветы – прэсвітэрыўмы. Апошнія павінны былі складацца з прэсвітэраў (свяшчэннікаў) ці дыяканаў, якія дапамагалі епіскапу ў ажыццяўленні адміністрацыйных спраў. Своеасаблівыя прэсвітэрыўмы існавалі і ў Старажытнай Русі: епархіяльнае духавенства збіралася ў так званую саборную нядзелю на «саборыкі», дзе абмяркоўваліся важнейшыя царкоўныя праблемы. Аднак ужо ў эпоху патрыяршаства кананічны прынцып кіравання епархіяй, згодна з якім памочнікамі епіскапа былі выключна духоўныя асобы, парушыўся. У епархіях ствараліся прыказы духоўных спраў і казённыя прыказы. Персанал гэтых прыказаў складаўся з духоўных і свецкіх асоб. У сінадальны перыяд (з 1744 г.) установы, якія дапамагалі архірэю ажыццяўляць кіраванне епархіяй, атрымалі назву – кансісторыі [262, с. 199–201].

У 1841 г., калі імператарам Мікалаем I быў падпісаны «Устав духовных консисторий», епархіяльныя ўпраўленні ў Расійскай імперыі атрымалі адзіную прававую базу на падставе дзяржаўнага заканадаўчага акта [244]. У артыкуле 1 Статута адзначалася: «Духовная консистория есть присутственное место, через которое, под непосредственным начальством епархиального архиерея, производятся управление и духовный суд в поместном пределе Православной Российской Церкви, именуемом епархиею» [244, с. 1]. Вышэйшай інстанцыяй для кансісторыі быў Найсвяцейшы Сінод (артыкул 2).

Кансісторыя складалася з «присутствия» і канцылярыі. У «присутствие» ўваходзіла 5–7 членаў – прадстаўнікоў белага (прыходскага) і чорнага (манаскага) духавенства. Прызначаліся яны і звальняліся Сінодам па прадстаўленні епархіяльнага архірэя [244, ст. 282]. Для вядзення справаводства пры кансісторыі працавала канцылярыя на чале са свецкім чыноўнікам – сакратаром. Сакратар прызначаўся Найсвяцейшым Сінодам па прапанове обер-пракурора. Астатнія служачыя канцылярыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прызначаліся і звальняліся кансісторыяй «с утверждения» архірэя. Артыкул 287 Статута вызначаў статус сакратара: нягледзячы на фармальнае падначаленне сакратара епіскапу, першы з’яўляўся асабістым прадстаўніком обер-пракурора, меў права напрамую звяртацца да свайго сталічнага начальніка [244, с. 106]. Такім чынам забяспечваўся кантроль обер-пракурора над ходам спраў у епархіях.

«Присутствие» кансісторыі мела наступныя адміністрацыйныя паўнамоцтвы: падбор і характарыстыка кандыдатаў на царкоўныя пасады (арт. 67–69), выдача дазволаў на пастрыжэнне ў манахі (арт. 82), нагляд за вядзеннем царкоўнай дакументацыі (метрычных, спавядальных кніг і г. д.) (арт. 99–109), кіраванне архірэйскім домам і яго маёмасцю (арт. 110–123), кіраванне манастырамі (арт. 124–137) і храмамі (арт. 38–65; 138–157). Акрамя таго, кансісторыя выконвала функцыі царкоўнага суда [244, ст. 158].

Епархіяльны архірэй не прымаў удзелу ў пасяджэннях кансісторыі. Сакратар жа з’яўляўся абавязковым удзельнікам пасяджэнняў. Ён дакладваў сутнасць справы, даваў неабходныя даведкі і тлумачэнні. Такім чынам, епіскап толькі разглядаў і візіраваў ужо гатовыя «определения». Архірэй меў права вярнуць справу на паўторны разгляд. Калі пасля паўторнага разгляду кансісторыі епіскап не пагаджаўся з яе рашэннем, архірэй меў права вынесці ўласную рэзалюцыю, якая лічылася канчатковай [244, ст. 333]. Аднак аб такіх выпадках кансісторыя абавязвалася паведамляць Сіноду і обер-пракурору [200, с. 79].

Так усе рашэнні архірэя праходзілі праз папярэдні разгляд кансісторыі. Статут ператвараў кансісторыю з дапаможнага органа па кіраванні епархіяй у наглядчыка, што абмяжоўваў уладу архірэя, гэта значыць у дадзеным выпадку «Устав духовных консисторий» уступаў у пярэчанне з кананічным правам.

*Царкоўныя акругі – благачынія.* Дзеля аптымізацыі архірэйскага кіравання кананічнае права прадугледжвала дзяленне епархій на царкоўныя акругі. У Старажытнай Царкве (з IV ст.) царкоўныя акругі ўзначальвалі прызначаныя епіскапам перыядэўты. Пазней на месцы перыядэўта ўзнікла пасада пратапопа. У сінадальны перыяд царкоўныя акругі атрымалі назву благачынія. У 1698 г. патрыярхам Маскоўскім Адрыянам была выдадзена «Инструкция поповским благочинным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

смотрителям». У 1775 г. Цвярскі архіепіскап Платон (будучы мітрапаліт Маскоўскі) на падставе названай інструкцыі склаў «Инструкцию благочинных приходских церквей». Гэта інструкцыя была зацверджана Сінодам і абвешчана абавязковай для ўсіх епархій імперыі [262, с. 199–202]. У 1857 г. у інструкцыю былі ўнесены змены і дапаўненні, у 1892 г. яна была выдадзена ў новай рэдакцыі.

У адпаведнасці з інструкцыяй благачынныя прызначаліся і звальняліся непасрэдна архірэем з ліку прыходскіх настаяцеляў адпаведнай акругі [207, с. LXI]. Благачынніцкія акругі складаліся з 10–30 прыходаў. Калі ў адным благачыніі было больш за 15 прыходаў, архірэй мог прызначыць памочніка благачыннага [244, ст. 69]. Так, па стане на 1861 г. у імперыі налічвалася 2486 благачыній і 31136 прыходаў [201, с. 34].

На благачынных, якія з'яўляліся пасрэднікамі паміж епархіяльным архірэем і прыходскім духавенствам, ускладаўся шэраг кантрольна-адміністрацыйных функцый: 1) нагляд за арганізацыяй прыходаў: благачынны правяраў правільнасць уладкавання алтара, іканастаса, наяўнасць царкоўных рэчаў («утвари»), духоўнай літаратуры, тэхнічны стан храмаў і царкоўных пабудоў, добраўпарадкаванасць тэрыторыі вакол цэркваў; сачыў за будаўніцтвам новых храмаў, прытокам і адтокам прыхажан у прыходах; 2) кантроль за жыццядзейнасцю прычту: сачыў за паводзінамі царкоўна- і свяшчэннаслужыцеляў, членаў іх сямей (каб яны «… жили честно, степенно, кротко, мирно, и в исполнении своей должности были благоговейны»), рэгулярнасцю адпраўлення літургій і іх адпаведнасцю кананічным правілам; адказваў за вырашэнне канфліктаў паміж членамі прычту; ажыццяўляў кантроль за паўсядзённым жыццём духавенства: благачынны абавязваўся сачыць за асабістымі кантактамі клірыкаў (да каго яны ходзяць у госці і каго прымаюць у сябе дома), якую літаратуру яны чытаюць, якую носяць вопратку; сачыў за неўмяшальніцтвам духавенства ў свецкія справы; даваў дазвол на перамяшчэнне свяшчэннікаў у межах епархіі; адказваў за вопіс і перадачу царкоўнай маёмасці і дакументацыі ад аднаго святара да другога; кантраляваў правільнасць вядзення царкоўнай дакументацыі, спавядальных і метрычных кніг, а таксама ўладкавання царкоўнага архіва; сачыў за дзейнасцю царкоўных стараст. Для выканання сваіх абавязкаў

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

благачынныя павінны былі наведваць даручаныя ім прыходы два разы на год. Па выніках праверак яны складалі рапарт на імя епархіяльнага архірэя [207, с. XLVIII–LXI].

Акрамя таго, благачыннымі складаліся так званыя фармуляры – кліравыя ведамасці, у якіх давалася ацэнка паводзінаў кожнага клірыка за год, пазначаліся праступкі і штрафныя санкцыі, калі яны мелі месца. Менавіта паводле гэтых фармуляраў «епархіяльнае начальства» рабіла вывады аб добранадзейнасці падначаленых духоўных асоб [200, с. 83–84].

У эпоху «Вялікіх рэформаў» паўстала пытанне аб абранні благачынных духавенствам адпаведнай царкоўнай акругі. У 1860-х гадах у царкоўных і грамадскіх колах імперыі распаўсюджвалася меркаванне, што праз рэалізацыю прынцыпа выбарнасці прыходскае духавенства павінна было атрымаць доступ да кіравання справамі Царквы [200, с. 462]. Аднак спецыяльны ўнутрыцаркоўны дакумент аб выбарах благачынных так і не быў распрацаваны. Гэта пытанне было пакінута на меркаванне епархіяльных архірэяў.

Так, у 1864 г. выбары благачынных ажыццяўляліся ў Саратаўскай і Архангельскай епархіях. У 1866 г. – у Арлоўскай, Кіеўскай, Смаленскай і некаторых іншых. З 1869 г. пасада благачыннага была выбарнай у Літоўскай епархіі [95, с. 61–62]. У шэрагу епархій архірэі прызначалі благачынных са спісу двух-трох кандыдатаў, прапанаваных кансісторыяй [200, с. 464.]. У гэты ж час у епархіях пачалі ўтварацца благачынныя з’езды і благачынныя саветы [200, с. 466; 95, с. 69, 77–80].

На благачынных з’ездах, якія збіраліся з дазволу епіскапа, адбывалася абранне благачыннага, дэпутатаў на акружныя і епархіяльныя вучылішчныя з’езды, фарміраваўся благачынны савет, вырашаліся спрэчныя пытанні і праблемы дзейнасці прычтаў, разглядаліся канфлікты паміж прыходскім духавенствам, абмяркоўваліся пытанні літургічнай абраднасці і місіянерскай дзейнасці, вырашаліся праблемы ўстанаўлення апекі над удовамі і сіратамі «духоўнага звання» і некаторыя іншыя [200, с. 466; 95, с. 70–71, 77–80].

Благачынныя саветы складаліся з благачыннага (ён жа быў старшынёй) і двух ці больш членаў, абраных ад духавенства. Саветы разглядалі канфлікты ўнутры прычтаў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сачылі за царкоўнай дысцыплінай, ажыццяўлялі атэстацыю кліру [200, с. 466; 95, с. 69].

У 1881 г. з пачаткам ажыццяўлення кансерватыўнага курсу обер-пракурора К.П. Пабеданосцава ўказам Сінода выбарнасць благачынных была адменена. Фактычна прыпынілася і дзейнасць благачынных з’ездаў і саветаў [225].

У 1797 г., згодна з указам імператара Паўла І, для нагляду за манастырамі епархій была ўведзена пасада благачыннага манастыроў. Апошні прызначаўся епархіяльным архірэем па прапанове духоўнай кансісторыі з ліку настаяцеляў манастыроў. У епархіях са значнай колькасцю манастыроў магло быць некалькі манастырскіх благачынных [225]. У 1828 г. Сінодам была складзена «Инструкция благочинному монастырей». Згодна з ёй благачынныя ажыццяўлялі нагляд за манастырскім богаслужэннем, «за благочестием монастырским и благоповедением», маральным станам брацііі і манастырскай гаспадаркай [207, с. XLIII–XLVIII].

*Прыходы.* Вядомы кананіст дарэвалюцыйнай Расіі прафесар І.С. Берднікаўдаў даваў наступнае вызначэнне прыходу: «Церковным приходом в Православной Церкви называется община, имеющая особый храм для богослужебных собранийи состоящая под духовным управлением приходского священника. Приход составляет нераздельную часть епископии и подчинён епископу как высшему своему пастырю. Ближайшее же пастырское руководство им принадлежит, по поручению епископа, местному священнику» (цыт. па: [262, с. 215]).

Згодна з кананічным правам, служэнне прыходскага святара распаўсюджвалася на адну прыходскую абшчыну. Свае пастырскія абавязкі ён выконваў як асоба, упаўнаважаная епіскапам праз здзяйсненне таінства рукапалажэння. У межах прыхода свяшчэннік меў усю паўнату пастырскай духоўнай улады. Без яго дазволу ніякі іншы святар не маў права адпраўляць богаслужэнне ў яго храме [262, с. 210]. Памочнікамі прыходскага свяшчэнніка з’яўляліся дыяканы і царкоўнаслужыцелі (псаломшчыкі, панамары).

У Старажытнай Царкве істотнае значэнне для рукапалажэння епіскапам кандыдата ў прыходскія свяшчэннікі мела меркаванне прыхаджан. Папярэдне епіскап мусіў заслухаць водгукі свайго кліра і свецкіх асоб аб кандыдаце на свяшчэнства. У Старажытнай Русі кандыдат на царкоўнае месца альбо абіраўся

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыхаджанамі, альбо прызначаўся свецкім феадалам, калі храм знаходзіўся на яго зямлі. Пасля гэтага кандыдат накіроўваўся да епархіяльнага архірэя для здзяйснення рукапалажэння. Аднак канчатковае рашэнне заставалася за архірэем [262, с. 211–213].

З пачатку XVIII ст. выбары кліра прыхаджанамі паступова пачалі абмяжоўвацца, пакуль у 1797 г. Сінод, спасылаючыся на ўказ імператара аб забароне падаваць калектыўныя «чалабітныя», не забараніў калектыўныя прашэнні прыхаджан аб прызначэнні ім святара [141, с. 101]. Згодна з «Уставом духовных консисторий» падбор кандыдатур на тыя ці іншыя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцельскія пасады ажыццяўляла духоўная кансісторыя. Пасля чаго кандыдатуры разглядаліся епархіяльным архірэем, які і прымаў рашэнне аб рукапалажэнні ў свяшчэнны сан [244, ст. 74].

Яшчэ ў 1721 г. у прыходах была ўведзена пасада царкоўнага старасты. Згодна з «Инструкцией церковным старостам», зацверджанай імператарам Аляксандрам I 17 красавіка 1808 г., стараста абіраўся тэрмінам на 3 гады з ліку прыхаджан на агульным сходзе ў прысутнасці благачыннага і са згоды прычту. Затым абраная асоба зацвярджалася епархіяльным архірэем. Стараста адказваў за збор добраахвотных ахвяраванняў на карысць царквы, непасрэдна займаўся продажам свечак, сачыў за тэхнічным станам царкоўных пабудоў, вёў царкоўную бухгалтэрыю, складаў фінансавыя справаздачы, якія перадаваліся на праверку благачыннаму. На старасту інструкцыя ўскладала і некаторыя кантрольныя абавязкі: ён сачыў за прытрымліваннем манаполіі на продаж свечак; калі ва ўласнасці царквы меўся лес, стараста наглядаў за выкарыстаннем драўніны (лесаматэрыялы дазвалялася ўжываць толькі на храмавыя патрэбы) [207, с. CVVV–CXXIX].

Поруч з пасадай царкоўнага старасты ў час правядзення царкоўнай рэформы Аляксандра II пачалі ствараца прыходскія папячыцельствы. 2 красавіка 1864 г. імператар падпісаў «Положение о приходских попечительствах при православных церквях». Члены гэтага органа абіраліся з ліку прыхаджан на агульным сходзе царкоўнай абшчыны. Папячыцельствы павінны былі клапаціцца аб матэрыяльным забеспячэнні прычтаў, займацца зборам сродкаў на дабрачыннасць [207, с. 384–391].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

16 красавіка 1869 г. выйшаў указ Аляксандра ІІ, які прадугледжваў памяншэнне колькасці праваслаўных прыходаў і прычтаў у Расійскай імперыі. Царкоўнаслужыцелі ліквідаваных прыходаў пераводзіліся «за штат» [192, с. 321–325 (№ 46974)]. Так шляхам аб’яднання прыходаў улады разлічвалі аптымізаваць выдаткі на іх ўтрыманне: за кошт эканоміі сродкаў з ліквідаваных царкоўных адзінак планавалася палепшыць матэрыяльнае становішча ўзбуйненых. Сярэдняя па імперыі колькасць прыхаджан на адзін прыход павінна была павялічыцца з 1600 да 2200 чалавек [201, с. 44].

Аднак гэта рэформа амаль не закранула беларускія губерні, дзе праблема беднасці праваслаўных прыходаў спалучалася з іх недастатковай колькасцю. Таму на беларускіх землях на працягу другой паловы XIX–пачатку XX ст. назіраўся няўхільны рост колькасці праваслаўных прыходаў. Ва ўмовах, калі расійскі ўрад пасля падзей паўстання 1863–1864 гг. істотна павялічыў фінансавую падтрымку Праваслаўнай Царквы ў Паўночна-Заходнім краі, дзе ў папярэдні перыяд з-за беднасці падаўляючай большасці мясцовай паствы (сялян) матэрыяльнае становішча Царквы было несуцяшальным, адкрыліся новыя магчымасці для пашырэння сеткі прыходаў. Так, на пачатку 1860-х гадоў у чатырох праваслаўных епархіях (Літоўскай, Мінскай, Магілёўскай і Полацкай) налічвалася 2826 цэркваў (прыходскіх і прыпісных), у 1870-х – 3039, у 1880-х – 3211, у 1890-х – 3793. Агульная колькасць прыходаў у гэтых епархіях у 1890 г. склала 1857. Сярэдняя ж колькасць прыхаджан у адным прыходзе ў гэты час была 2300–2500 чалавек [104, с. 76].

*Манастыры.* Падрабязная кананічная рэгламентацыя манастырскага ўладкавання належыць святому Васілію Вялікаму (IV ст.). Ён склаў звод правілаў для манастыроў і манахаў. Гэтыя правілы па сённяшні дзень з’яўляюцца асноўным законам для манахаў. У іх аснову закладзены прынцып выканання чорным духавенствам трох зарокаў: паслушэнства старэйшым, начальству з адмаўленнем ад уласнай волі; цноты; няхцівасці, адмаўлення ад усялякай уласнасці [262, с. 123].Згодна з 4-ым правілам Халкідонскага Сабора манаскія абшчыны пераходзілі ў поўнае падначаленне епіскапаў, ператвараліся з прыватнай абшчыны ў паўнавартасны царкоўны інстытут [262, с. 124].

Першыя спробы рэгламентацыі прававога статусу манастыроў у Маскоўскай дзяржаве ажыццяўляліся на Стаглавым



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

саборы (1551 г.). Аднак упарадкаванне прававога становішча манастыроў і манаскага духавенства ў расійскім заканадаўстве адбылося толькі ў XVIII–XIX вв.

Згодна з «Духоўнымі штатамі», зацверджанымі Кацярынай II у 1764 г., усе манастыры імперыі падзяляліся на штатныя і пазаштатныя. Штатныя манастыры, якія ў сваю чаргу дзяліліся на 3 класы, пераводзіліся на казённае ўтрыманне. Пазаштатныя павінны былі існаваць за кошт ахвяраванняў і прыбыткаў з зямельных надзелаў [207, с. 290–292]. Зыходзячы з таго, што цэрквы і манастыры, згодна з маніфестам імператрыцы ад 26 лютага 1764 г., былі пазбаўлены асноўнай часткі сваіх зямельных фондаў, большасць прыстанкаў, што трапіла «за штат», была закрыта [173, с. 549–569 (№ 12060)]. Калі па стане на 1762 г. у цэнтральных губернях імперыі налічваўся 881 манастыр, то пасля ўвядзення «штатаў» засталося толькі 385 [200, с. 92]. На беларускіх землях у выніку палітыка-прававой дыскрымінацыі праваслаўнай канфесіі ў Рэчы Паспалітай колькасць манастыроў была і без таго мізэрнай. У 1795 г. у беларуска-літоўскіх губернях налічвалася 34 праваслаўныя прыстанкі. У першай палове XIX ст. іх колькасць перавысіла 60. Аднак ужо да пачатку XX ст. у рэгіёне засталося толькі 37 манастыроў. І гэта не гледзячы на тое, што на хвалі ўрадавай падтрымкі Праваслаўя ў Паўночна-Заходнім краі ў другой палове XIX–пачатку XX ст. быў адноўлены альбо заснаваны шэраг праваслаўных прыстанкаў [104, с. 36, 85].

Кіраванне манастырамі ажыццяўлялася настаяцелямі (архімандрытамі і ігуменамі), падначаленымі епархіяльным архірэям. Згодна з кананічным правам, настаяцель мусіў абірацца непасрэдна манахамі адпаведнага манастыра. Абраная брацціяй кандыдатура павінна была зацвярджацца архірэем ці патрыярхам (у стаўрапігіяльных манастырах). У сінадальны перыяд кананічная працэдура была зменена. У «общежительных» (пазаштатных) манастырах настаяцель абіраўся манахамі і зацвярджаўся Сінодам па прадстаўленні архірэя. У «штатных» – прызначаўся непасрэдна архірэем ці Сінодам [262, с. 129]. У абавязкі настаяцеля ўваходзіла назіранне за выкананнем брацціяй манаскіх зарокаў і правіл, клопат аб рэгулярным здзяйсненні

богаслужэнняў, нагляд за манастырскай гаспадаркай. Настаяцель меў права накладаць пакаранні на манахаў і паслушнікаў, што здзейснілі праступкі. Акрамя настаяцеля, у кіраванні манастыром прымалі ўдзел намеснік настаяцеля, духоўнік, эканом. З гэтых асоб складаўся духоўны сабор, які абмяркоўваў і вырашаў важнейшыя манастырскія справы [262, с. 130].

Такім чынам, асновы адміністрацыйнай структуры Рускай Праваслаўнай Царквы ў даследуемы перыяд былі закладзены яшчэ ў эпоху Пятра І, калі намаганнямі манарха ў Расійскай дзяржаве ажыццяўлялася фарміраванне абсалютысцкага рэжыму і станаўленне «сінадальнай» формы дзяржаўна-царкоўных адносін. Апошняя акалічнасць дыктавала тэндэнцыю «адзяржаўлення» Царквы – інтэграцыю яе структур у адміністрацыйны апарат імперыі, што суправаджалася парушэннямі некаторых асноў кананічнага ўладкавання канфесіі. Руская Праваслаўная Царква пазбавілася свайго вышэйшага кананічнага органа – Паместнага Сабора – і патрыяршага праўлення. У якасці вышэйшага органа кіравання Царквой быў створаны Найсвяцейшы Сінод, які падначальваўся непасрэдна імператару. Секулярнымі прававымі нормамі быў зменены кананічны парадак абрання епіскапату, установлена падкантрольнасць епархіяльных структур свецкай адміністрацыі.

У той жа час, на падставе прыведзеных у даследаванні фактаў выяўлена і другая тэндэнцыя, якая вынікала з асаблівасцей фарміравання адміністрацыйнай структуры Праваслаўнай Царквы на беларускіх землях. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі пры актыўнай падтрымцы дзяржаўных улад фактычна з нуля распачалося аднаўленне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры Царквы: ажыццяўлялася стварэнне праваслаўных епархій (Мінскай (1793 г.), Полацкай (1833 г.), Літоўскай (1839 г.), Гродзенскай (1900 г.)), адбылося вяртанне ўніятаў ва ўлонне Праваслаўя (1839 г.), пастулова (асабліва актыўна ў перыяд пасля паўстання 1863–1864 гг.) пашыралася сетка праваслаўных прыходаў. У выніку гэтых мерапрыемстваў Руская Праваслаўная Царква здолела аднавіць пазіцыі на сваёй кананічнай тэрыторыі і вярнуць сабе статус найбуйнейшай канфесіі на беларускіх землях.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 2.3 Прававое становішча праваслаўнага духавенства

Згодна з кананічным правам, усе члены Царквы падзяляюцца на два асноўныя разрады: клірыкі і свецкія асобы (прыхаджане). Першымі з'яўляюцца асобы, закліканыя Святым Духам праз пасвячэнне здзяйсняць царкоўнае служэнне: прапаведаваць, адпраўляць Таінствы, клапаціцца аб знешнім убранні храма. Асобную праслойку ўнутры Царквы складаюць манахі («манаствуючыя»). Аднак, як адзначае ў сваёй працы протаіерэй У. Цыпін, вылучэнне манаства як асобнага царкоўнага стану з'яўляецца не зусім дакладным, таму што манахі могуць быць як клірыкамі, так і асобамі, якія не праходзілі пасвячэння, што ў такім выпадку вызначае іх свецкі статус. Па словах аўтара, манахі выдзяляюцца ў асобную групу не па прыкмеце служэння, а згодна з іх асаблівым ладам жыцця, які вынікае з дадзеных імі зарокаў [262, с. 96–97]. Відавочна, улічваючы апошнюю акалічнасць, заканадаўства Расійскай імперыі падзяляла праваслаўнае духавенства на манаствуючае (чорнае) і прыходскае (белае) [214, ст. 405]. Прававое становішча белага і манаскага духавенства мела шэраг істотных адрозненняў.

*Манаскае духавенства.* З часоў Пятра І у расійскім уладным дыскурсе сфарміравалася своеасаблівае ўяўленне аб царкоўным інстытуце манаства. Пётр І сцвярджаў: «… большая часть (монахов. – *В.Л.*) тунеядцы суть… В монахах всё готовое, а где и сами трудятся, то токмо вольные поселяне суть. Прилежат же ли разумению божественных писаний? Всячески нет, а что говорят: молятся, то и все молятся… Что же прибыль обществу от сего? Воистину только старая пословица: ни Богу, ни людям, понеже большая часть бегут от податей и от лености, дабы даром хлеб есть» [123, с. 157–158]. Зыходзячы з гэтага, манаства як праслойка насельніцтва, якая была пазбаўлена грамадзянскай актыўнасці, не ўносіла свайго працоўнага і фіскальнага ўнёску ў пабудову «агульнага дабрабыту», не ўпісвалася ў ідэалогію пятроўскай мадэрнізацыі.

Імператарскі ўказ ад 28 студзеня 1723 г. фактычна забараняў пастрыжэнне ў манаства: на месцы памерлых манахаў і манахінь дазвалялася прымаць толькі адстаўных салдат. Так манастыры ў Расіі апынуліся пад пагрозай знікнення. Аднак гэта норма была адменена ўказам Кацярыны І (1725 г.). Паводле гэтага дакумента, прыняцце ў манаства ажыццяўлялася з непасрэднага дазволу Найсвяцейшага Сінода [123, с. 158]. Як ужо адзначалася, моцным ударам дзяржавы па манастырах быў указ Кацярыны ІІ 1764 г. аб

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

секулярызацыі іх зямельнай маёмасці. З 1865 г. выдача дазволаў на прынящце манаства ажыццяўлялася епархіяльнымі архірэямі [240, арк. 27–28].

Згодна з кананічным правам, для прыняцця манаскага пострыгу патрабавалася выкананне некаторых умоў. Так, 18-е правіла Васілія Вялікага дазваляла прамаўляць манаскія зарокі асобам, якія дасягнулі 17-гадовага ўзросту. Аднак заканадаўства Расійскай імперыі вызначыла іншы мінімальны ўзрост для прыняцця манаства. Паводле «Законов о состояниях», мужчынам дазваляўся пострыг з 30 гадоў, жанчынам – з 40 год [214, ст. 410]. З санкцыі Сінода прадугледжваліся адступленні ад гэтага правіла. Навучэнцам духоўных семінарый і акадэмій давалася магчымасць прыняць пострыг у 25 гадоў.

Другой істотнай умовай з’яўлялася знаходжанне жадаючага прыняць манаства на папярэднім трохгадовым «паслушэнскім выпрабаванні» (5-е правіла Двухкратнага Сабора). Згодна з указам Найсвяцейшага Сінода ад 25 мая 1832 г., выпускнікі духоўных навучальных устаноў і святары-ўдаўцы вызваляліся ад гэтага выпрабавання. Неабходнай умовай для пострыгу з’яўлялася таксама свабоднае волевыяўленне асобы (40-е правіла Трульскага Сабора). У адпаведнасці з гэтай нормай у імперскім заканадаўстве прымушэнне да манаскага пострыгу кваліфікавалася як крымінальнае злачынства [262, с. 126].

Акрамя таго, для забеспячэння кантролю за паступленнем імперскіх падданых у шэрагі чорнага духавенства ў расійскім заканадаўстве рэгламентаваўся шэраг дадатковых умоў. Кандыдаты ў манахі з ліку дзяржаўных служачых абавязваліся атрымаць пісьмовы дазвол ад свайго начальства. Сяляне павінны былі мець дазвол грамады і Казённай палаты. Канчатковае ж рашэнне аб «увольнении в монашество» прымалася губернатарам [214, ст. 411]. Згодна з «Законами о состояниях», забаранялася прымаць у манаства асоб, якія мелі пазыковыя абавязацельствы, а таксама тых, хто знаходзіўся ў шлюбе і меў малалетніх дзяцей [214, ст. 413].

Неабходна адзначыць, што пералік абмежаванняў правоў манаствуючых, які быў устаноўлены імперскім заканадаўствам, у цэлым адпавядаў нормам кананічнага права. Так, у адпаведнасці са зместам манаскіх зарокаў, статута Васілія Вялікага і 6-ым правілам Двухкратнага Сабора, дзе адзначалася, што манахі не могуць мець асабістай уласнасці, «Законы о состояниях»

РЕПОЗИТОРИЙ ГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пазбаўлялі манахаў ранейшых саслоўных правоў і прывілей, разнастайных узнагарод і пенсій, права на валоданне і набыццё маёмасці, атрыманне маёмасці ў спадчыну. Асобы, якія прынялі манаскі пострыг, абавязваліся перадаць у спадчыну законным наследнікам сваю нерухомую маёмасць [214, ст. 416–418].

У той жа час, расійскае заканадаўства прадугледжвала шэраг выключэнняў з вышэйакрэсленых нормаў, што пярэчыла кананічнаму прынцыпу манаскай няхцівасці. Манахі, якія займалі кіруючыя пасады (архірэі, архімандрыты, ігумены, настаяцелі), мелі права мець рухомую маёмасць і перадаваць яе па спадчыне [214, ст. 419]. Акрамя таго, манахі штатных манастыроў, якія атрымлівалі жалаванне з дзяржаўнай казны, мелі права за ўласны кошт будаваць і набываць келлі. Аднак пасля смерці такія пабудовы заставаліся ва ўласнасці манастыра [214, ст. 419]. Таксама закон не забараняў манахам укладаць грошы ў крэдытныя ўстановы пры ўмове, што пасля смерці ўкладчыка капітал пяройдзе ў манастырскую казну [214, ст. 422].

У адпаведнасці з артыкулам 420 «Законов о состояниях», манахам забаранялася вядзенне гандлю, за выключэннем уласных вырабаў, але толькі з дазволу кіраўніцтва манастыра. Манаствуючым забаранялася ўмешвацца ў грамадскія справы, быць апекунамі і папячыцелямі, паверанымі ў справах, што не тычыліся манастыроў [214, ст. 421]. Дадзеныя нормы цалкам адпавядалі 3-му і 4-му правілам Халкідонскага Сабора [262, с. 128].

Згодна з нормамі кананічнага права манаскія зарокі даюцца пажыццёва. У 7-ым правіле Халкідонскага Сабора свавольнае складанне манаства і вяртанне да свецкага жыцця вызначалася як цяжкае кананічнае злачынства, якое караецца анафемай – адлучэннем верніка ад Царквы [262, с. 128]. Заканадаўства Расійскай імперыі ставілася да адмовы падданых ад манаства значна менш катэгарычна, хаця «Законами о состояниях» прадугледжваліся санкцыі супраць «растрыгі». Асобе, якая вырашыла пазбавіцца манаства, даваўся выпрабавальны тэрмін – 6 месяцаў, на працягу якіх настаяцель манастыра разам з брацiяй, а таксама асобы, спецыяльна прызначаныя архірэем, і, нарэшце, «полное присутствие» кансісторыі «увещевали» заяўніка. Калі ж перакананні не дзейнічалі, з дазволу Сінода архірэй прымаў рашэнне аб зняцці сану. Пасля гэтага духоўны суд накладаў на былога манаха (ці манашку) сямігадовую епітым’ю (царкоўнае

пакаянне). Згодна з законам такой асобе вярталіся грамадзянскія правы «по роду и происхождению». Чыны, адзнакі ці льготы, якія падданы атрымаў да пострыгу, ануляваліся. На перыяд выканання епітым'і былым манахам забаранялася пражываць у абедзвюх сталіцах, а таксама ў той губерні, дзе знаходзіўся манастыр. Назаўсёды ім перакрываўся шлях да дзяржаўнай службы [214, ст. 414–415].

*Белае духавенства.* Найбольш шматлікай часткай духавенства, якая самым непасрэдным чынам сутыкалася з масамі праваслаўных вернікаў, было прыходскае (белае) духавенства, сярод якога вылучаліся святчэнна- і царкоўнаслужыцелі.

Згодна з царкоўнымі канонамі, дзействам, заклікаsuccessfully засведчыць пасвячэнне хрысціяніна ў ступень святчэнства, з'яўляецца хіратанія (пасвячэнне, таінства Святчэнства). Святчэнная іерархія мае 3 ступені: дыяканскую, прэсвітэрскую і епіскапскую. Дзве першыя ступені гэтай іерархіі ўласцівы прыходскім святчэннаслужыцелям [262, с. 101].

Паводле кананічных нормаў, пры пасвячэнні ў дыяканскую і прэсвітэрскую ступені святчэннай іерархіі неабходна было прытрымлівацца наступных ўмоў: права здзяйсняць хіратанію належала епархіяльнаму архірэю; апошні меў права пасвячаць толькі клірыкаў сваёй епархіі; хіратанія павінна была здзяйсняцца ў парадку ад ніжэйшых да вышэйшых ступеняў святчэнства; пасвячэнне прызнавалася сапраўдным, калі яно было звязана з прызначэннем клірыка ў строга вызначаны прыход; аднойчы здзейсненая хіратанія не можа ладзіцца паўторна [262, с. 98–101]. Гэтыя правілы ў поўнай меры знайшлі сваё адлюстраванне ў заканадаўстве Расійскай імперыі.

Так, ва «Уставе духовных консисторий» устанаўлівалася, што прыняцце рашэння аб пасвячэнні той ці іншай асобы ў святчэнны сан, а таксама непасрэднае здзяйсненне гэтага таінства ажыццяўлялася епархіяльным архірэем. За подпісам таго ж архірэя святчэннаслужыцель атрымліваў стаўленую грамату, якая з'яўлялася афіцыйным пасведчаннем аб прыналежнасці асобы да духоўнага стану [244, ст. 74; 214, ст. 408]. У Статуце замацоўвалася і кананічнае правіла аб тым, што ніхто не можа быць пасвечаны ў сан пры адсутнасці вакансій у прыходах [244, ст. 75–77]. Перавод клірыкаў з адной епархіі ў другую дазваляўся

толькі пасля ўзгаднення такога рашэння паміж адпаведнымі архірэямі [244, ст. 79].

У адпаведнасці з царкоўнымі правіламі артыкул 406 «Законов о сотояниях» пералічваў іерархічныя тытулы, уласцівыя для першай і другой ступеняў свяшчэнства [214, с. 50]. Згодна з законам, дыяканская ступень мела наступную іерархію: іпадыякан – ніжэйшы дыяканскі чын (у сучаснай Царкве іпадыяканы не маюць свяшчэннай ступені, з'яўляюцца старэйшымі царкоўнаслужыцелямі); дыякан – памочнік святара і епіскапа падчас здзяйснення богаслужэння; протадыякан – галоўны дыякан у епархіі, які служыць пры кафедральным саборы. Прэсвітэрская ступень прадугледжвала іерахію для клірыкаў, якія мелі права самастойна здзяйсняць таінствы і адпраўляць богаслужэнне: іерэй – малодшы прэсвітэрскі тытул; прэсвітэр – свяшчэннік; протаіерэй – старэйшы іерэй, як правіла, настаяцель храма; протапрэсвітэр – вышэйшы іерархічны тытул белага духавенства (напрыклад, протапрэсвітарам быў духоўнік імператара).

Ніжэйшыя прыходскія клірыкі называліся царкоўнаслужыцелямі. Згодна з кананічным правам, «пастаўленне» ў царкоўнаслужыцельскую ступень ажыццяўлялася архірэем шляхам здзяйснення чыну хіратэсіі – «рукаўскладання», якое ў адрозненне ад хіратаніі («рукапалажэння») ладзілася ў храме па-за алтаром [262, с. 106]. Як і свяшчэннаслужыцелі, ніжэйшыя клірыкі, згодна з артыкулам 408 «Законов о состояниях», пасля хіратэсіі атрымлівалі падпісаную епіскапам стаўленую грамату [214, с. 50]. У артыкуле 407 гэтага ж закону адзначалася, што да праваслаўных царкоўнаслужыцеляў належаць царкоўныя прычэтнікі ў званні псаломшчыкаў [214, с. 50]. У абавязкі апошніх уваходзіла чытанне падчас богаслужэння тэкстаў Свяшчэннага Пісання і малітваў, спяванне на клірасе, суправаджэнне святара падчас наведвання прыхаджан, вядзенне прыходскага справаводства. «Пастаўленне» ў ступень псаломшчыка з'яўлялася першым пасвячэннем свецкай асобы, пасля чаго дазвалялася далейшае прасоўванне па іерархічнай лесвіцы: пасвячэнне ў іпадыяканы, дыяканы і затым ў свяшчэннікі [262, с. 106–111]. Згодна з «Уставом духовных консисторий», пры сельскай прыходскай царкве, у якой налічвалася да 400 прыхаджан, прадугледжвалася прысутнасць аднаго свяшчэнніка і двух прычэтнікаў [244, ст. 76].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Так, па стане на 1892 г. на беларускіх землях налічвалася наступная колькасць белага духавенства: прэсвітэраў – 1924, протаіерэяў – 104, іпадыяканаў, дыяканаў і протадыяканаў – 234, прычэтнікаў – 1991 [104, с. 76].

Кананічнае права вылучала шэраг перашкод, наяўнасць якіх у той ці іншай асобы не дазваляла епіскапу здзяйсняць пасвячэнне ў клірыкі [262, с. 112–116]. *Па-першае, гэта перашкоды фізічнага характару.* У гэтай сувязі важнейшым патрабаваннем для патэнцыйных свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў з'яўлялася дасягненне вызначанага ўзросту, які мусіў засведчыць сталасць розуму і цвёрдасць перакананняў асобы. Мінімальны ўзрост для паступлення ў шэрагі белага духавенства ў Расійскай імперыі ўстанаўліваўся выключна кананічнымі правіламі. У дзяржаўным заканадаўстве адпаведныя нормы адсутнічалі. Згодна з 14-ым правілам Трульскага Сабора, пасвячэнне ў дыяканскую ступень дазвалялася з 25-цігадовага ўзросту, у прэсвітэрскую – з 30-ці год. Як адзначыў протаіерэй Уладзіслаў Цыпін, на практыцы даволі частымі былі адступленні ад гэтай нормы, у кананічным праве амаль не сустракаліся санкцыі за парушэнні 14-га правіла Трульскага Сабора. Па словах даследчыка, вызначэнне мінімальнага ўзросту для пастаўлення ў чын псаломшчыка ў канонах увогуле не сустракаецца [262, с. 133]. Б. Міронаў у сваёй манаграфіі падкрэсліў, што, як правіла, мінімальны ўзроставы цэнз для прычэтнікаў у Расійскай імперыі складаў 15 гадоў [141, с. 108].

У той жа час, імперскае заканадаўства ўстанаўлівала ўзрост (60 гадоў), пры дасягненні якога свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі мелі права выхаду на пенсію. Гэта норма не пярэчыла кананічным правілам, у якіх максімальны ўзрост клірыкаў не вызначаўся. Згодна з артыкулам 82 «Устава духовных консисторий», духоўная асоба магла самастойна вырашаць, заставацца ёй на царкоўнай службе ці сыходзіць на пенсію. Ва ўмовах жа, калі клірык не мог выконваць свае абавязкі па стану здароўя, гэты артыкул гарантаваў права пенсійнага забеспячэння і ва ўзросце маладзей за 60 гадоў [244, с. 34].

*Па-другое, кананічнае права вылучала перашкоды духоўнага характару.* Важнейшай умовай пасвячэння асобы ў белае духавенства з'яўлялася наяўнасць неабходных ведаў. Адпаведныя веды будучыя клірыкі маглі атрымаць у духоўных



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

навучальных установах. Так, для атрымання пачатковай адукацыі і падрыхтоўкі да паступлення ў духоўную семінарыю ў Паўночна-Заходнім краі працавала 11 мужчынскіх духоўных вучылішчаў (Віленскае, Мінскае, Пінскае, Слуцкае, Магілёўскае, Мсціслаўскае, Гомельскае, Аршанскае, Віцебскае, Полацкае, Жыровіцкае). Непасрэдная ж падрыхтоўка духавенства ажыццяўлялася ў праваслаўных духоўных семінарыях, якіх у краі налічвалася 4: Магілёўская, Мінская, Віцебская і Літоўская. Апошняя ў 1845 г. была пераведзена з Жыровіч у Вільню. У канцы XIX ст. практычна ўсе святчэннікі беларуска-літоўскіх епархій мелі адукацыйны ўзровень не ніжэй за семінарскі [104, с. 76–77].

Атрыманне кандыдатам у свяшчэнства духоўнай адукацыі з'яўлялася важкім доказам яго добрага ведання веравучэння, цвёрдасці веры, здольнасцей да настаўніцтва, умення настаўляць пасомых. У той жа час істотнай перашкодай на шляху да свяшчэнства з'яўлялася наяўнасць у сям'і кандыдата родзічаў неправаслаўнага веравызнання. Апошняе паказвала няздольнасць асобы да настаўлення асновам праваслаўнай веры [262, с. 114–115]. Гэта праблема была асабліва актуальнай для беларускіх зямель. Ва ўмовах, калі асноўная маса праваслаўнага кліру беларуска-літоўскіх губерняў да 1839 г. належала да Уніяцтва, у сем'ях мясцовага духавенства даволі распаўсюджанымі былі выпадкі таго, што жонкі і дочкі праваслаўных свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў вызнавалі Каталіцызм. Акрамя таго, і самі праваслаўныя клірыкі нават у 60-я гады XIX ст. захоўвалі нямала перажыткаў уніяцкіх традыцый, якія, пасутнасці, з'яўляліся нічым іншым, як элементамі каталіцкай экспансіі ва ўніяцкую абраднасць. Напрыклад, беларускае святарства і пасля ліквідацыі Уніяцкай Царквы працягвала галіць бароды, насіць сутаны, у паўсядзённым жыцці карысталася польскай мовай [148, с. 631; 137, с. 42; 95, с. 121–128].

Зразумела, што вышэйпералічаныя факты ніяк не спалучаліся з традыцыямі Праваслаўнай Царквы. Аднак сітуацыя пачала мяняцца толькі падчас паўстання 1863–1864 гг. У канцы 1863 г. мітрапаліт Літоўскай праваслаўнай епархіі Іосіф (Сямашка) выдаў загад, каб духавенства з сем'ямі вучыла рускую мову і затым штодня выкарыстоўвала яе. Благачынным было даручана назіраць за гэтым і дакладваць «епархіяльнаму начальству» [95, с. 128]. У 1864 г. па прапанове М.М. Мураўёва



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

праваслаўным святарам было забаронена нашэнне сутан [137, с. 61]. У гэтым жа годзе мітрапаліт Іосіф загадаў кансісторыі пры вырашэнні пытання аб дазволе шлюбу кандыдата ў свяшчэннікі патрабаваць ад яго пісьмовае пасведчанне ад благачыннага і двух надзейных святароў аб тым, ці можа будучая жонка кандыдата гаварыць і чытаць па-руску, ці ведае яна важнейшыя праваслаўныя малітвы і катэхізіс [95, с. 128]. У сакавіку 1865 г. М.М. Мураўёў звярнуўся да архіепіскапа Полацкага і Віцебскага Васілія з прапановай зрабіць адпаведныя распараджэнні і па яго епархіі [208, с. 27].

14 мая 1864 г. у запісцы да Аляксандра II М.М. Мураўёў прапанаваў выслаць з краю найбольш «адыёзных» святароў «з былых уніятаў», а на іх месцы запрасіць «добранадзейных» клірыкаў з унутраных губерняў Расіі [147, с. 192]. У выніку Заходні камітэт пастанавіў прывесці гэту прапанову ў выкананне ў адміністрацыйным парадку па ўзгадненні мясцовых «епархіяльных начальнікаў» з генерал-губернатарам. Аднак ініцыятыву М.М. Мураўёва не падтрымаў мітрапаліт Іосіф (Сямашка), які сам з'яўляўся былым уніяцкім іерархам. Заручыўшыся падтрымкай мітрапаліта Маскоўскага Філарэта, Літоўскі мітрапаліт здолеў прадухіліць шырокую рэалізацыю задумы генерал-губернатара [107, с. 339–341].

*Па-трэцяе, для паступлення ў шэрагі белага духавенства існавалі перашкоды сацыяльнага характару.* Важнае значэнне пры пасвячэнні ў сан мела сямейнае становішча кандыдатаў. Згодна з канонамі Праваслаўнай Царквы, асобы, якія прымалі свяшчэнны сан халастымі, пазбаўляліся права на ўзяцце шлюбу. Таму, як правіла, будучыя прыходскія клірыкі пасля сканчэння семінарыі звярталіся па дазвол на жаніцьбу да епархіяльнага архірэя. Пасля гэтага кансіторыя выдавала выпускніку спецыяльнае пасведчанне – білет на ўзяцце шлюбу. І толькі пасля вянчання кандыдата ажыццяўлялася прыняцце сану [200, с. 108]. Прычым кананічнае права патрабавала ад клірыкаў прытрымлівацца «абсалютнай манагаміі». Прымаць свяшчэнны сан дазвалялася толькі асобам жанатым упершыню (17-ае правіла Святых Апосталаў). Згодна з 18-ым Апостальскім правілам, кандыдатам у свяшчэнства забаранялася браць шлюб з удовамі і разведзенымі жанчынамі. Забаранялася і хіратанія асобы, жонка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якой здзейсніла пралюбадзейства. Клірыкам-удаўцам не дазвалялася браць новы шлюб [262, с. 115–116].

За рэдкімі выключэннямі будучыя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі бралі шлюб з дзяўчынамі, якія паходзілі з сем'яў духавенства. У царкоўных колах існавала ўстойлівае перакананне, што жанчына з духоўнага саслоўя больш падрыхтавана да ролі сужэнкі служыцеля культу. Асабліва актуальнай гэта акалічнасць была да 1860-х гадоў, калі праваслаўнае духавенства ў Расійскай імперыі ўяўляла сабой закрытую карпарацыю, царкоўныя пасады перадаваліся па спадчыне дзецям духоўных асоб. Як правіла, пасля смерці прыходскага свяшчэнніка на духоўную пасаду прызначаўся яго старэйшы сын. Калі ж у святара не было сыноў, то месца перадавалася па жаночай лініі і дасталася мужу дачкі. У выпадку, калі дзеці былі малалетнімі, згодна з указам Сінода 1767 г., у прыход прызначаўся вікарый, які займаў пасаду да паўналеццябя дзяцей [141, с. 101; 123, с. 165–166].

Натуральны прырост духоўнага саслоўя змушаў урад да правядзення так званых разбораў, падчас якіх дарослых дзяцей духавенства, якім не хапіла царкоўных пасад, запісвалі ў іншыя саслоўі. Разборы неаднаразова ажыццяўляліся ў XVIII ст., у 1808, 1831 гг. Аднак гэтыя меры толькі часова вырашалі праблему, вельмі хутка замкнёнасць духавенства зноў вяла да «разбухания» саслоўя [200, с. 105].

Канчаткова гэта праблема была вырашана царкоўнай рэформай Аляксандра II. Яшчэ 29 верасня 1865 г. выйшаў указ імператара, які дазваляў епархіяльным архірэям без узгаднення з Сінодам здавальняць прашэнні выпускнікоў семінарый аб іх звальненні з духоўнага стану ў свецкі [191, с. 415–416 (№ 44507)]. 22 мая 1867 г. сваім указам Аляксандр II забараніў практыку наследавання прыходскіх пасадаў [191, с. 797–798 (№ 44610)]. Згодна з законам ад 26 мая 1869 г., дзецям праваслаўнага духавенства дазвалялася свабодна пакідаць духоўнае саслоўе [240, арк. 82]. Паводле закона ад 30 красавіка 1871 г., дзеці клірыкаў атрымлівалі правы ганаровых грамадзян [201, с. 44–45].

Аднак неабходна адзначыць, што і да правядзення царкоўнай рэформы Аляксандра II расійскае заканадаўства прадугледжвала фармальныя магчымасці паступлення ў шэрагі духавенства прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп.

У артыкуле 80 «Устава духовных консисторий» адзначалася, што епіскап можа прымаць у духоўнае званне кандыдатаў з іншых саслоўяў «по удостоверению, что поведение и образование желающих вступить в оное соответствует Духовному чину» [244, с. 33]. Тое ж самае ўстанаўлівалася і «Законами о состояниях» [214, ст. 426]. Так, артыкул 427 гэтага заканадаўчага акта прадугледжваў наступную працэдуру паступлення сялян у духоўнае саслоўе: епархіяльны архірэй мог даць згоду на пасвячэнне асобы толькі пры ўмове, што кандыдат атрымаў адпаведны дазвол ад сваёй абшчыны, Казённай палаты і губернатара [214, с. 52].

Згодна з кананічным правам, прыняццё хрысціянінам свяшчэнства надзяляла яго шэрагам правоў (прывілей) і абавязкаў, якія адрознівалі клірыкаў ад свецкіх асоб. Аднак, як адзначае У. Цыпін, прывілеі духавенства вынікалі не столькі з кананічных нормаў, колькі з палажэнняў свецкага заканадаўства, абумоўленых прававым статусам Царквы ў дзяржаве [262, с. 117]. Спасылаючыся на распрацоўкі каталіцкіх кананістаў, протаіерэй Уладзіслаў Цыпін вылучыў шэраг прывілей кліру [262, с. 117–119]. *Па-першае, гэта прывілеі канона.* Апошнія можна інтэрпрэтаваць як права духавенства на асаблівую ахову. Гэта права прызнавалася ў Кодэксе і Навэлах святога Юсцініана, «Кормчай кнізе». Адпаведныя нормы былі ўспрыняты і заканадаўствам Расійскай імперыі. Ва «Уложении о наказаниях уголовных и исправительных» замах на хрысціянскага свяшчэннаслужыцеля падчас здзяйснення богаслужэння лічыўся кваліфікаваным злачынствам: за знявагу святара «грубымі словамі» прадугледжвалася турэмнае зняволенне на тэрмін ад 3-х да 6-ці месяцаў ці заключэнне ва ўціхамірвальны дом (ад 6-ці месяцаў да года) (артыкул 239); нанясенне пабояў свяшчэнніку каралася пазбаўленнем усіх правоў стану і ссылкай на пасяленне ў Сібір (артыкул 236); за забойства свяшчэннаслужыцеля вінаваты падлягаў пазбаўленню правоў стану і бестэрміновай ссылцы на катаржныя работы на рудніках (артыкул 237) [219, с. 59–60]. Асобы «замежных» веравызнанняў, «осмелившиеся оскорбить словом или действием» праваслаўнага свяшчэнніка, «хотя и не во время священнослужения, но с намерением оказать неуважение к церкви» караліся турэмным зняволеннем на тэрмін ад 6 месяцаў да года [219, ст. 241]. «Устав о предупреждении и пресечении

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

преступлений» абавязваў паліцыю «строга ахоўваць мір і цішыню» ў храмах [246, ст. 10]

*Па-другое, можна вылучыць прывілеі падсуднасці.* У дасінадальны перыяд справы аб злачынствах, здзейсненых праваслаўным духавенствам, разглядаліся духоўнымі судамі. І толькі ў выпадку здзяйснення асабліва цяжкага злачынства (забойства, разбою) духоўная асоба, пасля пазбаўлення свяшчэннага сану царкоўным судом, перадавалася ў распараджэнне свецкага правасуддзя. У сінадальны перыяд праваслаўнае духавенства фактычна было пазбаўлена спецыялізаванай падсуднасці, за здзейсненыя злачынствы клірыкі павінны былі адказваць перад дзяржаўным судом. Тым не менш, згодна з «Уставом духовных консисторий», прадугледжваўся шэраг выпадкаў, калі свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі падлягалі царкоўнаму суду: за праступкі і злачынствы супраць пасады, добрапрыстойнасці («благочиния») і «благоповедения», па узаемных спрэчках аб карыстанні рухомай і нерухомай царкоўнай уласнасцю, а таксама па скаргах на духоўных асоб [244, ст. 158].

Разгляд крымінальных спраў супраць клірыкаў, які здзяйсняўся свецкімі судамі, меў вызначаную кансісторскім статутам спецыфіку. Так, у выпадку ўзбуджэння крымінальнай справы супраць духоўнай асобы першапачатковае расследаванне павінна было ажыццяўляцца кансісторыяй з удзелам прадстаўніка паліцыі. І толькі пасля пацвярджэння кансісторскім расследаваннем наяўнасці саставу злачынства згодна з пастановай кансісторыі справа перадавалася ў свецкі суд [256, с. 242–253]. У выключных выпадках («когда дело не терпит отлагательств») гэта стадыя магла прапускацца і справа адразу разглядалася дзяржаўнымі органамі [244, ст. 160]. Паводле артыкула 161 Статута, судовае разбіральніцтва над клірыкамі павінна было ажыццяўляцца толькі ў прысутнасці дэпутата ад духавенства. Прычым голас гэтага дэпутата падчас судовага паседжання прыраўноўваўся да голасу іншых удзельнікаў працэсу [244, с. 63].

*Трэцяя прывілея – імунітэту.* Гэта прывілея ўвязвалася з вызваленнем кліру ад шэрагу дзяржаўных павіннасцей. Так, згодна з «Законами о состояниях», праваслаўны клір (разам з рымска-каталіцкім і пратэстанцкім) вызваляўся ад воінскай павіннасці, цялесных пакаранняў, асноўных натуральных павіннасцей (пажарнай, вартаўнічай, пастойнай і інш.), духоўным



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

асобам гарантавалася права набываць і адчужаць нерухомую маёмасць [214,ст. 394–397]. Гэтыя прывілеі распаўсюджваліся і на сем'і праваслаўных свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў. Жонкі клірыкаў захоўвалі правы духоўнага стану і пасля смерці сваіх мужоў да тых пор, пакуль не бралі новы шлюб [209, с. 19–20]. Як ужо адзначалася, да 1871 г. да духоўнага саслоўя належалі і дзеці прыходскага духавенства.

*Па-чацвёртае, праваслаўныя клірыкі валодалі прывілеяй гонару.* У асноўным апошняя прывілея тычылася ўнутрыцаркоўных адносін. Ва ўзаемаадносінах паміж клірыкамі розных ступеняў перавагу гонару меў той, хто належаў да вышэйшай ступені. У стасунках паміж духоўнымі асобамі адной ступені першынство гонару вызначалася старшынствам хіратаніі (97-е правіла Карфагенскага Сабора) [262, с. 118]. У той жа час прывілея гонару паказвала і на месца духавенства ў саслоўнай структуры імперыі. Як адзначыў Б.М. Міронаў, дапачатку XIX ст. па аб'ёму сваіх правоў і пераваг праваслаўныя свяшчэннаслужыцелі прыраўноўваліся да асабістых дваран. У 1797 г. паводле ўказа Паўла I духавенства атрымала права на ўзнагароджванне ордэнамі Расійскай імперыі. Наданне духоўнай асобе такой узнагароды сведчыла аб здабыцці спадчыннага дваранства [141, с. 382].

Аднак не гледзячы на даволі высокі статус праваслаўнага духавенства ў імперскім грамадстве, яго матэрыяльнае становішча было даволі няпростым [200, с. 369–420]. Асабліва актуальнай гэта праблема была для праваслаўных клірыкаў беларуска-літоўскіх губерняў. У 1864 г. Віленскі генерал-губернатар М.М. Мураўёў пісаў Аляксандру II аб тым, што праваслаўнае святарства ў Паўночна-Заходнім краі знаходзілася ва «уничижённом» становішчы: «Духовенство наше лишено там всех средств существования, а прихожане слишком бедны, чтобы помогать ему. Польские паны пренебрегают и гнушаются им» [147, с. 191–192]. Па словах генерал-губернатара, у краі склалася сітуацыя, калі служыцелі культу пануючага ў дзяржаве веравызнання, абдзеленыя клопатам расійскай дзяржавы і грамадскасці, былі вымушаны рабалепстваваць перад мясцовымі памешчыкамі, якія ў сваёй большасці належалі да рымска-каталіцкага веравызнання [148, с. 428–429].

Намаганнямі генерал-губернатара на працягу 1864 г. ва ўсіх губернях краю былі створаны «Губернские особые



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

присутствия по улучшению быта православного духовенства», якія займаліся забеспячэннем святароў зямельнымі ўгоддзямі і дровамі [95, с. 197]. З 25 траўня 1864 г. значна павялічвалася жалаванне духавенства: калі да гэтага свяшчэннік атрымліваў з казны ад 100 да 180 рублёў у год (у той час як каталіцкі ксёндз – ад 230 да 600 рублёў [137, с. 19]), то цяпер заробак праваслаўнага святара складаў 220 рублёў на сяле і 400 рублёў у горадзе [95, с. 197]. У жніўні 1864 г. па прапанове М.М. Мураўёва Дзяржаўны Савет дазволіў аддаць у распараджэнне некаторых праваслаўных прыходаў прылеглыя да іх фермы і фальваркі, канфіскаваныя ў памешчыкаў і ксяндзоў за ўдзел у паўстанні [137, с. 57].

11 крававіка 1872 г. Аляксандрам ІІ былі зацверджаны «Правила для обеспечения земельным наделом и помещениями причтов православных сельских приходов в девяти западных губерниях». Згодна з дакументам, усе сельскія прыходы рэгіёну павінны былі мець не менш за 33 дзесяціны зямлі. Таксама правілы ўводзілі павіннасць мясцовых землеўласнікаў і сялян па пабудове і рамонту прычтавых памяшканняў [268, с. 33]. 24 сакавіка 1873 г. выйшлі правілы «О разделе местных средств содержания между членами причтов». Паводле правілаў, у прыходах, дзе прычт складаўся з настаяцеля і псаломшчыка, першы атрымліваў ¾ усіх даходаў, апошні – адну чвэрць. У прыходах з трыма членамі прычту свяшчэннік мог разлічваць на 2/3 даходаў, адна трэць дзялілася паміж іншымі [159, с. 110–112]. 14 чэрвеня 1888 г. указ Аляксандра ІІІ адмяніў павіннасць прыхаджан па пабудове і ўладкаванні прычтавых памяшканняў у заходніх епархіях. Замест гэтай павіннасці ўводзіўся грашовы пазямельны збор [268, с. 34].

Як адзначыла В. Яноўская, рэалізацыя комплексу ўрадавых мер, скіраваных на матэрыяльную падтрымку прыходскага духавенства ў беларуска-літоўскіх губернях, мела станоўчыя вынікі: істотна палепшылася фінансавае становішча кліру (на пачатку ХХ ст. жалаванне святара складала ад 400 да 800 рублёў у год), узвысіўся адпаведна і сацыяльны статус служыцеляў культу [268, с. 35].

Кананічнае права ўскладала на духавенства шэраг маральных абавязкаў. Асаблівая ўвага ў царкоўных канонах надавалася ладу жыцця, маральнасці паводзінаў клірыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Духавенству забараняліся п’янства, азартныя гульні, рукапрыкладства ў дачыненні да іншых асоб, наведванне піцейных дамоў. Недапушчальным лічылася пражыванне ў доме духоўнай асобы чужых жанчын. Прадугледжваліся і патрабаванні, што тычыліся знешняга выгляду клірыкаў. Духавенству забаранялася «пышнасць убораў» і «ўпрыгожванне цела». Свяшчэннікі і дыяканы павінны былі апранацца ў расы цёмнага колеру. Царкоўнаслужыцелям дазвалялася пры жаданні насіць свецкую вопратку і стрыгчыся. Кантроль за выкананнем прыходскім духавенствам гэтых прадпісанняў ускладаўся на благачынных [207, с. XLVIII–LXI].

Каноны (6-ае, 81-ае правілы Святых Апосталаў; 18-е правіла Карфагенскага Сабора і інш.) устанаўлівалі пералік заняткаў, несумяшчальных са свяшчэнствам. Клірыкам забараняліся займанне грамадскіх і дзяржаўных пасадаў, вайсковая служба, урачэбная практыка, ліхвярства, гандаль і іншая прадпрымальніцкая дзейнасць, паручыцельства [262, с. 122]. Гэтыя кананічныя нормы былі ўспрыняты імперскім заканадаўствам. Згодна з «Законами о состояниях», беламу духавенству забаранялася займацца гандлёвымі промысламі, вінакурствам і продажам віна. У той жа час клірыкі мелі права мець ва ўласнасці піцейныя дамы і вінакурні пры ўмове іх здачы ў арэнду іншым асобам. Закон забараняў духавенству выступаць паручыцелямі, хадайнікамі, паверанымі ў судах (акрамя спраў, што тычыліся іх цэркваў і малалетніх дзяцей), а таксама паручыцелямі пры заключэнні грамадзянскіх дагавораў [209, с. 16–17].

На думку С.В. Рымскага, абмежаванні правоў белага духавенства былі прадыктаваны інтарэсамі казны, першага расійскага саслоўя – дваранства і неабходнасцю захавання аўтарытэту самога духавенства [200, с. 102]. Па нашым меркаванні, нельга пагадзіцца з першымі двума сцвярджэннямі даследчыка. У дадзеным выпадку адбылася рэцэпцыя кананічнага права: каноны, якімі першапачаткова рэгулявалася дзейнасць духоўных асоб, выступілі асноўнай крыніцай фарміравання адзначаных нормаў права.

Паводле кананічных нормаў, на прыходскага свяшчэнніка ўскладаліся наступныя службовыя абавязкі: штодзень служыць ютрань і вячэрню; па нядзельных і святочных днях, а таксама ў Вялікі пост па серадах і пятніцах адпраўляць Боскую літургію;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ажыццяўляць сталае прапаведаванне ў храме; ахоўваць богаслужэбныя рэчы; сачыць за адпаведнасцю літургічнай абраднасці кананічным нормам; хрысціць, спавядаць, вянчаць і хаваць прыхаджан [262, с. 212–213].

Дзеля забеспячэння бесперапыннага выканання клірыкамі сваіх кананічных абавязкаў, свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі павінны былі заўсёды знаходзіцца ў межах сваіх прыходаў. Таму «адлучкі» прыходскага духавенства патрабавалі санкцыі «духоўнага начальства». Згодна з «Уставом о паспортах и беглых», клірыкі ў выпадку ад'езду на адлегласць больш за 15 вёрст ад свайго прыхода звярталіся па дазвол да благачыннага; калі ж благачынны жадаў выехаць за межы сваёй акругі, ён мусіў атрымаць дазвол епархіяльнага архірэя [245, ст. 52–54; 64, арк. 2, 18]. Дзеля паездак у іншыя губерні беламу духавенству патрабаваўся пашпарт, які выдаваўся епархіяльным архірэем [245, ст. 55, 244, ст. 86, 87].

Акрамя кананічных, на прыходскі клір быў ускладзены шэраг дзяржаўных абавязкаў. З часу праўлення Пятра І дзяржава пачынае разглядаць прыходскае духавенства як агентаў сацыяльнага дысцыплінавання насельніцтва. Так, указ Пятра І 1718 г., які патрабаваў ад прыходскага духавенства штогод прадстаўляць спіс веруючых, якія не спавядаліся, а таксама сумесная пастанова Сінода і Сената аб вядзенні ў прыходах трох ведамасцяў, дзе адзначаліся адпаведна асобы, што прайшлі споведзь, не з'явіліся на споведзь і «отпали в раскол», мелі істотна больш важнае значэнне, чым вылічэнне прыхаджан, якія перайшлі ў «раскол». Рэгістрацыя споведзі і абавязванне прыхаджан спавядацца мінімум раз на год садзейнічала ўсведамленню веруючымі сваёй прыналежнасці да праваслаўнага веравызнання. Прыналежнасць да канфесіі пачала адыгрываць ролю важнейшага элемента самаідэнтыфікацыі асобы. Такім чынам, адсутнасць веры (паказчыкам чаго быў запіс аб неспавяданні) прыраўноўвалася да палітычнай нелаяльнасці расійскаму імператару, які, у адносінах да Праваслаўя, з'яўляўся «божым памазаннікам», кіраўніком Царквы [74, с. 46, 51–52].

На прыходскае духавенства ўскладаліся абавязкі вядзення запісаў актаў грамадзянскага стану: метрыкацыя нараджэнняў, улік шлюбаў, смярцей прыхаджан. Гэты адміністрацыйны абавязак духавенства быў рэгламентаваны ў Зводзе законаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Расійскай імперыі [214, ст. 859–880]. Акрамя таго, прыходскі свяшчэннік абавязваўся зачытваць у царкве пасля сканчэння службы царскія маніфесты і ўказы, якія выдаваліся са словамі: «объявляется всенародно», а таксама і тыя пастановы грамадзянскіх улад, якія падлягалі абнародаванню [207, с. 3].

Важным складнікам функцыяналу прыходскага кліру быў кантроль за лаяльнасцю паствы грамадзянскім уладам: свяшчэннікі абавязваліся даносіць цывільнай адміністрацыі аб «раскольніках», распаўсюджванні прымхаў і забабонаў, сістэматычным ненаведванні прыхаджанамі цэркваў, аб ухіленні ад перапісаў і падаткаў, і галоўнае – аб «открытых на исповеди преднамеренных злодействах» [141, с. 364]. Такім чынам, прыходскі свяшчэннік прымушаўся парушаць таямніцу сповeдзі, што з’яўлялася не толькі парушэннем кананічных нормаў, але і найцяжэйшым грахом для святара.

Святым абавязкам клірыкаў лічылася захаванне вернасці свяшчэннай службе да канца жыцця. Згодна з 7-ым правілам Халкідонскага Сабора, духоўная асоба, якая адмаўлялася ад сану, каралася анафемай [262, с. 122]. У Расійскай імперыі заканадаўчая норма аб магчымасці складання прадстаўнікамі белага духавенства свяшчэннага сану ўпершыню з’явілася ва ўказе Мікалая I (1831 г.). Клірык, які жадаў скласці свяшчэнства, на працягу трох месяцаў падлягаў іспыту «в решимости» і «увещеванию». Калі духоўная асоба не змяняла свайго намеру, са згоды Сінода ажыццяўлялася складанне сану, клірык пазбаўляўся стаўленай граматы. Аб кожным такім выпадку кансісторыя інфармавала губернскае праўленне. За адмову ад свяшчэнства заканадаўства прадугледжвала грамадзянска-прававую адказнасць: былому свяшчэнніку забаранялася паступаць на дзяржаўную службу на працягу 10 гадоў, дыякану – 6. Асоба вярталася ў «первобытное своё состояние», усе ваенныя і грамадзянскія чыны, якія падданы меў да пасвячэння ў сан,ануляваліся [214, ст. 428].

Царкоўнаслужыцелі маглі свабодна звальняцца са сваіх пасадаў. Звальненне ажыццяўлялася на падставе «определения» кансісторыі, зацверджанага архірэем. На працягу года пасля звальнення прычэтнікі абавязваліся абраць «род жыцця»: былыя царкоўнаслужыцелі, за выключэннем тых, хто ад нараджэння меў правы дваранства ці ганаровага грамадзянства, павінны былі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыпісацца да гарадскога ці сельскага стану. Паступленне ж іх на дзяржаўную службу дазвалялася толькі пры наяўнасці адпаведнай адукацыі (як мінімум сярэдняга аддзялення семінарыі) [214, ст. 429].

Такім чынам, прававое становішча праваслаўнага духавенства (манаства і прыходскага кліру) на беларускіх землях у разглядаемы перыяд вызначалася заканадаўствам Расійскай імперыі і кананічнымі нормамі. Зыходзячы з гэтага, у замацаванні прававога статусу духоўных асоб намі былі выяўлены две тэндэнцыі.

Першая тэндэцыя вынікала з прынцыпу дактрыны «сімфоніі» (*«царкоўныя каноны маюць такую ж сілу ў дзяржаве, як дзяржаўныя законы»*), які часткова быў успрыняты «сінадальнай» мадэллю дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін у Расійскай імперыі. У адпаведнасці з гэтым прынцыпам у дзяржаве адбывалася рэцэпцыя кананічнага права: кананічныя нормы знаходзілі сваё замацаванне ў імперскім заканадаўстве, у шэрагу выпадкаў свецкае права толькі субсідыярна ахоўвала кананічныя правілы (напрыклад, заканадаўчая забарона манахам валодаць маёмасцю, пазбаўленне іх спадчынных правоў; заканадаўчае замацаванне царкоўнай іерархіі белага духавенства, вызначэнне відаў дзейнасці, несумяшчальных са святарствам). У некаторых выпадках кананічныя нормы мелі прамое дзеянне (напрыклад, устанаўленне перашкод для прыняцця святарства), дзяржаўнае заканадаўства не рэгулявала адпаведныя адносіны. Гэтай жа тэндэнцыяй (згодна з прынцыпам «сімфоніі» *«Святарства – партнёр Царства»*) абумоўлівалася і заканадаўчае замацаванне прывілеяванага становішча духавенства ў структуры імперскага грамадства.

Другая тэндэнцыя вынікала з дактрыны «дзяржаўнай царкоўнасці», успрынятай «сінадальнай» мадэллю. Тэндэнцыя «адзяржаўлення» Царквы ў некаторых выпадках прыводзіла да калізіі норм свецкага і кананічнага права. Так, насуперак кананічным правілам імперскае заканадаўства ўстанаўлівала падсуднасць праваслаўнага духавенства свецкім судам, вызначала дадатковы пералік перашкод для прыняцця манаства, пашырала кола дзяржаўных абавязкаў кліру.

У той жа час прыведзеныя ў раздзеле факты сведчаць аб тым, што дзяржаўнае заканадаўства садзейнічала ўмацаванню

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

становішча праваслаўнага духавенства на беларускіх землях: прыняцце і рэалізацыя ў 1860–1880-х гадах комплексу заканадаўчых актаў прывяло да паляпшэння матэрыяльнага становішча прыходскага духавенства; з паўсядзённага жыцця і знешняга выгляду клірыкаў пачалі выкараняцца элементы каталіцкай традыцыі (нашэнне сутан, галенне барод, карыстанне польскай мовай). Царкоўная рэформа Аляксандра II прывяла да ліквідацыі замкнёнасці духоўнага саслоўя і паспрыяла вяртанню Царквы да кананічнага парадку прызначэння духоўных асоб у прыходы.

## 2.4 Прававое рэгуляванне маёмаснага становішча Рускай Праваслаўнай Царквы

Згодна з праваслаўным веравучэннем, Царква – Богачалавечы арганізм, які мае падвойную прыроду: з аднаго боку, гэта Цела Хрыстова (царства не ад гэтага свету); з другога боку, гэта установа, якая аб'ядноўвае ў сабе хрысціян з мэтай сумеснага веравызнання. Зыходзячы з апошняга вызначэння, як чалавечая абшчына Царква падначальваецца агульным умовам зямнога парадку: для ажыццяўлення нармальнай жыццядзейнасці яна мусіць уступаць у адносіны з дзяржавай, уваходзіць у сістэму юрыдычных асоб і мець маёмасць. Характар жа адносін, якія ўзнікаюць у сувязі з валоданнем, карыстаннем і распараджэннем царкоўнай маёмасцю, залежыць ад статусу Царквы ў дзяржаве [204, с. 1, 174].

Паводле кананічнага права, царкоўная маёмасць прызначаецца выключна для мэтаў Царквы (вызначаных Самім Богам) і не можа быць выкарыстана ў іншых мэтах. У адпаведнасці з гэтым шэраг дарэвалюцыйных кананістаў (напрыклад, епіскап Нікадзім (Далмацінскі)) лічылі, што царкоўная маёмасць з'яўлялася ўласнасцю Хрыста [204, с. 175]. З такой пазіцыяй не пагаджаўся прафесар М.С. Сувораў, які падкрэсліваў, што юрыдычныя паняцці і палажэнні грамадзянскага права не прымянімы ў дачыненні да Бога, таму тэорыя Боскай уласнасці не стасавалася з хрысціянскім светапоглядам [231, с. 357].

Згодна з іншай тэорыяй, царкоўная маёмасць абвяшчалася ўласнасцю жабракоў. Гэта тэорыя прызнавала за ўсімі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

няздольнымі да самастойнага заробку хрысціянамі (інвалідамі, састарэлымі, сіратамі) права жыць за кошт царкоўных сродкаў. Аднак жабракі не мелі прававых абавязкаў у дачыненні да царкоўнай маёмасці, што не дазваляла лічыць іх уласнікамі ў фармальна юрыдычным сэнсе [204, с. 176; 262, с. 265].

У XVII–XVIII стст. на хвалі секулярызацыйных працэсаў у Еўропе пад уплывам канцэпцыі натуральнага права сфарміравалася тэорыя, якая прызнавала за дзяржавай права ўласнасці на царкоўную маёмасць. У гэтай сувязі можна пагадзіцца з думкай протаіерэя Уладзіслава Цыпіна аб тым, што апошняя тэорыя паслужыла абгрунтаваннем секулярызацыі царкоўнай зямельнай уласнасці ў Расійскай імперыі ў 1764 г. [262, с. 265].

Імперскае заканадаўства прызнавала ў якасці суб’ектаў маёмасных правоў Царквы архірэйскія дамы, цэрквы, манастыры, духоўна-навучальныя і дабрачынныя царкоўныя ўстановы [215, ст. 413]. Такім чынам, кожная канкрэтная ўстанова (рэлігійная арганізацыя) праваслаўнай канфесіі з’яўлялася самастойнай юрыдычнай асобай, адзіным і выключным уладальнікам адпаведных правамоцтваў, Руская Праваслаўная Царква ў цэлым не выступала ўласнікам маёмасці рэлігійных арганізацый, што ўваходзілі ў яе склад.

Функцыі кіравання царкоўнай маёмасцю, кантролю за яе захаванасцю і мэтавым выкарыстаннем ускладаліся, адпаведна, на епархіяльных архірэяў, царкоўны прычт і царкоўнага старасту, настаяцеляў манастыроў, кіраўніцтва навучальных і дабрачынных царкоўных устаноў. У той жа час, згодна з канонамі (42-е правіла Карфагенскага Сабора, 12-е правіла VII Усяленскага Сабора і інш.), кіраванне царкоўнай маёмасцю ажыццяўлялася вышэйпералічанымі духоўнымі асобамі на падставе іерархічнай падсправаздачнасці: архірэі адказвалі перад Сінодам; настаяцелі цэркваў і манастыроў, кіраўнікі іншых царкоўных устаноў – перад епіскапамі [262, с. 266]. Зыходзячы з гэтага, можна адзначыць, што нормы імперскага заканадаўства, якія вызначалі суб’ектаў маёмасных правоў Царквы, у цэлым адпавядалі патрабаванням кананічнага права.

У імперскім заканадаўстве падавалася і класіфікацыя аб’ектаў маёмасных правоў рэлігійных арганізацый Рускай Праваслаўнай Царквы. Зыходзячы з мэтавага прызначэння

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

царкоўнай маёмасці, вылучаліся: 1) свяшчэнныя рэчы, неабходныя для здзяйснення богаслужэнняў (свяшчэнныя пасудзіны, крыжы, іконы, Евангеллі, мошчы і інш.); 2) рэчы, асвечаныя пасродкам іх выкарыстання падчас богаслужэння (купелі, чашы для водаасвячэння, каўшы, крапілы, рызы, кадзілы, лампады, богаслужэбныя кнігі і інш.); 3) царкоўная маёмасць, прызначаная для аплачвання выдаткаў на патрэбы богаслужэнняў, утрыманне кліру і рэалізацыю іншых агульнацаркоўных задач [219, ст. 255–263]. Акрамя таго, аб’екты царкоўнай маёмасці падзяляліся на рухомыя і нерухомыя рэчы (зямельныя надзелы, лясы, культавыя будынкі і іншыя пабудовы) [215, ст. 383–405].

Як ужо адзначалася, праваслаўныя епархіяльныя ўпраўленні, манастыры і цэрквы Расійскай імперыі былі пазбаўлены права ўласнасці і валодання населенымі зямельнымі маёнткамі ў 1764 г. Згодна з маніфестам Кацярыны II ад 26 лютага 1764 г., тыя ненаселеныя зямельныя ўгоддзі, якія заставаліся ў валоданні манастыроў і архірэйскіх дамоў, абвяшчаліся казённай уласнасцю [173, с. 549–569 (№ 12060)]. Перадача дзяржаве населеных зямельных маёнткаў манастыроў Паўночна-Заходняга краю ажыццяўлялася ў 1841–1842 гг. [185, с. 139–140 (№ 15153)]. Згодна з указам Мікалая I ад 1 студзеня 1842 г., замест канфіскаваных манастырскіх зямельных надзелаў для забеспячэння жыццядзейнасці прыстанкаў устанаўлівалася іх «штатнае» ўтрыманне, паводле якога штатным мужчынскім і жаночым манастырам выдзялялася з ліку дзяржаўных сродкаў штогадовая фіксаваная грашовая сума ў памеры ад 1455 да 3185 рублёў. (Памер выплат вар’іраваўся ў залежнасці ад класа манастыра). Згодна з гэтым жа указам, асобныя штогадовыя «штатныя» выплаты прадугледжваліся для архірэйскіх дамоў і кафедральных сабораў [186, с. 1 (№ 15189); 187, с. 3].

Акрамя таго, у «Законах о состояних» дзяржава гарантавала бязвыплатнае надзяленне архірэйскіх дамоў і манастыроў казёнными зямельнымі ўгоддзямі, рыбнымі лоўлямі і млынамі [214, ст. 432]. У адпаведнасці з «Законами межевыми» кожнаму архірэйскаму дому адводзілася 60, а манастыру – ад 100 да 150 дзесяцін «лепшых угоддзяў» (у іх ліку маглі быць і лясныя дзялянкі) з дзяржаўнага зямельнага фонду, па адным млыну і ўчастку для рыбнай лоўлі [216, ст. 346]. Закон забараняў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэлігійным арганізацыям прадаваць і «иначе отчуждать в посторонние руки» дадзеную маёмасць. У той жа час, «непатрэбныя для ўласнага карыстання» ўгоддзі дазвалялася здаваць у наём [214, ст. 433]. «Законы гражданские» ўстанаўлівалі максімальны тэрмін (12 гадоў), на які архірэйскія дамы і манастыры маглі здаваць сваю нерухомую маёмасць у наём [215, ст. 1711]. Такім чынам, вышэйпералічаныя ўгоддзі захоўваліся ва ўласнасці дзяржавы, духоўныя ўстановы атрымлівалі толькі права валодання гэтай нерухомасцю [215, ст. 515].

Апрача адзначаных угоддзяў, згодна з «Уставом лесным», «для подкрепления православных монастырей в способах их существования» прыстанкам маглі выдзяляцца («в местах, где возможность дозволит») дадатковыя дзялянкі казённага лесу. Манастырам даручалася ахова адпаведных лясных участкаў, дазвалялася са згоды епархіяльнага архірэя высякаць дрэвы для ўласных патрэбаў, але пры абавязковай умове недапушчэння спусташэння лесанасаджэнняў [213, ст. 461]. Згодна з артыкулам 462 Ляснога статута, манастыр мог разлічваць на атрыманне ад 50 да 150 дзесяцін казённага лесу [213, с. 55].

Надзяленне праваслаўных цэркваў у Расійскай імперыі зямельнымі ўгоддзямі пасля секулярызацыі 1764 г. ажыццяўлялася на падставе генеральнага межавання – комплексу дзяржаўных мерапрыемстваў па ўстанаўленні дакладных межаў асобных зямельных валоданняў (праводзілася з 1765 г. і да канца XVIII ст.). У сувязі з тым, што на беларускіх землях асноўныя секулярызацыйныя мерапрыемствы ажыццяўляліся толькі ў 1841–1842 гг., прававая рэгламентацыя землеўладання цэркваў у Паўночна-Заходнім краі была ажыццяўлена ў 1842 г. на падставе палажэння «Об улучшении быта православного духовенства». Згодна з гэтым Палажэннем, для кожнай царквы, якая мела не менш за 100 сельскіх прыхаджан мужчынскага полу, выдзялялася 33 дзесяціны зямлі. Тыя ж цэрквы, якія на момант выдання дакумента мелі надзелы, што перавышалі норму ў 33 дзесяціны, пакідалі за сабой права ўласнасці на ўвесь надзел [186, с. 771–780 (№ 15872)].

У «Законах о состояниях» царкоўныя землі і іншыя ўгоддзі абвяшчаліся недатыкальнай царкоўнай уласнасцю і «ограждались от всех посторонних притязаний» [214, ст. 446]. У артыкуле 447 гэтага закону ўдакладнялася, што «отчуждение» царкоўных зямель

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

магло здзяйсняцца толькі з непасрэднага дазволу імператара [214, с. 54]. Пасутнасці, гэтыя нормы адпавядалі патрабаванням кананічнага права, якое замацоўвала за кожнай асобнай царквой права на самастойнае валоданне маёмасцю і адмаўляла любое яе адчужэнне [204, с. 187]. У выпадку ліквідацыі царквы яе зямельная маёмасць перадавалася таму храму, да якога прыпісваліся прыхаджане закрытай царквы [214, ст. 448].

Як адзначалася ў «Законах о состояниях», царкоўная зямля знаходзілася ў непасрэдным распараджэнні свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў адпаведнага прыхода. Аднак, зыходзячы з таго, што гэтыя землі абвяшчаліся ўласнасцю царквы, прычт быў пазбаўлены права продажу, перадачы ў наследства і закладу ўгоддзяў [214, ст. 449]. Уласнасцю цэркваў прызнаваліся таксама пабудаваныя і купленыя за кошт сродкаў адпаведнага храма дамы для прыходскага духавенства [214, ст. 450]. «Законы о состояниях» гарантавалі выдзяленне з казённых лясоў матэрыялаў, неабходных для ажыццяўлення царкоўных пабудоў [214, ст 451].

Правілы карыстання свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелямі царкоўнай нерухомай маёмасцю падрабязна рэгламентаваліся ў зацверджаных Аляксандрам ІІ 11 красавіка 1872 г. «Правилах для обеспечения земельным наделом и помещениями причтов православных сельских приходов в девяти западных губерниях» [207, с. 60–77]. Згодна з Правіламі, прычт абвяшчаўся «ближайшим охранителем» недатыкальнасці царкоўных земляў, якія прызначаліся толькі для асабістага карыстання прыходскім духавенствам (пункт 11–14). Благачынныя абавязваліся кожныя 3 гады ажыццяўляць праверку царкоўных зямельных надзелаў і такім чынам прадухіляць магчымасці незаконнай перадачы прыходскіх угоддзяў у карыстанне «пабочным асобам». У выпадку выяўлення такіх фактаў вінаватыя клірыкі падлягалі царкоўнаму суду, а зямля праз пасрэдніцтва губернскай адміністрацыі вярталася прычту (пункт 15, 16). Паводле Правілаў царкоўная зямля (сядзібная, ворная, сенакосная) падзялялася паміж членамі прычту ў адпаведнасці з іх ступенямі служэння. Так, ва ўмовах, калі царкве належаў надзел у 33 дзесяціны, настаяцелю адводзілася 10 дзесяцін, астатняя частка падзялялася паміж іншымі клірыкамі (пункт 17, 18).

Калі царкве належала лясная дзялянка, прыходскаму духавенству дазвалялася карыстацца лесам, але толькі для



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

уласных патрэб (нарыхтоўка дроў, лесаматэрыялаў для гаспадарчай неабходнасці). Продаж адпаведных матэрыялаў дазваляўся толькі з дазволу епархіяльнага архірэя і Найсвяцейшага Сінода (пункт 21).

Правілы прадугледжвалі магчымасць здачы часткі ворыўных і сенакосных царкоўных зямель у наём «сторонним» асобам са згоды ўсіх членаў прычту і пасля атрымання дазволу благачыннага. У выпадку, калі ў наём перадаваўся ўвесь надзел, патрабавалася санкцыя архірэя. Максімальны тэрмін здачы не павінен быў перавышаць 12 гадоў (пункт 23, 24). На сядзібных землях клірыкам дазвалялася будаваць уласныя дамы для далейшай здачы ў арэнду. Аднак у выпадку выбыцця з прыходу духоўная асоба абавязвалася знесці ці прадаць (але без зямлі) гэту пабудову (пункт 29).

Згодна з пунктам 33 Правілаў, 10 дзесяцін зямлі, адведзеных свяшчэнніку, павінны былі апрацоўвацца прыхаджанамі. У той жа час дакумент прадугледжваў магчымасць замены адпрацовачнай павіннасці грашовымі выплатамі ці прадуктамі. У выпадку, калі святару належаў надзел большы за 10 дзесяцін, лішак ён мусіў апрацоўваць уласнымі сіламі (пункт 34). Астатнія клірыкі павінны былі самастойна апрацоўваць свае надзелы (пункт 37).

У абавязкі прыхаджан Правілы залічвалі пабудову і рамонт дамоў для пражывання свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў (пункт 40–56). Паводле пункта 57, клірыкі карысталіся царкоўнымі дамамі па праву часовага валодання. Перадача дамоў у наём забаранялася. Духоўныя асобы, якія звальняліся са службы ці пераходзілі ў іншы прыход, абавязваліся перадаць жытло свайму наступніку (пункт 64). У выпадку смерці клірыка яго сям'я абавязвалася вызваліць ведамаснае жытло ў 6-цімесячны тэрмін (пункт 62, 63).

Расійскае заканадаўства прадугледжвала магчымасць набыцця ва ўласнасць архірэйскімі дамамі, манастырамі і цэрквамі ненаселеных зямельных маёнткаў і лясных угоддзяў. Артыкул 435 «Законов о состояниях» устанаўліваў наступныя спосабы атрымання такой уласнасці: купля, дарэнне і завяшчанне ад прыватных асоб. Аднак у гэтай жа норме ўдакладнялася, што набыццё зямельнай уласнасці адзначанымі рэлігійнымі арганізацыямі павінна было ажыццяўляцца толькі з непасрэднага дазволу імператара [214, ст. 435]. Зразумела, што апошняя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

акалічнасць істотна ўскладняла магчымасці архірэйскіх дамоў, манастыроў і цэркваў у набыцці зямельных надзелаў. Валоданне і набыццё рэлігійнымі арганізацыямі населеных зямельных маёнткаў увогуле забаранялася законам [214, ст. 439].

Лясы, якія пераходзілі ва ўласнасць рэлігійных арганізацый праз куплю, дарэнне ці завяшчанне, таксама як і тыя казённыя лясныя надзелы, якія маглі патрапіць у валоданне духоўных устаноў у складзе вызначанай дзяржавай плошчы зямельных угоддзяў, знаходзіліся ў поўным распараджэнні «духоўнага ведамства» і выключаліся з-пад нагляду Упраўлення казённых лясоў [213, ст. 111, 113]. Указам Сінода ад 31 жніўня 1864 г. устанаўліваліся спецыяльныя правілы аб вядзенні лясной гаспадаркі і захаванні царкоўна-манастырскіх лясных угоддзяў ад свавольнай высечкі [207, с. 297].

Купля ненаселеных зямельных маёнткаў здзяйснялася духоўнымі ўстановамі шляхам заключэння купчых крэпасцяў – натарыяльнага акта, які павінен быў засведчыць набыццё маёмасці ва ўласнасць [215, ст. 1417, 1420]. Ад імя рэлігійнай арганізацыі яе падпісвала асоба («покупщик»), якая мела адпаведную даверанасць ад імя настаяцеля манастыра і брацііі ці царкоўнага прычту і старасты [215, ст. 1430].

Дарэнне рухомай і нерухомай маёмасці на карысць рэлігійных арганізацый, як «добровольное приношение имущества на пользу общую», называлася ахвяраваннем [215, ст. 979]. Згодна з артыкулам 984 «Законов гражданских», ахвяраванні ў выглядзе нерухомай маёмасці (дамоў, крамаў і іншых пабудоў, ненаселеных земляў) на карысць архірэйскіх дамоў, манастыроў і цэркваў маглі быць прыняты апошнімі толькі пасля непасрэднага дазволу імператара [215, с. 82]. Зыходзячы з таго, што расійскае заканадаўства забараняла дараваць радавыя маёнткі «мимо ближайших наследников», 15 верасня 1867 г. быў выдадзены ўказ Сінода, які забараняў духоўным установам прымаць такія ахвяраванні [207, с. 311; 215, ст. 967].

Патрабаванні, што тычыліся парадку атрымання духоўнымі ўстановамі нерухомай маёмасці ў якасці ахвяраванняў, распаўсюджваліся і на маёмасць, якая перадавалася архірэйскім дамам, манастырам і цэрквам згодна з духоўнымі завяшчаннямі («законными объявлениями воли владельца о его имуществе наслучай его смерти»): прымаць такую маёмасць дазвалялася

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

толькі са згоды імператара; радавыя маёнткі не падлягалі завяшчанню [215, ст. 1067–1068].

Акрамя таго, у адпаведнасці з артыкулам 440 «Законов о состояниях» праваслаўныя манастыры мелі права наследавання. Прыстанкі наследавалі рухомую маёмасць манахаў, прадстаўнікоў манаскіх улад у выпадку, калі апошнія не зрабілі завяшчання. Ва ўласнасць манастыроў пераходзілі і ўнутрыманастырскія пабудовы, якія былі ўзведзены за кошт памерлых манахаў [214, с. 54].

Неабходна адзначыць, што дзяржава гарантавала вышэйадзначаным рэлігійным арганізацыям пэўныя прэферэнцыі пры выплаце падаткаў з нерухомасці. Згодна са «Сводом уставов о повинностях», зямельныя і лясныя ўгоддзі, перададзеныя дзяржавай у валоданне архірэйскім дамам, манастырам і цэрквам, а таксама любая іншая нерухомая маёмасць духоўных устаноў, якая «не приносит по свойству своему и не может приносить никакого дохода», вызваляліся ад падатку на нерухомую маёмасць і пазямельнага збору [207, с. 297, 423–425].

Што тычыцца фінансавых сродкаў рэлігійных арганізацый, расійскае заканадаўства дазваляла апошнім размяшчаць свае капіталы ў дзяржаўных банках імперыі «для приращения процентов». Больш за тое, згодна з указам Найсвяцейшага Сінода ад 9 кастрычніка 1873 г. цэрквам і манастырам прадпісвалася захоўваць у сваіх сценах не больш за 100 рублёў наяўных сродкаў, астатнія ж капіталы Сінод абавязваў размяшчаць у дзяржаўных крэдытных установах [207, с. 342].

Такім чынам, прававое рэгуляванне маёмаснага становішча Рускай Праваслаўнай Царквы на беларускіх землях было прадыктавана двума тэндэнцыямі. Першая тэндэнцыя была выклікана «адзяржаўленнем» Царквы ў Расійскай імперыі: дзяржава імкнулася за кошт паслаблення матэрыяльнага становішча Царквы паставіць праваслаўную канфесію ў фінансавую залежнасць ад свецкіх улад і, адпаведна, забяспечыць яе падкантрольнасць дзяржаўным структурам. У сувязі з гэтым ажыццяўлялася секулярызацыя населеных зямельных маёнткаў архірэйскіх дамоў, манастыроў і цэркваў, у залежнасць ад санкцыі імператара была пастаўлена магчымасць набыцця (куплі, прыняцця ў дар ці згодна з завяшчаннем) духоўнымі ўстановамі нерухомай маёмасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У той жа час, другая тэндэнцыя, якая вынікала з сутнасці дактрыны «сімфоніі» свецкай і царкоўнай улад, была выклікана неабходнасцю забеспячэння годнага матэрыяльнага становішча праваслаўнага духавенства (партнёра дзяржаўных улад) у Расійскай імперыі. Асабліва актуальнай праблема нездавальняючага становішча духоўных асоб была для беларускіх зямель, дзе праваслаўны клір знаходзіўся амаль у жабрацкім стане. Дзеля выпраўлення сітуацыі дзяржава прымала шэраг заканадаўчых актаў, скіраваных на забеспячэнне рэлігійных арганізацый зямельнымі надзеламі, ляснымі і іншымі ўгоддзямі. Згодна з заканадаўствам, праваслаўныя духоўныя ўстановы мелі права здачы гэтых участкаў у наём. Архірэйскім дамам і манастырам угоддзі перадаваліся на праве валодання, царкоўныя ж зямельныя надзелы абвяшчаліся ўласнасцю канкрэтных цэркваў. Кожнай праваслаўнай царкве ў рэгіёне гарантаваўся мінімальны надзел у 33 дзесяціны, на прыхаджан ускладаліся абавязкі па пабудове і рамонту царкоўных пабудоў. Царкоўная нерухомая ўласнасць абвяшчалася расійскім заканадаўствам неадчужальнай, што ў поўнай меры адпавядала патрабаванням кананічнага права.

Праведзены ў главе аналіз дазваляе зрабіць наступныя высновы. Фарміраванне ў Расійскай дзяржаве ад пачатку XVIII ст. абсалютысцкай формы праўлення заканамерна прывяло да трансфармацыі мадэлі дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін. У выніку чаго ў імперыі сфарміравалася «сінадальная» форма адносін Царквы і дзяржавы, якая спалучыла ў сабе элементы традыцыйнай для Маскоўскай дзяржавы дактрыны «сімфоніі» і характэрнай для заходнееўрапейскіх абсалютных манархій пратэстанцкай дактрыны «дзяржаўнай царкоўнасці». У адпаведнасці з гэтым «сінадальная» мадэль абумоўлівала наяўнасць двух тэндэнцый (у некаторых выпадках яны ўступалі ў пярэчанне, аднак часам і дапаўнялі адна другую), пад уздзеяннем якіх фарміравалася прававое становішча праваслаўнай канфесіі ў Расійскай імперыі (у тым ліку і на беларускіх землях) у даследуемы перыяд: 1) тэндэнцыя падначалення канфесіі дзяржаве («адзяржаўлення» Царквы) і 2) тэндэнцыя ўзаемапавагі і партнёрства паміж Царквой і дзяржавай.

Тэндэнцыя «адзяржаўлення» Царквы, характэрная для дактрыны «дзяржаўнай царкоўнасці», якая прадугледжвала ўстанаўленне падкантрольнасці канфесіі дзяржаве і інтэграцыю

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

царкоўных структур у адміністрацыйны апарат імперыі, заканамерна вяла да калізіі норм свецкага і кананічнага права, суправаджалася парушэннямі некаторых асноў кананічнага ўладкавання канфесіі. У выніку чаго ў расійскім заканадаўстве кіраўніком Царквы быў абвешчаны расійскі манарх, Руская Праваслаўная Царква пазбавілася свайго вышэйшага кананічнага органа – Памеснага Сабора – і патрыяршага праўлення. У якасці вышэйшага органа кіравання Царквой быў створаны Найсвяцейшы Сінод, які падначальваўся непасрэдна імператару. Секулярнымі прававымі нормамі быў зменены кананічны парадак абрання епіскапату, устаноўлена падкантрольнасць епархіяльных структур свецкай адміністрацыі, пашыралася кола дзяржаўных абавязкаў кліру, замацоўвалася падсуднасць духавенства свецкім судам, ажыццяўлялася секулярызацыя населеных зямельных валоданняў праваслаўных рэлігійных арганізацый.

Тэндэнцыя ўзаемапавагі і партнёрства паміж Царквой і дзяржавай, якая вынікала з дактрыны «сімфоніі», абумоўлівала ўплыў Праваслаўя на афармленне норм свецкага права: праваслаўная рэлігія з'яўлялася светапогляднай асновай імперскай ідэалогіі, важнейшай крыніцай нацыянальных духоўных каштоўнасцей, выступала індыкатарам асноў маральнасці права. Зыходзячы з гэтага, у імперыі захоўвалася даволі шырокая (у параўнанні з іншымі еўрапейскімі краінамі) прастора грамадскіх адносін (шлюбная сфера, прымяненне царкоўных пакаранняў у галіне крымінальнага права, рашэнне некаторых маёмасных спрэчак з удзелам духоўных устаноў), урэгуляваных рэлігійнымі правіламі, калі права толькі пацвярджала легітымнасць рэлігійна-маральных нормаў. Прававое становішча праваслаўнай канфесіі вызначалася як дзяржаўнымі законамі, так і нормамі кананічнага права. У адпаведнасці з гэтым у дзяржаве адбывалася рэцэпцыя кананічнага права: кананічныя нормы знаходзілі сваё замацаванне ў імперскім заканадаўстве, у шэрагу выпадкаў свецкае права толькі субсідыярна ахоўвала кананічныя правілы (заканадаўчая забарона манахам валодаць маёмасцю, пазбаўленне іх спадчынных правоў; заканадаўчае замацаванне царкоўнай іерархіі белага духавенства, вызначэнне відаў дзейнасці, несумяшчальных са свяшчэнствам). У некаторых выпадках кананічныя нормы мелі прамое дзеянне (напрыклад, устанаўленне перашкод для прыняцця свяшчэнства), дзяржаўнае заканадаўства не рэгулявала адпаведныя адносіны.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гэтай жа тэндэнцыяй абумоўлівалася і заканадаўчае замацаванне прывілеяванага становішча духавенства ў структуры імперскага грамадства.

З прыведзеных у главе фактаў яскрава выяўляецца і трэцяя, характэрная для беларускіх зямель, тэндэнцыя аднаўлення пазіцый Праваслаўнай Царквы ў рэгіёне. Доўгачасовае (ад 1385 г.) існаванне праваслаўнай канфесіі ва ўмовах палітыка-прававой дыскрымінацыі, балансаванне на мяжы канчатковага паглынання Праваслаўя Каталіцкай Царквой прывялі да катастрафічнага стану канфесіі на яе кананічнай тэрыторыі. Дадзеныя абставіны вымагалі пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ажыццяўлення комплексу ўрадавых мерапрыемстваў, скіраваных на адраджэнне Праваслаўнай Царквы. У выніку чаго ажыццяўлялася паступовае аднаўленне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры канфесіі (стварэнне Мінскай, Полацкай, Літоўскай, Гродзенскай епархій, пашырэнне сеткі прыходаў), у 1839 г. адбылося вяртанне ўніятаў ва ўлонне Царквы, пасля прыняцця і рэалізацыі ў 1860–1880-х гадах комплексу заканадаўчых актаў палепшылася матэрыяльнае становішча прыходскага духавенства, актыўна распачаўся працэс храмабудаўніцтва, ажыццяўлялася забеспячэнне рэлігійных арганізацый зямельнымі надзеламі, ляснымі і іншымі ўгоддзямі. У выніку гэтых мерапрыемстваў Руская Праваслаўная Царква здолела аднавіць пазіцыі на сваёй кананічнай тэрыторыі і вярнуць сабе статус найбуйнейшай канфесіі на беларускіх землях.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ГЛАВА 3
# ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ (1863–1905 гг.)

## 3.1 Афармленне прававога статусу Рымска-каталіцкай Царквы ў заканадаўстве Расійскай імперыі

Рымскі каталіцызм з'яўляўся пануючай рэлігіяй у Рэчы Паспалітай. Карыстаючыся суцэльнай падтрымкай дзяржавы і прывілеяваных саслоўяў, рымска-каталіцкая канфесія мела добрае матэрыяльнае забеспячэнне, дастаткова адукаваныя кадры, адыгрывала актыўную ролю ў дзяржаўным і грамадскім жыцці краіны [31, с. 303]. Каталіцкія іерархі былі прадстаўлены ў вышэйшых органах дзяржаўнай улады. Так, першае месца ў Сенаце займаў кіраўнік Рымска-каталіцкай Царквы ў Рэчы Паспалітай Гнезненскі архіепіскап (прымас), за ім сядзелі астатнія каталіцкія епіскапы і толькі затым размяшчаліся свецкія службовыя асобы. У выпадку смерці караля ці яго адмаўлення ад трона да моманту абрання новага манарха (што магло цягнуцца ад некалькіх месяцаў да некалькіх гадоў) функцыі кіраўніка дзяржавы ўскладаліся на інтэррэкса, пасаду якога звычайна займаў прымас Польшчы. Менавіта Гнезненскаму архіепіскапу належала права склікання надзвычайных Соймаў. Кожнае пасяджэнне Сойма пачыналася з урачыстага рымска-каталіцкага богаслужэння [19, с. 125–126, 129–130]. Атрымаўшы пераканаўчую перамогу над рэфармацыйным рухам у сярэдзіне XVII ст., у другой палове XVII–XVIII ст. у якасці сваёй важнейшай мэты Каталіцкая Царква разглядала канчатковую ліквідацыю (шляхам распаўсюджвання Уніяцтва) праваслаўнай канфесіі ў Рэчы Паспалітай [31, с. 157]. Зразумела, што ў такіх умовах каталіцкая рэлігія аказвала непасрэдны ўплыў на права Рэчы Паспалітай, брала на сябе (са згоды свецкіх улад) функцыі інтэграцыі даволі стракатага ў этнічным плане соцыуму, фарміравання яго нацыянальнай (польскай) ідэнтычнасці.

Аднак пасля ліквідацыі дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай у становішчы рымска-каталіцкай канфесіі адбываюцца істотныя змены. Неабходна адзначыць, што да 1772 г. каталіцкае пытанне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

не з’яўлялася першарадным у палітыцы расійскіх улад. У імперыі пражывала невялікая колькасць католікаў (напрыклад, па стане на 1723 г. іх налічвалася толькі 1000 чалавек), у асноўным гэта былі члены дыпламатычных місій, замежныя гандляры і перасяленцы [17, с. 146]. Каталіцкая Царква ў Расіі не мела епархіяльнай структуры і семінарый. Функцыі святароў выконваліся манахамі, якія накіроўваліся ў краіну Святым Прастолам [27, с. 39]. У Расійскай дзяржаве, дзе пануючай канфесіяй з’яўлялася праваслаўная, Рымскі каталіцызм меў статус «замежнага» веравызнання, «цярпімай» рэлігіі. Так, яшчэ 16 красавіка 1702 г. Пётр I выдаў маніфест «О вызове иностранцев в Россию с обещанием им свободы вероисповедания». Гэты заканадаўчы акт гарантаваў свабоднае адпраўленне культу неправаслаўных хрысціянскіх веравызнанняў [169, с. 192–195 (№ 1910)]. У 1769 г. імператрыца Кацярына II падпісала «Рэгламент Санкт-Пецярбургскай Рымска-каталіцкай Царквы», які вызначаў функцыі і тэрмін знаходжання ў краіне каталіцкага духавенства, парадак выбараў настаяцеляў і касцёльных стараст, механізмы кантролю за эканамічным становішчам рэлігійных абшчын [174, с. 833–840 (№ 13252)].

Сустрэча імперыі з масамі каталіцкіх вернікаў адбылася толькі ў канцы XVIII ст. Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай католікі ў Расійскай дзяржаве ўжо складалі каля 10 % ад агульнай колькасці падданых [105, с. 109]. Гэта акалічнасць вымагала далейшага ўдасканальвання заканадаўчай базы для дзейнасці рымска-каталіцкай канфесіі. Адной з першарадных задач урада Кацярыны II было абмежаванне ўладных прэрагатыў Святога Прастола над Рымска-каталіцкай Царквой у імперыі. Неабходна адзначыць, што памяншэнне ўплыву Рымскай курыі на дзейнасць Каталіцкай Царквы ў асобнай еўрапейскай краіне было на той час натуральным працэсам, які адпавядаў агульнаеўрапейскай тэндэнцыі секулярызацыі [24, с. 205; 227, с. 22]. У такіх умовах Ватыкан даволі балюча перажываў страту дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай, якая з’яўлялася важнейшым апірышчам Каталіцызму на кантыненце, адзінай еўрапейскай краінай, дзе каталіцкія іерархі аказвалі непасрэдны ўплыў на рэалізацыю ўрадавага курсу, захоўваліся рэальныя перспектывы пашырэння каталіцкай паствы за кошт канверсіі ўніяцкага і праваслаўнага насельніцтва. Таму дзейнасць Рымскай курыі на далучаных да імперыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тэрыторыях разглядалася расійскімі ўладамі як патэнцыйна небяспечная для тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы. Ва ўказе ад 14 снежня 1772 г. Кацярына II забараніла абнародаванне ў Расіі папскіх бул і «прадпісанняў замежных духоўных улад» без папярэдняга разгляду грамадзянскай адміністрацыяй і дазволу імператрыцы [175, с. 688–689 (№ 13922)]. Шэраг царскіх указаў не дазваляў рымска-каталіцкаму духавенству і веруючым імперыі ўваходзіць у непасрэдныя зносіны з Рымам і ўвогуле з каталіцкім духавенствам замежных дзяржаў [27, с. 42]. Кацярынінскія абмежаванні захоўвалі законную сілу да 1917 г.

Першая рымска-каталіцкая епархія ў Расіі была створана адразу пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, калі частка тэрыторыі Віленскай епархіі апынулася ў складзе імперыі. Шэрагам указаў ад 1772–1774 гг. Кацярына II без узгаднення з Рымам утварыла Беларускае епіскапства. На пасаду епіскапа імператрыца прызначыла віленскага каноніка С.І. Богуш-Сестранцэвіча [175, с. 688–689 (№ 13922), 864–865 (№ 14073), 913–914 (№ 14122)]. Такім чынам расійская манархія парушыла кананічныя прэрагатывы Святога Прастола – права ўтварэння епархій і прызначэння епіскапаў. Папа не пагадзіўся са стварэннем новай епархіі, аднак, каб захаваць сувязі з католікамі ў Расіі, Пантыфік прызнаў С. Богуш-Сестранцэвіча ў якасці тытулярнага епіскапа для зямель, што адышлі да Расійскай імперыі [27, с. 40].

17 студзеня 1782 г. Кацярына II падпісала ўказ аб стварэнні Магілёўскай архіепархіі, межы якой ахоплівалі ўсю тэрыторыю імперыі. На пасаду архіепіскапа і мітрапаліта ўсіх рымска-каталіцкіх касцёлаў Расіі імператрыца прызначыла ўсё таго ж С. Богуш-Сестранцэвіча [176, с. 383–385 (№ 15326)]. У выніку перамоў паміж Рымам і Пецярбургам у 1783–1784 гг. Папа Пій VI зацвердзіў стварэнне новай архіепархіі і ўвядзенне С. Богуш-Сестранцэвіча ў сан архіепіскапа. Магілёўскае архіепіскапства стала першай кананічнай вышэйшай адміністрацыйнай адзінкай Рымска-каталіцкай Царквы ў Расійскай імперыі [177, с. 105–117 (№ 15982); 27, с. 40].

У 1801 г., без узгаднення са Святым Прастолам, імператар Аляксандр I падпісаў указ аб стварэнні вышэйшага органа кіравання Рымска-каталіцкай і Грэка-уніяцкай Цэрквамі у імперыі – своеасаблівага аналага Найсвяцейшага Сінода –

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Духоўнай калегіі [180, с. 823–829 (№ 20053)]. Апошняя стваралася рукамі дзяржавы ў тых жа мэтах, што і яе прататып, Сінод: улады імкнуліся бюракратызаваць вышэйшае кіраванне канфесіяй і, адпаведна, уключыць Калегію ў адміністрацыйны апарат імперыі. Акрамя таго, Духоўная калегія абмяжоўвала ўладу Папы Рымскага, а таксама і адзінаўладдзе біскупаў.

Першай спробай сістэматызацыі і ўніфікацыі кіравання неправаслаўнымі канфесіямі ў Расійскай імперыі было стварэнне 25 ліпеня 1810 г. Галоўнага ўпраўлення духоўных спраў замежных веравызнанняў (ГУ ДСЗВ) [181, с. 278–280 (№ 24307)]. У 1817 г. ГУ ДСЗВ было ўключана ў склад новастворанага Міністэрства духоўных спраў і народнай асветы ў якасці асобнага дэпартамента. У 1824 г. міністэрства было ліквідавана, а ГУ ДСЗВ апынулася ў структуры міністэрства народнай асветы [18, с. 152–178].

2 лютага 1832 г. ГУ ДСЗВ было далучана да міністэрства ўнутраных спраў і атрымала назву Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў (ДДСЗВ) [184, с. 53 (№ 5126)]. Гэты дэпартамент быў цэнтральнай дзяржаўнай установай, якая загадвала справамі «замежных веравызнанняў» на тэрыторыі Расійскай імперыі да 1917 г. Першае з трох аддзяленняў ДДСЗВ кіравала справамі рымска-каталіцкага і грэка-каталіцкага веравызнанняў. Яму была падначалена і Рымска-каталіцкая Духоўная калегія. У функцыі першага аддзялення ўваходзілі кіраванне сувязямі расійскіх католікаў і ўніятаў з Рымскай курыяй; зацвярджэнне свяшчэннаслужыцеляў на духоўныя пасады (акрамя тых, што зацвярджаліся імператарам); вядзенне статыстыкі прыходаў іпрыхаджан; дазвол на адкрыццё рэлігійных таварыстваў, на стварэнне новых прыходаў, пабудову касцёлаў, набыццё прыходамі нерухомай маёмасці; выплата жалавання духоўным асобам са сродкаў дзяржаўнага казначэйства; здзйсненне кантролю за прыватнымі капіталамі духоўных асоб [181, с. 327–328 (№ 24326)].

Важнейшым этапам у працэсе рэгламентацыі прававога становішча канфесій было прыняцце «Звода законаў Расійскай імперыі» (1832 г.). Як ужо адзначалася, нормы гэтага зборніка заканадаўчых актаў вызначалі прывілеяванае становішча хрысціянскіх канфесій у параўнанні з нехрысціянскімі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Правамерна вызначаючы асаблівую ролю Праваслаанай Царквы ў Расійскай дзяржаве, заканадаўца прадугледжваў прававыя гарантыі дзейнасці рымска-каталіцкай канфесіі і яе аховы, што было замацавана ў крымінальным і грамадзянскім праве імперыі.

У той жа час, у 1830-х і першай палове 1840-х гадоў назіралася рэзкае абвастрэнне ўзаемаадносін Расійскай імперыі і Ватыкана. Прычынай істотных супярэчнасцей паміж Пецярбургам і Рымам было паўстанне 1830–1831 гг.: падтрымка рымска-каталіцкім духавенствам паўстанцкага руху прымусіла імперскі ўрад пайсці на рэпрэсіўныя меры: былі зняволены найбольш актыўныя ўдзельнікі паўстання з ліку духоўных асоб, закрыты шэраг кляштараў. Далейшая эскалацыя канфлікту была выклікана далучэннем грэка-ўніятаў да Праваслаўнай Царквы (1839 г.). Ватыкан з абурэннем успрыняў згубу паўтарамільённай паствы. Папа Рыгор XVI у знак пратэсту супраць ліквідацыі Уніяцкай Царквы адмаўляўся зацвярджаць на рымска-каталіцкія епіскапскія кафедры кандыдатаў, прызначаных расійскім імператарам. Так, да сярэдзіны 1840-х гадоў большасць епіскапскіх кафедр у Расіі была вакантнай [74, с. 91–95]. У сярэдзіне 1840-х гадоў расійская дыпламатыя выступіла з ініцыятывай нармалізацыі стасункаў са Святым Прастолам. Паміж Расіяй і Рымскай курыяй распачаліся перамовы аб заключэнні канкардату [74, с. 90–91]. Адпаведны дакумент быў падпісаны 22 ліпеня 1847 г.

Канкардат 1847 г. істотным чынам пашыраў прэрагатывы рымска-каталіцкіх епіскапаў. Згодна з палажэннямі дагавора, змяняўся парадак прызначэння каталіцкіх іерархаў у Расійскай імперыі. Калі раней Папа Рымскі мусіў толькі зацвердзіць прызначаную імператарам кандыдатуру, то ў адпаведнасці з канкардатам архіепіскап-мітрапаліт, епархіяльныя епіскапы, епіскапы-суфраганы павінны былі прызначацца манархам толькі пасля папярэдняга ўзгаднення з Пантыфікам [217, ст. 24]. Па уласным меркаванні (аднак пасля атрымання «згоды ўрада») епіскапы прызначалі свяшчэннікаў у прыходы, фарміравалі склад епархіяльных кансісторый [217, ст. 28, 29, 31, 33, 37]. Шырокія правы надаваліся епіскапам у вырашэнні царкоўна-судовых спраў, кіраванні царкоўнай гаспадаркай і духоўнымі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

навучальнымі ўстановамі [217, ст. 44, 47, 60–62, 102, 104–111]. Акрамя таго, у канкардаце фіксаваліся колькасць рымска-каталіцкіх епархій, іх назвы, тэрытарыяльныя межы і месцаразмяшчэнне кафедр [217, ст. 11–14]. Вызначаліся ў дакуменце і агульныя ўмовы будаўніцтва каталіцкіх храмаў у імперыі: пабудова новых касцёлаў дазвалялася ў мясцовасцях, «… где сего потребует или приращение народонаселения, или слишком большая обширность существующих приходов и трудность сообщений» [217, ст. 125].

Такім чынам, расійскі ўрад пайшоў на самае цеснае супрацоўніцтва з Ватыканам. Увесь комплекс спрэчных пытанняў, звязаных са становішчам рымска-каталіцкай канфесіі ў імперыі, быў узгоднены з Пантыфікам, Рымска-каталіцкая Царква атрымала цэласны прававы статус, які гарантаваў бесперашкодную рэлігійную дзейнасць канфесіі.

Нормы канкардату 1847 г. былі закладзены ў аснову Статута Рымска-каталіцкай Царквы. У 1857 г. пад назвай «Уставы духовных дел иностранных исповеданий» выйшаў 11 том Звода законаў Расійскай імперыі [217]. (Новая рэдакцыя закону выйшла ў 1896 г. [218]). Першая кніга гэтага выдання называлася «О управлении духовных дел христиан римско-католического и армяно-католического исповедания». У ёй фіксавалася епархіяльная структура канфесіі; вызначаўся парадак прызначэння і звальнення духоўных асоб, падавалася працэдура фарміравання і кампетэнцыя Духоўнай калегіі, епархіяльных кансісторый, капітулаў; дэкларававаліся правы і абавязкі архіепіскапа-мітрапаліта, епіскапаў, епіскапаў-суфраганаў, прыходскага і манаскага духавенства; рэгламентаваўся працэс кіравання духоўнымі навучальнымі ўстановамі, царкоўнай маёмасцю [217; 218].

Па сутнасці, з выданнем Статута працэс заканадаўчага афармлення прававога статусу рымска-каталіцкай канфесіі ў Расійскай імперыі павінен быў завяршыцца. Аднак у 1866 г., ва ўмовах новага абвастрэння ўзаемаадносін Расійскай імперыі і Рыма, што было звязана з удзелам каталіцкага духавенства ў паўстанні 1863–1864 гг. і падтрымкай паўстанцкага руху з боку Ватыкана, расійскі ўрад абвясціў аб аднабаковым разрыве канкардату са Святым Прастолам [74, с. 81–107]. Такім чынам, дакумент, які быў закладзены ў аснову Статута Рымска-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каталіцкай Царквы, згубіў для імперыі сваю юрыдычную сілу. Гэта, на нашу думку, прадвызначыла спецыфіку прававога становішча Рымска-Каталіцкай Царквы на беларускіх землях пасля паўстання 1863–1864 гг.

Такім чынам, пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай адбылася змена афіцыйнага прававога статусу рымска-каталіцкай канфесіі на беларускіх землях: з «пануючага» ў Рэчы Паспалітай веравызнання Рымскі каталіцызм ператварыўся ў «замежную», «цярпімую» ў Расійскай імперыі рэлігію. У адпаведнасці з гэтым статусам ажыццяўлялася прававое рэгуляванне дзейнасці рымска-каталіцкай канфесіі ў імперыі. У асобных тамах Звода законаў Расійскай імперыі (Т. IX «Законы о состояниях», Т. XV «Уложение о наказаниях…» і інш.), канкардаце 1847 г., Статуце Рымска-каталіцкай Царквы ўстанаўліваліся гарантыі дзяржаўнай аховы веравызнання і свабоднага ажыццяўлення рэлігійнай дзейнасці канфесіі пры ўмове, што такая дзейнасць не будзе пярэчыць асновам імперскага ладу і распаўсюджвацца на праваслаўных. Рэгламентацыя прававога становішча Рымска-каталіцкай Царквы прадугледжвала ўстанаўленне рамкавах умоў дзейнасці канфесіі, што ўспрымалася Каталіцкай Царквой як рэпрэсіўныя меры, несправядлівае прыніжэнне афіцыйнага статусу канфесіі, якая зусім нядаўна (да моманту трох падзелаў Рэчы Паспалітай) была пануючай рэлігіяй, адыгрывала ролю асноўнай каштоўнаснай крыніцы дзяржаўнага светапогляду, з'яўлялася важнейшым механізмам культурнай і нацыянальнай гамагенізацыі грамадства. Імкненне Рымска-каталіцкай Царквы аднавіць свой ранейшы афіцыйны статус ператварала яе ў асноўны ідэалагічны цэнтр паўстанцкага руху за аднаўленне дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай. У выніку чаго ўзнікала калізія інтарэсаў Каталіцкай Царквы, якая была незадаволена сваім афіцыйным статусам у Расійскай імперыі, і дзяржавы, якая вымагала ад каталіцкай канфесіі лаяльнасці імперскаму правапарадку ў замен на гарантыі верацярпімасці. Гэта калізія заканамерна прадвызначала спецыфіку прававога становішча рымска-каталіцкай канфесіі на беларускіх землях у 1863–1905 гг.: антыўрадавая дзейнасць канфесіі выклікала рэпрэсіўную рэакцыю ўлад.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 3.2 Адміністрацыйная структура Рымска-каталіцкай Царквы

*Арганізацыя вышэйшага кіравання Рымска-каталіцкай Царквой.* У адрозненне ад праваслаўнай эклезіялогіі, якая прызнае вяршынства царкоўнай улады за Саборамі, рымска-каталіцкае багаслоўе абгрунтоўвае адзінаўладдзе Папы Рымскага над усёй Усяленскай Каталіцкай Царквой [14, с. 115]. Паводле каталіцкіх канонаў, Рымскі Першасвяшчэннік, на якім ляжыць адказнасць, ускладзеная Госпадам на першага сярод апосталаў – Пятра, з’яўляецца галавой епіскапскай калегіі, вікарыем Хрыста і пастарам усёй зямной Царквы. Яму належыць ардзінарная, вярхоўная, поўная, непасрэдная і ўніверсальная ўлада ў Царкве [262, с. 192]. Згодна з кананічным правам, Пантыфік ажыццяўляе і знешняе прадстаўніцтва Рымска-каталіцкай Царквы перад дзяржаўнымі ўладамі розных краін, яму належыць выключнае, неабмежаванае якім-небудзь староннім уплывам, права прызначэння духоўных асоб на епіскапскія кафедры [231, с. 217, 394].

Так, шырокая наднацыянальная кампетэнцыя Папы Рымскага разглядалася еўрапейскімі манархіямі з часоў Рэфармацыі і Контррэфармацыі як умяшальніцтва Ватыкана ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў. У выпадку ж Расійскай імперыі дадзеная аргументацыя падмацоўвалася небяспекай падтрымкі Святым Прастолам ідэй аднаўлення Рэчы Паспалітай. Зыходзячы з гэтага, ў 1801 г. імператар Аляксандр I прымае рашэнне аб стварэнні вышэйшага органа кіравання Рымска-каталіцкай Царквой у імперыі – Духоўнай калегіі, якая была заклікана абмежаваць уладу Папы Рымскага над расійскімі падданымі-католікамі [180, с. 823–829].

Згодна з кананічным правам, Рымска-каталіцкая Царква ў асобных краінах не мела адзінага адміністрацыйнага органа, які б юрыдычна падначальваў усіх католікаў адпаведнай дзяржавы пэўнай царкоўнай установе. Каталіцкія епіскапы падначальваліся непасрэдна Рыму. Ролю пасрэдніка паміж епіскапам і Папам мог адыгрываць толькі архіепіскап-мітрапаліт, які канцэнтраваў царкоўнае кіраўніцтва не ў межах асобнай краіны, а ў межах царкоўнай правінцыі (у адной краіне магло быць некалькі правінцый) [231, с. 220]. Таму стварэнне Рымска-каталіцкай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Духоўнай калегіі не адпавядала кананічнаму праву і не мела аналагаў у свеце. Ватыкан не прызнаваў законнасць існавання гэтага органа. І толькі ў 1875 г., у выніку перамоў паміж Рымскай курыяй і расійскім урадам, Папа прызнаў Духоўную калегію, але толькі як установу, якая кіруе адміністрацыйна-гаспадарчымі справамі канфесіі [268, с. 36].

У склад Калегіі ўваходзілі Магілёўскі архіепіскап-мітрапаліт, два члены – адзін епіскап і адзін прэлат (г.зн. дэкан ці настаяцель кафедральнага капітула – савета духоўных асоб пры епархіяльным епіскапе) і засядацелі, па адным ад кожнай епархіі. Засядацелямі маглі быць прэлаты ці простыя члены капітулаў – canonікі. Члены Духоўнай калегіі прызначаліся і звальняліся ўказам імператара. Засядацелі абіраліся кафедральнымі капітуламі епархій на трохгадовы тэрмін [180, с. 827]. Справы ў Калегіі вырашаліся большасцю галасоў [180, с. 826]. Голас мітрапаліта быў роўны голасу звычайнага каноніка. Больш за тое, перагляд спраў, якія паступалі ў Духоўную калегію з Магілёўскай епархіі, адбываўся без удзелу мітрапаліта. Такім чынам, рашэнне першаіерарха царкоўнай правінцыі магло быць адменена кананічна падначаленымі яму духоўнымі асобамі, што згодна з кананічным правам з’яўлялася недапушчальным [106, с. 93].

Як і ў складзе Найсвяцейшага Сінода, пры Духоўнай калегіі прадугледжвалася пасада свецкага пракурора і канцылярыя, служачыя якой з’яўляліся дзяржаўнымі чыноўнікамі [217, ст. 21; 218, ст.27]. На пракурора ўскладваліся абавязкі нагляду за вырашэннем спраў у Калегіі. У выпадку, калі дзейнасць гэтага органа пярэчыла дзяржаўным інтарэсам, пракурор абавязваўся прыпыніць яе, «прадставіўшы» свой пратэст міністру ўнутраных спраў [217, ст. 73; 218, ст. 77]. Апошні меў права адмяніць любое рашэнне Калегіі [217, ст. 72; 218, ст. 76].

Як і праваслаўны Сінод, Духоўная калегія спалучала ў сабе рысы вышэйшай адміністрацыйнай і судовай інстанцыі [180, с. 823–829]. Калегія мела наступныя паўнамоцтвы: збор і акумуляванне звестак аб усіх рымска-каталіцкіх касцёлах, манастырах, духоўных асобах, навучальных і іншых царкоўных установах, рухомай і нерухомай маёмасці; нагляд за дзейнасцю епархіяльных кансісторый; пасрэдніцтва ў зносінах «епархіяльнага начальства» з расійскім урадам; прыём у манаства і вызваленне ад манаскіх абетаў; выдача дазволаў на прынядце

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

каталіцтва жадаючым нехрысціянам; загадванне капіталамі і маёмасцю Царквы; вырашэнне унутрыканфесійных маёмасных спрэчак [217, ст. 67; 218, ст. 71]. З 1866 г. (з часу прыпынення дзейнасці канкардату 1847 г.) і па 1875 г. Духоўная калегія з'яўлялася апошняй судовай інстанцыяй па вырашэнні шлюбаразводных спраў расійскіх падданых-католікаў. Аднак у 1875 г. імператар Аляксандр II пагадзіўся на аднаўленне кананічнага парадку (прапісанага ў канкардаце) разгляду шлюбных спраў: канчатковае рашэнне прызнавалася за Папам Рымскім [67, арк. 4 адв., 24 і адв.].

Такім чынам, нягледзячы на даволі складаныя стасункі паміж Расійскай імперыяй і Святым Прастолам, што было выклікана падтрымкай рымска-каталіцкім клірам ідэй аднаўлення Рэчы Паспалітай, Пецярбург не пайшоў на канчатковы разрыў адносін з Ватыканам, а толькі шляхам стварэння Духоўнай калегіі, вышэйшага органа кіравання канфесіяй у межах імперыі, ажыццявіў спробу абмежавання некаторых паўнамоцтваў Папы Рымскага па кіраванні рымска-каталіцкай канфесіяй у Расіі. Гэта сведчыла аб прызнанні Расійскай імперыяй непарушнасці фундаментальных асноў кананічнага ўладкавання Рымска-каталіцкай Царквы.

*Епархіяльнае кіраванне.* Згодна з кананічным правам, епархія (дыяцэзія) з'яўляецца асноўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай аўтаноміяй Рымска-каталіцкай Царквы. Епархію ўзначальвае епіскап (біскуп). Епіскапства прызнаецца найвышэйшай ступенню Свяшчэнства: епіскапы лічацца пераемнікамі апосталаў. Яны здзяйсняюць вышэйшую і поўную ўладу над Царквой у межах сваёй епархіі настолькі, наколькі знаходзяцца ў адзінстве з Папам. Пярсцёнак на руцэ епіскапа сімвалізуе вобраз епархіі як нарачонай іерарха [231, с. 235].

Паводле рымска-каталіцкіх кананічных нормаў, выключнае права прызначэння епіскапаў належыць Пантыфіку. Аднак, як адзначыў М. Сувораў, у XIX ст. толькі ў Італіі Папа ў поўнай меры рэалізоўваў гэта права, прызначаючы епіскапаў без узгаднення кандыдатур са свецкімі ўладамі. У астатніх жа еўрапейскіх краінах парадак прызначэння епіскапаў, як правіла, вызначаўся канкардатамі паміж Ватыканам і ўрадам адпаведнай дзяржавы [231, с. 394]. Як ужо адзначалася, парадак узгаднення кандыдатаў на рымска-каталіцкія епіскапскія кафедры

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў Расійскай імперыі рэгламентаваўся канкардатам 1847 г. Прыпыненне дзейнасці апошняга ў 1866 г. ускладніла далейшае ўзаемадзеянне расійскага ўрада і Святога Прастола па пытанні прызначэння кіраўнікоў епархій.

Так, яшчэ ў 1863 г. Віленскі генерал-губернатар М.М. Мураўёў распарадзіўся выслаць у Вятку Віленскага рымска-каталіцкага епіскапа А.С. Красінскага, якога генерал-губернатар лічыў «главным духовным деятелем мятежа» [144, с. 491]. Спасылаючыся на нормы канкардату, Ватыкан працягваў лічыць сасланага епіскапа дзеючым кіраўніком Віленскай епархіі. У сваю чаргу, расійскі ўрад пасля разрыву канкардату лічыў правамерным не прызнаваць духоўную ўладу А.С. Красінскага. З 1863 г. па 1866 г. функцыі кіраўніка епархіі выконваў адміністратар, прэлат Ю. Баўкевіч. На гэтай пасадзе апошняга змяніў прэлат П. Жылінскі, які кіраваў епархіяй да 1883 г. Святы Прастол не прызнаваў уладу прэлатаў. Нават прыходы, настаяцелі якіх былі прызначаны П. Жылінскім, Ватыкан лічыў вакантнымі [97, с. 191]. Толькі ў 1883 г. паміж Расіяй і Рымам была заключана дамоўленасць, у выніку якой епіскапам быў прызначаны К. Грынявіцкі. Адчуваючы за сабой падтрымку Папы Рымскага, епіскап К. Грынявіцкі выступіў з крытыкай тых каталіцкіх святароў, якія ў папярэдні перыяд праявілі «добранадзейнасць у адносінах да ўрада». У сваім сакрэтным цыркуляры епіскап забараніў ксяндзам выкарыстоўваць рускую мову ў дадатковых богаслужэннях [222, с. 97]. Неўзабаве, у 1886 г., гэты епіскап быў высланы ў Яраслаўль. Як адзначае В. Яноўская, пасля паўстання 1863–1864 гг. на працягу паўстагоддзя толькі адзін віленскі епіскап (А.Ф. Аўдзіевіч (1890–1895 гг.)) пакінуў кафедру ў сувязі са смерцю [268, с. 38].

Усяго ж, згодна з умовамі канкардату 1847 г., у Расійскай імперыі (без уліку Царства Польскага) налічвалася 7 епархій: Магілёўская архіепархія, Віленская, Цяльшэўская (Самагіцкая), Луцка-Жытомірская, Камянецкая, Мінская і Ціраспальская епархіі. Канкардат вызначаў іх тэрытарыяльныя межы і месцаразмяшчэнне кафедр [217, ст. 11–14]. З часу падпісання гэтага дагавору змены ў епархіяльнай структуры Царквы не маглі ажыццяўляцца без узгаднення са Святым Прастолам. Аднак разрыў канкардату зрабіў магчымым для Пецярбурга ў аднабаковым парадку перагледзець епархіяльную структуру рымска-каталіцкай канфесіі ў імперыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Так, у 1866 г. па прапанове Кіеўскага генерал-губернатара А.П. Безака была ліквідавана Камянецкая епархія, прыходы якой былі перададзены пад юрысдыкцыю Луцка-Жытомірскага епіскапа. Як адзначыў М. Далбілаў, ажыццяўляючы гэту меру, расійскія ўлады імкнуліся паменшыць польскі і каталіцкі ўплыў на тэрыторыі, памежнай з аўстрыйскай Галіцыяй, дзе ў той час актыўна распаўсюджваўся русафільскі рух (русіны) [74, с. 604–605].

У 1867 г. у расійскіх уладных колах паўстала пытанне аб ліквідацыі яшчэ адной рымска-каталіцкай епархіі. Віленскі генерал-губернатар Э.Ц. Баранаў прапанаваў падначаліць прыходы Мінскай епархіі Віленскаму епіскапу. Адпаведны ўказ Аляксандра II выйшаў 27 ліпеня 1869 г. [192, с. 760 (№ 47307)]. Асноўнай прычынай такога рашэння была невялікая колькасць католікаў у гэтай епархіі. Напрыклад, калі ў Віленскай епархіі налічвалася 840 тыс. вернікаў, у Цяльшэўскай – больш за 1 млн., то ў Мінскай – толькі 150 тыс. Акрамя таго, менавіта католікі Міншчыны найбольш актыўна ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Паўночна-Заходняга краю ў другой палове 1860-х гадоў пераходзілі ў Праваслаўе [74, с. 603–612; 97, с. 182–195]. Рым не прызнаў факт ліквідацыі епархіі і абвясціў несапраўднай юрысдыкцыю Віленскага епіскапа над мінскімі прыходамі. Толькі ў 1883 г. паміж Ватыканам і Расіяй быў знойдзены кампраміс: Папа Леў XIII і Аляксандр III далі згоду на падначаленне касцёлаў Мінскай губерні архіепіскапу Магілёўскаму. Аднак, паводле кананічнага права, Мінская епархія не прыпыняла свайго існавання і пасля падзення імперыі ў 1917 г. аднавіла свае структуры [281, s. 178–180].

Рымска-каталіцкія епархіі ў Расійскай імперыі былі аб'яднаны ў царкоўную правінцыю, на чале якой знаходзіўся Магілёўскі архіепіскап-мітрапаліт. Астатнія ж епіскапы лічыліся суфраганамі (вікарыямі, намеснікамі) мітрапаліта [217, ст. 17]. Акрамя таго, кожны кіраўнік епархіі, згодна з умовамі канкардату, павінен быў мець вызначаную колькасць епіскапаў-суфраганаў: у Магілёўскай архіепархіі, Віленскай і Цяльшэўскай епархіях іх прадугледжвалася па 3 адпаведна, у Луцка-Жытомірскай і Ціраспальскай – па 2, Камянецкай і Мінскай – па адным [217, ст. 18]. Аднак пасля ліквідацыі канкардату гэтыя нормы не выконваліся. Зразумела, што ва ўмовах, калі некаторыя



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

епархіі (як, напрыклад, Віленская) на працягу некалькіх гадоў не мелі епархіяльных епіскапаў, пытанне аб прызначэнні епіскапаў-суфраганаў увогуле не ўздымалася. Так, па стане на 1904 г. у Расійскай імперыі быў толькі адзін епіскап-суфраган у Цяльшэўскай епархіі [106, с. 89–90].

У межах сваёй епархіі епіскап валодаў усёй паўнатой улады: ажыццяўляў кіраванне царкоўнымі справамі, здзяйсняў духоўнае правасуддзе, вышэйшы нагляд за духавенствам, касцёламі, манастырамі, навучальнымі і іншымі духоўнымі ўстановамі [217, ст. 44]. Таму выбар кандыдатуры на епіскапскую кафедру быў надзвычай важным для расійскіх улад. Зыходзячы з таго, што сярод каталіцкага кліру і вернікаў былі моцнымі антыімперскія настроі, асоба епархіяльнага першаіерарха павінна была садзейнічаць забеспячэнню імперскага правапарадку і лаяльнасці вернікаў свецкім уладам. Згодна са Статутам Рымска-каталіцкай Царквы, новапрызначаны епіскап павінен быў прыняць прысягу на вернасць імператару і яго наследніку, і толькі затым царкоўнаму іерарху дазвалялася прысягнуць Папу Рымскаму [217, ст. 25].

Паводле рымска-каталіцкага кананічнага права, пры епіскапскіх кафедрах прадугледжавалася функцыянаванне дарадчага органа – капітула. Апошні фарміраваўся з духавенства кафедральнага касцёла. Яго члены называліся канонікамі. У выпадку вырашэння важных для жыцця епархіі пытанняў епіскап абавязваўся звяртацца за саветам да капітула. Калі ж епіскап вырашаў справы, якія тычыліся кіравання епархіяльнай маёмасцю, згода капітула была абавязковай [231, с. 236–237]. Гэты епархіяльны орган прадугледжваўся і расійскім заканадаўствам. Згодна са Статутам Рымска-каталіцкай Царквы, члены капітула (прэлаты і каноні) прызначаліся епіскапам і зацвярджаліся імператарам. Статут дазваляў прызначаць на гэтыя пасады толькі тых святароў, якія мелі духоўныя навуковыя ступені [217, ст. 27]. У выпадку смерці епіскапа ці складання ім сану капітул абіраў вікарыя, які кіраваў епархіяй да прызначэння новага епіскапа [217, ст. 59]. Гэта норма ў поўнай меры адпавядала кананічным правілам [231, с. 237].

Вядзенне бягучых спраў у епархіях ажыццяўлялася духоўнымі кансісторыямі. Згодна з кананічнымі нормамі, кансісторыі павінны былі выконваць функцыю канцылярыі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

епіскапа. Апошні мусіў самастойна вызначаць кампетэнцыю і састаў гэтага органа [106, с. 94]. Аднак у Расійскай імперыі паўнамоцтвы і прыкладны састаў кансісторый былі рэгламентаваны ў Статуце Рымска-каталіцкай Царквы. Згодна з артыкулам 20 Статута, старшынёй кансісторыі з’яўляўся афіцыял. Як і праваслаўныя кансісторыі, рымска-каталіцкія складаліся з «присутствия», куды ўваходзілі 5–7 членаў з ліку духоўных асоб (віцэ-афіцыял, візітатар манастыроў і інш.), і канцылярыі, якая складалася з сакратара і іншых грамадзянскіх чыноўнікаў (столаначальніка, архіварыуса і інш.) [217, ст. 20]. Прызначэнне і звальненне членаў «присутствия» кансісторыі ажыццяўлялася епіскапам, але са згоды ўрада. Пасля смерці епіскапа ці ў выпадку складання ім сану члены кансісторыі павінны былі пайсці ў адстаўку, наступны кіраўнік епархіі (у тым ліку і часовапрызначаны капітулам вікарый) меў права са згоды ўрада прызначыць новы састаў кансіторыі [217, ст. 28, 29]. Сакратар кансісторыі прызначаўся і звальняўся непасрэдна Міністэрствам унутраных спраў. Астатнія члены канцылярыі зацвярджаліся епіскапам па прадстаўленні сакратара. Усе члены канцылярыі кансісторыі лічыліся дзяржаўнымі служачымі [217, ст. 30–32].

Кампетэнцыя рымска-каталіцкіх кансісторый, у цэлым, паўтарала пералік паўнамоцтваў адпаведных органаў праваслаўнай канфесіі. Кансісторыя выконвала функцыі царкоўнага суда: разглядаліся справы па дысцыплінарных праступках духавенства, маёмасныя спрэчкі паміж духоўнымі асобамі, разнастайныя скаргі духоўных і свецкіх асоб на клірыкаў; аб ануляванні шлюбаў; аб накладанні царкоўных пакаранняў на рымска-каталіцкіх вернікаў у выпадку, калі, згодна з рашэннем свецкага суда, яны «накіроўваліся ў распараджэнне» духоўнага суда. Акрамя таго, у кансісторыях разглядаліся гаспадарчыя пытанні: вырашэнне фінансавых спраў, нагляд за вядзеннем дакументацыі ў касцёлах, курыраванне спраў аб пабудове і рамонце епархіяльных устаноў [217, ст. 60].

Парадак прыняцця рашэнняў па справах, якія разглядаліся каталіцкімі кансісторыямі, распрацоўшчыкі Статута Рымска-каталіцкай Царквы таксама запазычылі ў праваслаўным «Уставе духовных консисторий». Епіскап не прымаў удзелу ў пасяджэннях кансісторыі, але меў права вынесці ўласнае рашэнне па справе, якое магло не супадаць з заключэннем кансісторыі і лічылася канчатковым [217, ст. 61].

Такім чынам, тэндэнцыя ў расійскім заканадаўстве, скіраваная на абмежаванне ўлады епіскапаў у сваіх епархіях, была агульнай для праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій. Заканадаўчая рэгламентацыя саставу і паўнамоцтваў кансісторый, а таксама ўключэнне ў іх склад свецкіх асоб былі закліканы спрасціць кантроль грамадзянскіх улад над вядзеннем епархіяльных спраў.

*Дэканаты.* Своеасаблівым аналагам праваслаўных благачынных акруг у рымскіх католікаў з'яўляюцца дэканаты. Паводле каталіцкага кананічнага права, дэканаты – гэта адміністрацыйныя акругі ў складзе епархіі, якія аб'ядноўваюць некалькі побач размешчаных прыходаў. Дэканаты ўзначальваюцца дэканамі, якія выконваюць функцыю пасрэднікаў паміж епіскапам і прыходскім кліраМ, здзяйсняюць нагляд за выкананнем святарамі ўскладзеных на іх абавязкаў [231, с. 243].

Існаванне дэканатаў у адміністрацыйнай структуры Рымска-каталіцкай Царквы ў Расійскай імперыі гарантавалася канкардатам 1847 г. і, адпаведна, царкоўным Статутам [217, ст. 15]. У артыкуле 36 Статута ўстанаўлівалася, што дэканы прызначаюцца непасрэдна епіскапам. На гэту пасаду маглі прэтэндаваць каталіцкія святары, якія мелі, як мінімум, семінарскую адукацыю [217, ст. 36]. У канцы XIX–пачатку XX ст. на тэрыторыі Расійскай імперыі налічвалася 166 дэканатаў. Статут невызначаў канкрэтную колькасць прыходаў, неабходную для стварэння дадзеных царкоўных акруг. Таму колькасць прыходаў у межах розных дэканатаў магла адрозніваца. Напрыклад, у 1828 г. на тэрыторыі Слонімскага дэканата знаходзілася 12 прыходаў. Аднак у другой палове XIX ст., калі пасля паўстання 1863–1864 гг. расійскія ўлады па шэрагу прычын (падтрымка прыходскім духавенствам паўстанцкага руху, пераход значнай часткі вернікаў у Праваслаўе і г.д.) ажыццяўлялі мерапрыемствы па скарачэнні колькасці каталіцкіх культавых устаноў у Паўночна-Заходнім краі, колькасць прыходаў у Слонімскім дэканаце зменшылася да 5-ці [127, с. 237]. У той жа час колькасць прыходскіх касцёлаў у Гомельскім дэканаце, наадварот, павялічылася: калі на пачатку XIX ст. тут налічвалася 4 прыходы, то ў 1880-ыя гады – ужо 5 [15, с. 18, 24].

*Прыходы.* Рымска-каталіцкае кананічнае права дае падобнае да праваслаўнага вызначэнне паняцця «прыход» («парафія») – гэта стала дзеючая грамада веруючых хрысціян, пастырская апека аб якой пад кіраўніцтвам епархіяльнага епіскапа даручаецца прыходскаму настаяцелю як яе пастару. Ствараць, ліквідоўваць і пераўтвараць прыходы мае права толькі епархіяльны епіскап. Прыходскі настаяцель закліканы раздзяліць з епіскапам служэнне Хрысту, абавязваецца несці на карысць сваёй абшчыны настаўніцкае, свяцільскае і праўленчае служэнне [68].

Згодна з умовамі канкардату 1847 г., рымска-каталіцкія епіскапы мелі права прызначаць святароў у прыходы толькі пасля ўзгаднення кандыдатур з расійскім урадам [217, ст. 37]. Так, у адрозненне ад Праваслаўнай Царквы, дзе епархіяльны архірэй прымаў самастойнае рашэнне падчас прызначэння прыходскага духавенства, адпаведны працэс у каталікаў кантраляваўся грамадзянскімі ўладамі. На нашу думку, такое адрозненне было звязана з тым, што расійскія ўлады ўскладалі на прыходскі клір іншаслаўных веравызнанняў даволі вялікі (пасутнасці, такі ж, як і на праваслаўных святароў) аб'ём дзяржаўных абавязкаў. У сувязі з гэтым, значна менш давяраючы святарам «замежных» веравызнанняў, чым кліру «пануючай» канфесіі, урад імкнуўся да таго, каб важныя для дзяржавы функцыі выконваліся «добранадзейнымі» духоўнымі асобамі. Настаяцелі прыходаў павінны былі даваць прысягу на вернасць імператару [217, ст. 40].

Парадак адкрыцця новых прыходаў, будаўніцтва і рамонту каталіцкіх культавых будынкаў на тэрыторыі Расійскай імперыі рэгуляваўся нормамі канкардату 1847 г. і, адпаведна, Статута Рымска-каталіцкай Царквы. Новыя прыходы маглі стварацца ў сувязі з павелічэннем колькасці каталіцкага насельніцтва, «обширностью» існуючых прыходаў і «трудностью сообщения» [217, ст. 14]. Для атрымання дазволу на пабудову новага касцёла ініцыятары павінны былі звярнуцца з прашэннем да мясцовага губернатара. Губернскае кіраўніцтва, пасля зносін з адпаведнымі праваслаўным і рымска-каталіцкім епіскапамі, павінна было ўпэўніцца ў адсутнасці перашкод для дазволу на пабудову і затым перадаць звесткі са сваім заключэннем у Міністэрства ўнутраных спраў. Апошняе і выносіла канчатковае рашэнне. Для ажыццяўлення рамонту касцёлаў і капліц, а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пабудовы новых культавых устаноў замест састарэлых ці разбураных было дастатковым атрыманне дазволу епархіяльнага епіскапа [217, ст. 125]. У пункце 5 артыкула 125 царкоўнага Статута ўстанаўлівалася, што абшчыны і прыватныя асобы, якія за ўласны кошт здзяйснялі рамонт касцёла, пры недахопе сродкаў мелі права звяртацца за фінансавай дапамогай да грамадзянскіх улад [217, с. 29].

Як сведчаць крыніцы, заканадаўства Расійскай імперыі не з’яўлялася перашкодай на шляху пашырэння сеткі рымска-каталіцкіх культавых устаноў на беларускіх землях. Паводле высноў І. Ганчарука, пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі колькасць рымска-каталіцкіх прыходаў у рэгіёне павялічылася. Гісторык называе наступныя шляхі стварэння новых прыходаў: пераўтварэнне філіяльных (прыпісных) касцёлаў у прыходскія, будаўніцтва новых храмаў, адкрыццё прыходаў пры каталіцкіх манастырах [28, с. 108]. Так, напрыклад, колькасць прыходаў у Віленскай епархіі ў 1830 г. складала 160, у той час як у 1772 г. іх было на 15 менш [28, с. 107]. Па звестках А.І. Мілавідава, толькі за 1856–1862 гг. у Віленскай губерні было пабудавана 8 алтароў, 15 капліц і 37 касцёлаў. На усёй жа тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў за гэты час было адрамантавана і пабудавана больш за 200 каталіцкіх культавых устаноў [137, с. 13].

Аднак пасля падзей паўстання 1863–1864 гг. расійская адміністрацыя звярнула ўвагу на істотнае павелічэнне колькасці рымска-каталіцкіх касцёлаў і капліц у Паўночна-Заходнім краі. Генерал-губернатар М.М. Мураўёў сцвярджаў, што большасць каталіцкіх культавых будынкаў, якія з’явіліся ў краі напярэдадні паўстання, былі пабудаваны з парушэннем заканадаўства, расійскія ўлады не давалі дазволу на адкрыццё новых храмаў і капліц. У справаздачы імператару М.М. Мураўёў пісаў: «… римско-католическое духовенство… шло беспрепятственно к предположенной цели ополячения края, строило, вопреки закону, самопроизвольно костёлы и подготовляло мятеж…» [144, с. 489–490]. Такім чынам, па словах генерал-губернатара, актыўнае будаўніцтва рымска-каталіцкіх касцёлаў у краі напярэдадні паўстання з’яўлялася мэтанакіраванай дзейнасцю каталіцкага кліру па падрыхтоўцы да паўстання: шчыльная сетка касцёлаў (у тым ліку і ў рэгіёнах, дзе католікі складалі нязначную

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

частку насельніцтва) павінна была засведчыць прыналежнасць беларуска-літоўскіх зямель да каталіцкай Польшчы.

За час праўлення М.М. Мураўёва (1863–1865 гг.) у краі ў адміністрацыйным парадку былі закрыты 32 касцёлы і 52 капліцы [137, с. 17]. Пад кантроль віленскай адміністрацыі быў пастаўлены працэс будаўніцтва новых, а таксама рамонт існуючых рымска-каталіцкіх касцёлаў і капліц. 24 чэрвеня 1864 г. М.М. Мураўёў выдаў цыркуляр, згодна з якім будаўніцтва і рамонт каталіцкіх культавых устаноў павінны былі ажыццяўляцца з непасрэднага дазволу генерал-губернатара [259, арк. 59 адв.].

4 красавіка 1866 г. мерапрыемствы па закрыцці каталіцкіх культавых устаноў набылі заканадаўчую аснову. Згодна з указам Аляксандра II, генерал-губернатары атрымалі права па ўласным рашэнні закрываць каталіцкія касцёлы і капліцы. Аднак інтэнсіўнае прымяненне гэтага заканадаўчага акта Віленскім генерал-губернатарам К.П. Каўфманам змусіла міністра ўнутраных спраў П.А. Валуева дамагчыся ад імператара карэкціроўкі ўказа. У верасні 1866 г. Аляксандр II унёс у дакумент удакладненне: рашэнне аб закрыцці храма ці капліцы павінна было прымацца генерал-губернатарам па ўзгадненні з міністрам унутраных спраў [229, с. 332].

Згодна з лічбамі, што падае ў сваім даследаванні А.І. Ганчар, за перыяд з 1860 г. па 1905 г. у Беларусі былі ліквідаваны каля 200 касцёлаў і 240 капліц, 205 рымска-каталіцкіх храмаў былі пераўтвораны ў праваслаўныя цэрквы [26, с. 59]. Напрыканцы XIX ст. у Беларусі заставалася 466 дзеючых касцёлаў і капліц [104, с. 68]. Як адзначыў М. Радван, мерапрыемствы па закрыцці рымска-каталіцкіх храмаў прывялі да праблемы празмернай колькасці вернікаў у прыходах Паўночна-Заходняга краю. На пачатку XX ст. колькасць вернікаў у рымска-каталіцкіх прыходах складала ад 5 да 10 тыс. чалавек [106, с. 90].

*Манастыры.* У адрозненне ад Праваслаўнай Царквы, дзе асноўныя прынцыпы функцыянавання манастыроў канстытуяваны ў Статуце Васілія Вялікага, у Рымска-каталіцкай Царкве адсутнічаюць універсальныя палажэнні аб уладкаванні і дзейнасці манастыроў. Па ўсім свеце рымска-каталіцкія манастыры (кляштары) былі аб'яднаны ў манаскія ордэны, якія адрозніваліся адзін ад аднога мэтамі свайго служэння (духоўнае сузіранне, аскетызм, царкоўная асвета, місіянерства, дабрачыннасць і г. д.) [262, с. 124].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Так, да ўласна манаскіх ордэнскіх груп адносіліся бенедыктынцы, цыстэрцыянцы, картузы. Манахі гэтых манастыроў падначальваліся Статуту святога Бенедыкта, прымалі зарокі паслушэнства, цноты, няхцівасці і сталага пражывання ў манастыры. Асновай жыццядзейнасці абвяшчалася фізічная праца манахаў. Духоўнасць апошніх грунтавалася на наследаванні Хрыстовых запаведзяў праз службу Божую і малітву. Група ордэнаў святарскага характару (канонікі рэгулярныя латэранскія, канонікі рэгулярныя ад пакуты, трынітарыі) карысталася Статутам святога Аўгустына і асноўнай мэтай свайго служэння лічыла пастырства, арганізацыю пры манастырах прыходаў для здавальнення духоўных патрэб вернікаў. Жабрацкія ордэны (аўгусцінцы, бернардзінцы, дамініканцы, францысканцы, кармеліты) асновай дзейнасці лічылі місіянерства, адмову ад маёмасці (не толькі ўласнай, але і калектыўнай) і ад сталага пражывання ў манастырах. Місіянерства і абарону Каталіцызму ў якасці мэтаў служэння вызначалі манахі-езуіты, піяры, місіянеры, марыяне. У адпаведнасці з гэтым іх кляштары нагадвалі жылыя дамы, дзе частка памяшканняў выкарыстоўвалася для навучальных устаноў, прытулкаў, шпіталяў, аптэк, інтэрнатаў для вучняў. Манаскія ордэны баніфратаў і рохітаў спецыялізаваліся на дапамозе хворым, бедным і бяздомным. Сярод іх фактычна не было свяшчэннікаў. Акрамя трох традыцыйных зарокаў баніфраты прымалі чацвёрты – дапамогі хворым нават пад пагрозай свайго жыцця, рохіты – выратавання хворых падчас эпідэмій і пахавання памерлых [29].

Кожны манаскі ордэн меў уласнае вышэйшае кіраванне: генерала і генеральны капітул. Апошнія падпарадкоўваліся непасрэдна Папу Рымскаму. Манастыры таго ці іншага ордэна ў розных рэгіёнах аб’ядноўваліся ў ордэнскія правінцыі, на чале якіх стаялі правінцыялы і правінцыйныя капітулы. Ордэнскія правінцыі не адпавядалі межам епархій і маглі не супадаць з дзяржаўнымі межамі. Калі ў дзяржаве налічвалася шмат манастыроў пэўнага ордэна, то яны маглі ўтварыць некалькі правінцый, а калі іх была нязначная колькасць, тады ўтвараліся міждзяржаўныя правінцыі. Кіраўніцтва правінцый не падначальвалася епархіяльнаму епіскапу, а знаходзілася пад непасрэднай юрысдыкцыяй ордэнскага генерала [28, с. 113–114].

Перад першым падзелам Рэчы Паспалітай на беларускіх землях дзейнічалі манастыры 26 манаскіх ордэнаў (19 мужчынскіх і 7 жаночых). Сярод іх былі прадстаўнікі ўсіх вышэйпералічаных манаскіх фармацый [28, с. 108–112].

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай арганізацыйная структура манаскіх ордэнаў на беларускіх землях змянілася. Ва ўказе аб стварэнні Магілёўскай рымска-каталіцкай архіепархіі ад 17 студзеня 1782 г. Кацярына II забараніла правінцыяльнаму кіраўніцтву ордэнаў падтрымліваць сувязі са сваім вышэйшым кіраўніцтвам, усе каталіцкія манастыры на тэрыторыі імперыі падначальваліся архіепіскапу [176, с. 384 (№ 15326)]. Дадзены заканадаўчы акт пярэчыў нормам рымска-каталіцкага кананічнага права. Аднак на той час гэта мера не ўспрымалася ў Еўропе як экстраардынарная. Як ужо адзначалася, памяншэнне ўплыву наднацыянальных рымска-каталіцкіх структур над католікамі ў суверэнных еўрапейскіх дзяржавах з’яўлялася агульнаеўрапейскай тэндэнцыяй. Нягледзячы на гэта, згодна з Палажэннем ад 13 лістапада 1801 г., расійскія ўлады, фактычна, вярнулі рымска-каталіцкім манастырам права на самакіраванне: ім дазвалялася самастойна (незалежна ад волі епіскапаў) абіраць настаяцеляў і ордэнскіх правінцыялаў, не забаранялася і скліканне правінцыйных капітулаў. За епіскапам заставалася толькі права нагляду і візітацыі манастыроў [28, с. 115].

Як падкрэсліў І. Ганчарук, уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі не прывяло да памяншэння колькасці рымска-каталіцкіх манастыроў у рэгіёне. Напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай у межах сучаснай Беларусі існавала 178 мужчынскіх і 28 жаночых манастыроў. У 1820-х гадах на гэтай жа тэрыторыі налічвалася 147 мужчынскіх манастыроў. Аднак, калі улічыць, што ў 1820 г., пасля выгнання ордэна езуітаў з Расійскай імперыі, былі ліквідаваны 34 езуіцкія асяродкі (гэты факт не быў звязаны з рэпрэсіямі супраць Рымска-каталіцкай Царквы ў імперыі, яго неабходна разглядаць у рэчышчы агульнаеўрапейскай палітыкі), то атрымліваецца, што колькасць мужчынскіх манастыроў іншых ордэнаў крыху павялічылася. Прычым, як адзначае гісторык, прырост манастыроў адбыўся за кошт земляў, што ўваходзілі ў склад Магілёўскай архіепархіі і Мінскай епархіі. Гэта яскрава сведчыць пра больш актыўную дзейнасць манаскіх ордэнаў ва ўсходняй Беларусі, дзе колькасць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каталіцкага насельніцтва была нязначнай. Колькасць жа жаночых прыстанкаў за гэты час амаль не змянілася [28, с. 108–113].

Да 1830 г. манаскія ордэны на беларуска-літоўскіх землях мелі магчымасць свабодна ажыццяўляць сваю дзейнасць, на практыцы рэалізоўваць асноўныя палажэнні сваіх статутаў, актыўна ўплываць на мясцовае грамадства [29]. Істотныя змены ў стаўленні расійскіх улад да рымска-каталіцкіх манастыроў адбыліся пасля паўстання 1830–1831 гг., падчас якога манахі актыўна выступалі на баку антыўрадавых сіл. Мерай расійскіх улад у адказ была кампанія па масавым закрыцці каталіцкіх манастыроў. На пачатку 1830-х гадоў у беларуска-літоўскіх губернях было ліквідавана 199 кляштараў [138, с. 227].

У 1841–1842 гг. каталіцкія манастыры, як і праваслаўныя ў 1764 г., былі падзелены на штатныя і пазаштатныя. У лік штатных улады залічылі 50 прыстанкаў, пазаштатныя ж аб’яўляліся часовымі і падлягалі закрыццю, калі колькасць манахаў у іх складзе менш васьмі [138, с. 227]. У гэты ж час адбылася і секулярызацыя зямельнай маёмасці каталіцкіх манастыроў і касцёлаў у краі [185, с. 139–140 (№ 15153)]. Згодна з указаміМікалая І ад 19 лістапада і 16 снежня 1842 г. рымска-каталіцкія манастыры пазбаўляліся духоўнай аўтаноміі і цалкам падначальваліся юрысдыкцыі епіскапаў. У імперыі ліквідоўвалася званне правінцыяла. Замест 12-ці правінцыялаў (што адпавядала колькасці ордэнаў, прадстаўленых на той час у дзяржаве) уводзілася 6 візітатараў (па адным на епархію). Візітатары прызначаліся епіскапамі з ліку белага духавенства і павінны былі назіраць за ўнутранай дысцыплінай у манастырах і за іх адносінамі са знешнім светам [74, с. 102]. Гэтыя ўказы пярэчылі нормам рымска-каталіцкага кананічнага права. Аднак, на нашу думку, дадзеныя дакументы наўрадці прывялі да ліквідацыі традыцыйнага ордэнскага ўладкавання. Відавочна, насуперак урадавым забаронам манастыры працягвалі падтрымліваць патаемныя сувязі з ордэнскім кіраўніцтвам за межамі імперыі.

Другая хваля рэпрэсій супраць рымска-каталіцкіх манастыроў распачалася пасля паўстання 1863–1864 гг. Як і падчас папярэдняга ўзброенага канфлікту, каталіцкае духавенства актыўна ўключылася ў антыўрадавую барацьбу, што і прымусіла расійскую ўладу да адпаведнага рэагавання

[104, с. 58–68]. 11 чэрвеня 1864 г. адміністрацыя Паўночна-Заходняга краю атрымала «высочайший» дазвол на ліквідацыю «найбольш шкодных» манастыроў. За перыяд з 1864 г. па 1900 г. на тэрыторыі Беларусі былі закрыты 42 мужчынскія і 34 жаночыя манастыры [26, с. 53]. Пад канец XIX ст. у беларускіх губернях заставаліся толькі 2 мужчынскія манастыры з 5 манахамі і 3 жаночыя з 35 манахінямі [104, с. 68].

У той жа час, прыведзеныя ў рабоце факты дазваляюць зрабіць выснову аб тым, што актыўны ўдзел рымска-каталіцкіх манахаў у антырасійскіх паўстаннях быў не адзінай прычынай, якая прывяла да скарачэння колькасці рымска-каталіцкіх манастыроў у Паўночна-Заходнім краі. Пры параўнанні дадзенай дзейнасці расійскіх улад з іх адпаведнымі мерапрыемствамі па скарачэнні колькасці праваслаўных манастыроў (што ажыццяўлялася на працягу XVIII ст.) выяўляецца, што паўстанні 1830–1831 і 1863–1864 гг. былі штуршкамі, якія звярнулі ўвагу расійскай адміністрацыі на існаванне «празмернай» колькасці каталіцкіх манастыроў і на неабходнасць ўстанаўлення адміністрацыйнага кантролю за чорным духавенствам. Дадзеныя мерапрыемствы, як і ў выпадку з праваслаўнымі манастырамі, былі прадыктаваны рацыяналісцкімі, секулярнымі поглядамі на інстытут манаства. Трэба адзначыць, што імперская палітыка ў дачыненні да рымска-каталіцкіх законнікаў у XIX ст. не была ўнікальнай. Так, напрыклад, падобную палітыку ў першай палове XIX ст. улады праводзілі ў Грузіі, дзе расійская адміністрацыя, занепакоеная «празмернай» колькасцю праваслаўнага святарства і манаства, рэалізоўвала мерапрыемствы па памяншэнні колькасці духавенства [205, с. 122–123, 135–137]. Не варта забываць і на адпаведны вопыт закрыцця рымска-каталіцкіх і уніяцкіх манастыроў у Аўстрыйскай імперыі ў перыяд праўлення Марыі Тэрэзіі (1740–1780 гг.) і Іосіфа II (1780–1790 гг.) («йозефінізм») [24, с. 204–205].

Прававая рэгламентацыя функцыянавання рымска-каталіцкіх манастыроў у Расійскай імперыі ажыццяўлялася нормамі Статута Рымска-каталіцкай Царквы. У артыкулах 23 і 79 Статута знайшлі сваё адлюстраванне палажэнні імператарскіх указаў ад 19 лістапада і 16 снежня 1842 г.: настаяцелі мужчынскіх і ігумені жаночых манастыроў знаходзіліся ў непасрэдным падначаленні епархіяльнага епіскапа [217, с. 9]. Настаяцелі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

манастыроў і іх памочнікі (вікарыі) прызначаліся епіскапам на трохгадовы тэрмін (артыкулы 81, 82). Епіскап меў права асабістага наведвання манастыроў і нагляду за іх дзейнасцю (артыкул 85). Непасрэднае ж загадванне ўсімі манастырамі епархіі даручалася візітатару манастыроў, які прызначаўся епіскапам са згоды Міністэрства ўнутраных спраў [217, ст. 28, 85–87].

Такім чынам, фарміраванне адміністрацыйнай структуры Рымска-каталіцкай Царквы ў Расійскай імперыі (як і адпаведныя працэсы ў дачыненні да Рускай Праваслаўнай Царквы) абумоўлівалася спецыфікай «сінадальнай» мадэлі дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін. Зыходзячы з таго, што Расійская дзяржава абвяшчала сябе праваслаўнай хрысціянскай манархіяй і брала на сябе абавязацельствы аховы не толькі Праваслаўя, але і іншых хрысціянскіх канфесій, якія дзейнічалі ў імперыі, Рымскаму каталіцызму гарантавалася захаванне кананічнага ўладкавання канфесіі: расійскія ўлады прызнавалі вяршынства Пантыфіка над Рымска-каталіцкай Царквой, паміж Пецярбургам і Святым Прастолам быў падпісаны канкардат 1847 г., які прадугледжваў функцыянаванне ў Расійскай імперыі разгалінаванай сеткі рымска-каталіцкіх епархій, дэканатаў, прыходаў і манастыроў. У той жа час, тэндэнцыя «адзяржаўлення» Праваслаўнай Царквы, характэрная для «сінадальнай» мадэлі, па меры пашырэння межаў імперыі і пераўтварэння яе ў поліканфесійную дзяржаву распаўсюджвалася і на іншыя канфесіі, у тым ліку і на Рымска-каталіцкую Царкву. У выніку чаго па аналогіі з Найсвяцейшым Сінодам Рускай Праваслаўнай Царквы расійскія ўлады ініцыявалі стварэнне Рымска-каталіцкай Духоўнай Калегіі – вышэйшага органа кіравання канфесіяй у Расійскай імперыі. Калегія была заклікана абмежаваць наднацыянальную юрысдыкцыю Папы Рымскага над імперскімі падданымі-католікамі. Дадзеныя мерапрыемствы расійскіх улад у поўнай меры адпавядалі агульнаеўрапейскім секулярызацыйным працэсам, скіраваным на абмежаванне ўплыву Ватыкана на ўнутраную палітыку суверэнных еўрапейскіх дзяржаў.

З другога ж боку, забеспячэнне ўнутранай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці імперыі змушала расійскія ўлады рэагаваць на антыўрадавую дзейнасць Рымска-каталіцкай Царквы падчас паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг. Гэта тэндэнцыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вяла да парушэння некаторых асноў кананічнага ўладкавання Каталіцкай Царквы ў Расійскай імперыі: ліквідацыі асобных епархій, прыходаў, манастыроў, адмены аўтаномнага статусу манаскіх ордэнаў. Аднак нават ва ўмовах даволі складаных стасункаў паміж Расійскай імперыяй і Святым Прастолам, што было выклікана падтрымкай рымска-каталіцкім клірам ідэй аднаўлення Рэчы Паспалітай, Пецярбург не пайшоў на канчатковы разрыў адносін з Ватыканам, што сведчыла аб прызнанні Расійскай імперыяй непарушнасці фундаментальных асноў кананічнага ўладкавання Рымска-каталіцкай Царквы.

## 3.3 Прававое становішча рымска-каталіцкага духавенства

Ва ўлонні Рымска-каталіцкай Царквы, таксама як і ў Праваслаўі, духавенства падзялялася на белае і чорнае. Аднак у вызначэнні катэгорый духоўных асоб паміж дзвюма галінамі Хрысціянства меліся адрозненні. У сувязі з тым, што паводле рымска-каталіцкай традыцыі зарок бясшлюбнасці прымалі не толькі манахі, але і прадстаўнікі белага духавенства, шлях да трэцяй (епіскапскай) ступені свяшчэнства быў адкрыты як для свяшчэннікаў-манахаў, так і для прыходскага святарства. Гэта акалічнасць ускладняла задачу афармлення катэгорый каталіцкага духавенства ў нормах права Расійскай імперыі. Так, згодна з «Законами о состояниях», у той час як вышэйшыя праваслаўныя іерархі адносіліся да манаскага духавенства, Магілёўскі архіепіскап-мітрапаліт, рымска-каталіцкія епархіяльныя і вікарныя епіскапы разам з прыходскім клірам належалі да белага духавенства [214, ст. 455]. Да каталіцкага манаства закон далучаў настаяцеляў і ігуменняў манастыроў, манаствуючую брацію і сясцёр [214, ст. 457].

*Белае духавенства.* Цэнтральным актам пастаўлення асобы ў свяшчэнную ступень у Рымска-каталіцкай Царкве, як і ў Праваслаўі, з'яўлялася хіратанія. Згодна з кананічным прынцыпам Апостальскага пераемства, праваслаўная і рымска-каталіцкая канфесіі ўзаемна прызнавалі законнасць рукапалажэнняў як адну з важнейшых праяў адзінства Хрысціянскай Царквы. У адпаведнасці з гэтым прынцыпам клірыкі Рымска-каталіцкай Царквы маглі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прымацца ў Праваслаўе з захаваннем іх сану, таксама і праваслаўныя свяшчэннаслужыцелі пры пераходзе ў Рымскі каталіцызм маглі разлічваць на прызнанне ступені свяшчэнства. Так, парадак пераходу рымска-каталіцкага духавенства ў Праваслаўе рэгуляваўся артыкулам 30 «Устава духовных консисторий». Каталіцкі ксёндз, які жадаў прыняць праваслаўную веру, мусіў звярнуцца з прашэннем на імя епархіяльнага архірэя. Епіскап альбо яго давераная асоба абавязваліся праверыць чысціню намераў жадаючага. З часу падачы прашэння святар трапляў пад абарону грамадзянскага начальства. Магчымасць захавання за ксяндзом духоўнага сану прадугледжвалася пунктам «*г*» артыкула: у такім выпадку архірэй звяртаўся ў Сінод з адпаведнай просьбай і прапановай аб прызначэнні духоўнай ступені і месца служэння [244, с. 13–15]. Магчымасць жа пераходу з Праваслаўя ў іншую канфесію, як ужо адзначалася, выключалася нормамі расійскага заканадаўства [246, ст. 36].

У парадку здзяйснення таінства Свяшчэнства паміж Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэрквамі існавалі пэўныя адрозненні. Зыходзячы з 1-га правіла Святых Апосталаў, у Праваслаўнай Царкве лічылася кананічна правільным, калі епіскапская хіратанія здзяйснялася на саборы архірэяў. У Рымска-каталіцкай жа Царкве, насуперак вышэйадзначанаму канону, Папа Рымскі меў адзінаасобнае права на рукапалажэнне епіскапаў [262, с. 99].

Выяўляліся адрозненні і ва ўмовах дыяканскай і прэсвітэрскай хіратаніі. У той час як Праваслаўная Царква лічыла недапушчальным пасвячэнне ў сан без прызначэння клірыка ў прыход, у Рымска-каталіцкай Царкве прызнавалася гэтак званае абсалютнае пасвячэнне, калі новаспечаны дыякан ці свяшчэннік не атрымліваў месца ў прыходзе [262, с. 99]. Аднак апошняя акалічнасць адмаўлялася нормамі імперскага заканадаўства. Згодна з «Законами о состояниях», доказам прыналежнасці асобы да рымска-каталіцкага белага духавенства прызнаваўся царкоўны акт аб пасвячэнні ў сан і прызначэнні клірыка ў прыход [214, ст. 464].

У адрозненне ад Праваслаўнай Царквы ў Рымскім каталіцызме адсутнічаў строга вызначаны падзел духавенства на свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў. У адпаведнасці з каталіцкай дактрынай кожная царкоўнаслужыцельская ступень мела апостальскае паходжанне і з’ўлялася вытворнай ад дыяканскага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

служэння. Так, сярод рымска-каталіцкіх царкоўнаслужыцеляў вылучаліся асцеары (ніжэйшы царкоўны чын; як правіла, з'яўляўся першым чынам, у які пастаўляліся семінарысты), чытальнікі (падчас богаслужэння чыталі Святое Пісанне і малітвы, спявалі царкоўныя гімны), экзарцысты (першапачаткова дапамагалі святарам падчас здзяйснення таінства Хрышчэння), акаліты (у іх абавязкі ўваходзіла запальванне і нашэнне свечак падчас богаслужэння, падрыхтоўка хлеба і віна да еўхарыстычнага асвячэння і г. д.).

Нягледзечы на тое, што, згодна з каталіцкім кананічным правам, вышэйпералічаныя царкоўнаслужыцельскія чыны адносіліся да разраду клірыкаў (праходжанне праз кожную з гэтых ступеняў было абавязковым для белага духавенства), заканадаўства Расійскай імперыі не прызнавала каталіцкіх царкоўнаслужыцеляў духоўнымі асобамі [262, с. 107–110]. У артыкуле 456 «Законов о состояниях» адзначалася: «Служительские должности при церквях и монастырях Римско-Католических исправляются лицами вольнонаёмными; сие лица не причисляются к духовенству» [214, с. 55]. (Неабходна адзначыць, што, згодна з рашэннем Другога Ватыканскага сабора (1962–1965 гг.), ступені экзарцыстаў і асціарыяў у Рымска-каталіцкай Царкве ўвогуле былі ліквідаваны, а чытальнікі і акаліты былі пераведзены ў разрад свецкіх асоб.) Да рымска-каталіцкага прыходскага духавенства «Законы о состояниях» адносілі настаяцеляў прыходаў, іх вікарыяў (намеснікаў настаяцеляў), дыяканаў і паддыяканаў [214, ст. 455].

Некаторыя адрозненні паміж рымска-каталіцкай і праваслаўнай традыцыямі існавалі і ў вызначэнні перашкод да прыняцця свяшчэнства. Так, згодна з рымска-каталіцкім кананічным правам, не дазвалялася пасвячаць у сан гарбатых, кульгавых, карлікаў, асоб, пазбаўленых левага вока (г. зв. кананічнага вока), указальнага пальца правай рукі. Такія перашкоды фізічнага характару праваслаўнымі не вылучаліся [262, с. 113]. У адрозненне ад праваслаўных нормаў, каталіцкае кананічнае права вызначала ў якасці перашкоды да рукапалажэння незаконнанароджанасць асобы [262, с. 115]. З часоў Папы Рыгора Вялікага (590–604 гг.) у Рымска-каталіцкай Царкве замацаваўся цэлібат. Дыяканам і свяшчэннікам забаранялася браць шлюб і знаходзіцца ў раней узятым шлюбе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Падрыхтоўку рымска-каталіцкіх святароў у Паўночна-Заходнім краі вялі 3 духоўныя семінарыі: Віленская, Мінская і Цяльшэўская. (Семінарыя ў Мінску была закрыта ў 1869 г. адначасова з Мінскай епархіяй.) Акрамя таго, будучыя лацінскія клірыкі мелі магчымасць атрымаць адукацыю ў Рымска-каталіцкай Духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу. Згодна з нормамі канкардату 1847 г. і Статута Рымска-каталіцкай Царквы, семінарыі падначальваліся непасрэдна епархіяльным епіскапам [217, ст. 104]. Апошнія па ўзгадненні з урадам прызначалі рэктараў, прафесарскі і выкладчыцкі састаў навучальных устаноў [217, ст. 105]. Епіскапы вызначалі і семінарскія вучэбныя праграмы [217, ст. 111].

У заканадаўстве Расійскай імперыі рымска-каталіцкім клірыкам, як прадстаўнікам прывілеяванага саслоўя, гарантаваліся такія ж прывілеі, як і праваслаўнаму святарству. Згодна з расійскім крымінальным заканадаўствам, замах на каталіцкага свяшчэннаслужыцеля падчас богаслужэння лічыўся кваліфікаваным злачынствам [219, ст. 236–237, 239]. Статут Рымска-каталіцкай Царквы, таксама як і «Устав духовных консисторий», вызначаў шэраг аналагічных выпадкаў, калі духоўныя асобы падлягалі царкоўнаму правасуддзю [217, ст. 60]. Рымска-каталіцкія, праваслаўныя і пратэстанцкія клірыкі ў аднолькавай ступені вызваляліся ад шэрагу дзяржаўных павіннасцей [214, ст. 394–397]. Каталіцкія духоўныя асобы мелі права на ўзнагароджанне ордэнамі Расійскай імперыі [217, ст. 99]. Рымска-каталіцкае духавенства атрымлівала жалаванне з дзяржаўнага казначэйства і сум спецыяльнага капіталу, які знаходзіўся ў загадванні Духоўнай калегіі [217, с. 91]. Прычым, як ужо адзначалася, штогадовы заробак лацінскага святара значна перавышаў жалаванне праваслаўнага свяшчэнніка [137, с. 19; 95, с. 197]. Апошняя акалічнасць тлумачыцца тым, што падчас секулярызацыі ў 1841–1842 гг. зямельных маёнткаў рымска-каталіцкіх і праваслаўных прыходаў было ўстаноўлена штатнае ўтрыманне духавенства заходніх губерняў. У сувязі з тым, што касцёлы валодалі значна большымі маёнткамі, якія адпаведна прыносілі больш прыбыткаў, чым валоданні, канфіскаваныя ў праваслаўных цэркваў, каталіцкія клірыкі атрымлівалі большае казённае жалаванне [251, с. 70]. Зразумела, што дадзены факт, а таксама значныя фінансавыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ахвяраванні каталіцкім прыходам з боку памешчыкаў-католікаў забяспечвалі значна лепшае матэрыяльнае становішча лацінскага духавенства ў параўнанні з праваслаўным, што ўплывала і на больш высокі аўтарытэт рымска-каталіцкага кліру ў мясцовым грамадстве.

Як і на праваслаўных свяшчэннаслужыцеляў, на рымска-каталіцкае прыходскае духавенства, акрамя кананічных, ускладаўся шэраг дзяржаўных абавязкаў. Артыкул 76 Статута Рымска-каталіцкай Царквы наступным чынам вызначаў гэтыя абавязкі: «При исполнении духовных треб по уставам церковным Священники наблюдают и все относящиеся к некоторым из сих треб постановления гражданские, например: о совершении браков сообразно с Законами Гражданскими, о совершении крещения над иноверцами сообразно с общими правилами Устава о Предупреждении Преступлений, <…> о погребении умерших, о ведении метрических книг (сверх книг исповедных и о причащающихся Св. Таин), и тому подобные правила, содержащиеся по принадлежности в других частях Свода Законов Империи» [217, с. 19]. У абавязкі кліру ўваходзіла і зачытванне прыхаджанам імперскіх заканадаўчых актаў, якія падлягалі абнародаванню [217, ст. 77].

Даволі істотныя змены ў прававым становішчы рымска-каталіцкага духавенства ў Паўночна-Заходнім краі былі выкліканы падзеямі паўстання 1863–1864 гг. Як адзначыла В. Яноўская, паўстанне абвастрыла варожасць і супярэчнасці, якія здаўна існавалі паміж Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэрквамі ў рэгіёне. У той час як падаўляючая большасць праваслаўнага кліру асудзіла паўстанцкі рух, асноўная маса рымска-каталіцкіх ксяндзоў і манахаў падтрымала антыўрадавае выступленне [104, с. 58]. Віленскі генерал-губернатар М.М. Мураўёў пісаў: «… католическая вера того края (Паўночна-Заходняга. – А.Г.) не вера, а политическая ересь; римско-католические епископы, ксендзы и монахи не составляют духовенство, а политических эмиссаров, проповедующих вражду к русскому правительству и ко всему, что только носит название русского и православного» [144, с. 503]. У расійскіх уладных і грамадскіх колах прама падкрэслівалася, што каталіцкае духавенства з'яўлялася галоўнай рухаючай сілай «польскага мяцяжу» [138, с. 236].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Роля рымска-каталіцкага духавенства ў паўстанні 1863–1864 гг. і сапраўды была значнай. У гэтай сувязі можна пагадзіцца з высновай В. Яноўскай аб тым, што дзейнасць каталіцкага кліру была асабліва актыўнай на стадыі падрыхтоўкі да ўзброенай барацьбы. Менавіта духоўным асобам належала натхніць вернікаў на барацьбу за адраджэнне Рэчы Паспалітай. Так, пасля разгону расійскімі ўладамі масавых дэманстрацый у Варшаве ў лютым 1862 г., падчас якіх загінула некалькі чалавек, амаль ва ўсіх касцёлах Беларусі прайшлі жалобныя паніхіды па забітых у Варшаве. У касцёлах рэгулярна спяваліся польскія патрыятычныя гімны «Божа, які Польшчу», «Яшчэ Польшча не загінула» [104, с. 58–59]. Не паменшылася актыўнасць каталіцкага духавенства і з пачаткам узброенага супрацьстаяння. За ўдзел у паўстанні ў Паўночна-Заходнім краі 8 ксяндзоў былі пакараныя смерцю, 36 сасланы на катаржныя работы, 6 – на пасяленне ў Сібір, 19 – у менш аддаленыя раёны Сібіры з пазбаўленнем асабістых правоў [104, с. 63]. Да ліпеня 1864 г. 177 каталіцкіх святароў былі сасланы ў розныя губерні Расіі [139, с. 37]. Нават у другой палове 1860-х гадоў неадзінкавымі былі выпадкі, калі прадстаўнікі ўлад знаходзілі ў касцёлах схаваную паўстанцкую зброю, улёткі і пракламацыі [56, арк. 1–16; 57, арк. 1–2; 63].

Аднак улады лічылі недастатковым абмежавацца толькі мерамі пакарання ўдзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. Перад расійскай адміністрацыяй у Паўночна-Заходнім краі паўстала задача распрацоўкі нарматыўнай прававой базы, скіраванай на прадухіленне далейшых магчымасцей удзелу рымска-каталіцкага духавенства ў антыўрадавай дзейнасці.

Так, пад кантроль мясцовых улад быў пастаўлены парадак прызначэння свяшчэннаслужыцеляў у прыходы. Згодна з цыркулярам М.М. Мураўёва ад 29 чэрвеня 1864 г., рымска-каталіцкія епіскапы абавязваліся ўзгадняць кандыдатуры клірыкаў з губернатарамі [259, арк. 59 адв.; 65, арк. 1; 118]. Гэты цыркуляр канкрэтызаваў агульнаімперскую норму (артыкул 37 Царкоўнага статута), згодна з якой епіскапы павінны былі прызначаць прыходскіх святароў са згоды ўрада [217, с. 11]. Затым выйшлі яшчэ два цыркуляры генерал-губернатара (19 і 23 студзеня 1865 г.), у якіх пацвярджалася распараджэнне ад 29 чэрвеня 1864 г. [259, арк. 61]. Трэба адзначыць, што ўлады строга сачылі за выкананнем гэтага цыркуляра. Так, у сакавіку 1899 г. Магілёўскі мітрапаліт

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сімон Казлоўскі атрымаў папярэджанне ад міністра ўнутраных спраў І.Л. Гарамыкіна за тое, што без згоды губернатара часова прызначыў некалькіх ксяндзоў у вакантныя прыходы Мінскай губерні [55, арк. 3–4 адв.].

Зыходзячы з таго, што асноўнай крыніцай папаўнення каталіцкага духавенства былі выпускнікі духоўных семінарый, 19 мая 1864 г. М.М. Мураўёў падпісаў цыркуляр, паводле якога прыём кожнага навучэнца ў рымска-каталіцкія семінарыі краю адбываўся са згоды мясцовага губернатара. Акрамя таго, пасвячэнне выпускніка семінарыі ў духоўны сан магло адбыцца толькі з дазволу таго ж губернатара [51, арк. 12]. Неабходна адзначыць, што гэты цыркуляр у поўнай меры адпавядаў артыкулу 463 «Законов о состояниях», паводле якога «поступление (асоб рымска-каталіцкага веравызнання. – А.Г.) в духовное звание и в учебные заведения, в коих к тому приготавляются» ажыццяўлялася па ўзгадненні епіскапа з мясцовым губернатарам [214, с. 56].

У студзені 1866 г. генерал-губернатар К.П. Каўфман прыняў рашэнне аб стварэнні ў Вільні спецыяльнай камісіі па справах рымска-каталіцкага духавенства, якая пазней атрымала назву «Рэвізійнай камісіі» і дзейнічала да ліпеня 1868 г. [281, s. 173–198; 60; 222, с. 61–66]. Узначаліў яе стацкі саветнік А.П. Старажэнка. Асноўнай мэтай дзейнасці камісіі было пазбаўленне ўплыву рымска-каталіцкага духавенства на насельніцтва краю, выпрацоўка мер эфектыўнага кантролю за выкананнем духавенствам распараджэнняў урада і нагляду за кожнай духоўнай асобай [281, s. 174–175].

Адным з накірункаў дзейнасці камісіі была распрацоўка рэформы мясцовых рымска-каталіцкіх семінарый. На думку членаў камісіі, менавіта семінарыі, самаізаляваныя ад дзяржаўнага ўплыву, прывівалі будучым святарам «фанатычную рэлігійнасць і варожасць да ўсяго рускага» [74, с. 346–347; 281, s. 183–187]. Намаганнямі членаў камісіі ў навучальны працэс у Віленскай і Цяльшэўскай семінарыях было ўведзена выкладанне рускай мовы, літаратуры і гісторыі, што прызнавалася важнейшай мерай барацьбы з паланізмам сярод семінарыстаў [106, с. 69–70].

Неабходнай мерай для абмежавання ўплыву рымска-каталіцкага кліру на насельніцтва краю мясцовыя ўлады лічылі ўстанаўленне кантролю за парадкам перамяшчэнняў духоўных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

асоб. У справаздачы Аляксандру ІІ генерал-губернатар М.М. Мураўёў пісаў аб неабходнасці «... прекратить произвольное бродяжничество римско-католического духовенства, которое, пользуясь беспомощностью местного начальства, разъезжало свободно по целому краю, безнаказанно проповедовало мятеж, восставало открыто против правительства…» [144, с. 499]. Відавочна, гэтыя словы генерал-губернатара тычыліся тых святароў, якія належалі да разнастайных місіянерскіх ордэнаў і ў перыяд паўстання актыўна агітавалі насельніцтва за падтрымку паўстанцкага руху.

Прававая рэгламентацыя перамяшчэнняў каталіцкага духавенства ў Расійскай імперыі ажыццяўлялася нормамі Статута Рымска-каталіцкай Царквы. Артыкул 90 Статута прадпісваў клірыкам атрымліваць «від» на паездку ў межах епархіі ад свайго непасрэднага начальства. Так, напрыклад, прыходскі святар мусіў атрымаць дазвол ад дэкана, дэкан атрымоўваў адпаведны дазвол ад епіскапа. Манаствуючым віды выдаваліся са згоды іерарха, да епархіі якога належаў манастыр. Для наведвання іншых губерняў рымска-каталіцкае духавенства павінна было атрымаць пашпарт ад губернатара праз пасрэдніцтва епіскапа. Дазвол на выезд епіскапа за межы епархіі выдаваўся міністрам унутраных спраў [217, с. 21–22; 218, ст. 97].

Аднак 15 кастрычніка 1867 г. быў выдадзены цыркуляр міністра ўнутраных спраў П.А. Валуева, на падставе якога 19 студзеня 1870 г. выйшаў цыркуляр Віленскага генерал-губернатара А.Л. Патапава. Згодна з гэтымі дакументамі ў прававую рэгламентацыю парадку перамяшчэнняў рымска-каталіцкага кліру ў краі ўносіўся шэраг дапаўненняў. Для «адлучкі» са сваёй парафіі ў межах павета святар, як і раней, абавязваўся атрымаць «від» на часовы ад’езд ад дэкана. Аднак пасля гэтага клірык павінен быў паведаміць аб сваім намеры мясцоваму спраўніку ці паліцмайстару, які «уведомлял» губернатара. Манахі ж атрымлівалі адпаведны дазвол епіскапа і «від» ад губернатара. Дзеля паездкі ў іншы павет ці губерню свяшчэннаслужыцель павінен быў атрымаць згоду епіскапа і губернатара [259, арк. 78 і адв.].

Такая сістэма дазволаў істотна ўскладняла магчымасці прыходскіх клірыкаў наведваць суседнія прыходы для дапамогі мясцовым свяшчэннікам у час хваробы апошніх ці правядзення

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

храмавага свята. Дадзеную праблему павінны былі вырашыць «Правила об отлучке римско-католического духовенства Могилёвской губернии из мест его постоянного пребывания по делам служебным и частным», зацверджаныя 30 верасня 1892 г. міністрам унутраных спраў І.М. Дурнаво. Гэты дакумент быў распаўсюджаны і на іншыя беларускія губерні. У пункце 1 Правілаў адзначалася, што свяшчэннікі для паездак у суседнія прыходы ў межах свайго дэканата, нават калі межы апошняга не супадалі з межамі павета, павінны былі звяртацца па дазвол да дэкана. Апошні, пасля выдачы білета на паездку, абавязваўся паведаміць дату выдачы і нумар выпісанага білета мясцоваму спраўніку ці спраўніку таго павета, у які дазвалялася паездка. Аднак такі парадак дазволу не распаўсюджваўся на паездкі на храмавыя святы. Дзеля наведвання касцёльнага свята ўсе духоўныя асобы абавязваліся атрымаць дазвол непасрэдна ад губернатара. Паліцэйскія чыноўнікі павінны былі сачыць, каб на храмавых святах не збіралася больш за дзве, ці ў выключным выпадку тры, «посторонних» асобы каталіцкага духавенства (пункт 2). Згодна з пунктам 5 Правілаў, святары маглі «адлучацца» ў суседнія прыходы, нават калі яны знаходзіліся ў іншым павеце, без усялякага дазволу, але толькі для здзяйснення адправаў у выключных выпадках: калі святар суседняга прыхода адсутнічае, хварэе ці мае «отдалённое местожительство и т. п., а между тем потребность представляется безотложной». Падчас «аб'ездаў» епархій рымска-каталіцкія епіскапы мелі права выклікаць у тыя ці іншыя пункты настаяцеляў прыходаў і вікарыяў адпаведнай мясцовасці. Аднак епіскапам забаранялася запрашаць да сябе адначасова больш за трох, ці ў выключным выпадку чатырох, святароў; аб кожным такім выкліку неабходна было паведамляць губернскаму начальству (пункт 7) [259, арк. 194].

Як паказваюць архіўныя крыніцы, Правілы ад 30 верасня 1892 г. не павялічылі магчымасці каталіцкага духавенства ў атрыманні дазволаў на перамяшчэнні. Так, Мінскі губернатар неаднаразова адмаўляў Магілёўскаму архіепіскапу ў хадайніцтвах аб паездках ксяндзоў на касцёльныя святы ў суседнія прыходы, спасылаючыся менавіта на Правілы ад 30 верасня 1892 г. [259, арк. 174, 185, 187, 188, 191, 192]. Больш за тое, дадзены парадак ствараў спрыяльную глебу



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

для хабарніцтва чыноўнікаў, што адказвалі за выдачу «відаў» на паездкі. У 1904 г. Магілёўскі мітрапаліт Г.Э. Шэмбек пісаў, што каталіцкія ксяндзы, ў большасці выпадкаў, не маглі атрымаць дазвол на перамяшчэнне, не заплаціўшы хабару мясцоваму спраўніку ці паліцмайстару [106, с. 59]. У выпадку ж, калі свяшчэннаслужыцелі свавольна пакідалі межы прыхода, улады прыцягвалі апошніх да адміністрацыйнай адказнасці, спаганялі з іх штрафы [9, с. 173–174].

Па прычыне таго, што ў перыяд паўстання антыўрадавая рыторыка рымска-каталіцкага духавенства прысутнічала ў пропаведзях, пад кантроль мясцовых улад трапілі і казанні клірыкаў. 12 снежня 1864 г. генерал-губернатар М.М. Мураўёў падпісаў цыркуляр, паводле якога каталіцкаму духавенству прадпісвалася прамаўляць надрукаваныя казанні толькі з двух зборнікаў: аўтарства Бялабжэскага і Філіпецкага [208, с. 294; 59, арк. 5]. У імперскім жа заканадаўстве прапісваўся іншы парадак. Артыкул 54 Статута Рымска-каталіцкай Царквы залічваў да абавязкаў «епархіяльнага начальства» прызначэнне цэнзараў для рукапісных казанняў [217, с. 14]. Згодна з артыкулам 40 «Устава о цензуре» (у рэдакцыі 1857 г.), епіскапы павінны былі прызначаць цэнзараў рукапісных казанняў з ліку членаў капітулаў, кансісторый ці дэканаў. Іх кандыдатуры павінны былі ўзгадняцца з губернатарам. Цэнзары абавязваліся дасылаць епіскапу экзэмпляр кожнага ўхваленага імі казання [59, арк. 86 адв.]. Так цыркуляр генерал-губернатара М.М. Мураўёва падмяняў сабой нормы агульнаімперскага заканадаўства.

10 верасня 1868 г. выйшаў цыркуляр генерал-губернатра А.Л. Патапава, у якім устанаўліваліся правілы прамаўлення казанняў рымска-каталіцкім духавенствам краю. Гэты дакумент спалучыў у сабе нормы імперскага заканадаўства і новаўвядзенні М.М. Мураўёва [59, арк. 52–53].

У мэтах ажыццяўлення кантролю за выкананнем духавенствам распараджэнняў грамадзянскіх улад падчас богаслужэнняў і прамаўлення казанняў у рымска-каталіцкіх храмах прысутнічалі паліцэйскія чыноўнікі [106, с. 59; 59, арк. 61 і адв.].

Пад кантроль расійскай адміністрацыі патрапіла і непасрэдная дзейнасць рымска-каталіцкага духавенства, звязаная з адпраўленнем рэлігійнага культу. У справаздачы Аляксандру II

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

генерал-губернатар М.М. Мураўёў сцвярджаў, што масавая дэманстрацыя каталіцкай рэлігійнасці ў дзяржаве, дзе пануючым веравызнаннем з'яўляецца Праваслаўе, павінна расцэньвацца як праява польска-лацінскай прапаганды, арганізаванай каталіцкім клірам у празеліцкіх мэтах спакушэння праваслаўнага насельніцтва ў Рымскі каталіцызм [144, с. 503]. Як сведчаць крыніцы, меркаванні генерал-губернатара былі небеспадстаўнымі. Да сярэдзіны 60-ых гадоў XIX ст. даволі частымі былі выпадкі, калі праваслаўныя вернікі наведвалі касцёлы, слухалі казанні ксяндзоў, ва ўрачыстыя дні разам з католікамі ўдзельнічалі ў касцёльных працэсіях [137, с. 39; 66, арк. 1]. Таму віленская адміністрацыя разглядала дзяржаўнае ўмяшальніцтва ў практыку адпраўлення каталіцкага культу як меру па спыненні наступу «лацінскай прапаганды» на праваслаўную паству.

24 студзеня 1864 г. М.М. Мураўёў выдаў цыркуляр, паводле якога правядзенне каталіцкіх хрэсных хадоў у гарадах дазвалялася толькі ўнутры касцёлаў. У вёсках жа ў выпадку, калі ўнутры храма хрэсны ход правесці было немагчыма, ён дазваляўся вакол касцёла, але толькі ў межах храмавай агароджы [259, арк. 20]. Затым гэты цыркуляр неаднаразова пацвярджаўся генерал-губернатарамі К.П. Каўфманам і Э.Т. Баранавым (распараджэнні ад 24 студзеня і 14 лютага 1866 г., 14 траўня 1868 г.) [259, арк. 29, 44]. Як паказваюць архіўныя крыніцы, мясцовыя ўлады няўхільна сачылі за выкананнем гэтых цыркуляраў аж да 1905 г. На ксяндзоў, якія парушалі гэтыя нормы, накладаліся адміністрацыйныя спагнанні [42; 43; 46; 55, арк. 12–15; 165; 166; 259, арк. 258].

У цыркуляры генерал-губернатара Э.Т. Баранава ад 21 верасня 1867 г. адзначалася, што ў сувязі з забаронай праводзіць хрэсныя хады па-за сценамі касцёла рымска-каталіцкае духавенства выкарыстоўвала пахаванні ў прапагандысцкіх мэтах. Генерал-губернатар быў заклапочаны тым, што пахаванні ў католікаў «... осуществляются с большею против принятого торжественностью при значительном количестве ксендзов, клириков, братчиков, с поношением хоругвь, значков, вовлекая массы народа» [259, арк. 35]. Згодна з цыркулярам, для арганізацыі «ўрачыстых пахавальных працэсій» патрабаваўся дазвол губернатара [259, арк. 35 і адв.]. Затым у 1887 г. указам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

імператара Аляксандра III былі забаронены рымска-каталіцкія пахавальныя спевы на польскай мове. Тады каталіцкія вернікі пачалі спяваць на пахаваннях лацінскія гімны. Аднак 14 кастрычніка 1894 г. выйшаў цыркуляр Віленскага генерал-губернатара П.В. Аржэхоўскага (1893–1897 гг.), паводле якога забаранялася спяваць песні на польскай і лацінскай мовах падчас суправаджэння памерлых на могілкі [26, с. 144; 281, s. 195].

Цыркулярам генерал-губернатара Э.Т. Баранава ад 11 жніўня 1867 г. у касцёлах Паўночна-Заходняга краю забаранялася здзяйсненне саракагадзіннага богаслужэння [259, арк. 61 адв.]. Згодна з заключэннем Рэвізійнай камісіі, саракагадзіннае богаслужэнне было шкодным для краю ў рэлігійным, палітычным, маральным і эканамічным планах [281, s. 196; 74, с. 311–313]. Падчас гэтага богаслужэння каталіцкае духавенства выстаўляла Святыя Дары для ўсеагульнага пакланення, ксяндзы прамаўлялі імправізаваныя павучанні, бесперапынныя маленні спалучаліся з прычашчэннямі і спавяданнямі прыхаджан. На думку расійскай адміністрацыі, такая рэлігійная практыка ў сілу сваёй энергетыкі і эмацыянальнасці выхоўвала ў каталіцкіх вернікаў фанатычныя настроі. Акрамя таго, улады асцерагаліся, што відовішчнае саракагадзіннае богаслужэнне было прыцягальным і для праваслаўных. Зрэшты, такія маленні адцягвалі насельніцтва на два дні ад працы і ўвогуле ад свецкага жыцця.

Пад асаблівы кантроль расійскіх улад было пастаўлена пытанне аб чытанні малітваў «За Імператара і Аўгусцейшы Дом» падчас каталіцкага богаслужэння. Гэта малітва была традыцыйным і неад'емным кампанентам богаслужэбнай практыкі Рускай Праваслаўнай Царквы. У рымска-каталіцкіх жа касцёлах ужывалася малітва «Pro Rege», якая чыталася на польскай ці лацінскай мове напрыканцы святой імшы [60, арк. 32; 281, s. 196]. У 1867 г. Рэвізійная камісія пастанавіла, каб малітва за імператара і яго сям’ю прамаўлялася на рускай мове, ніхто не меў права пакідаць касцёл падчас яе выканання, чытаць і слухаць гэту малітву неабходна было стоячы, усе духоўныя асобы абавязваліся стаяць каля алтара і не мелі права выконваць ніякіх адпраў [281, s. 196; 50, арк. 1–11]. 8 ліпеня 1874 г. гэтыя правілы былі занатаваны ў загадзе Дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў [259, арк. 70]. Такім чынам праз сакральную

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэлігійную практыку (малітву) расійскія ўлады імкнуліся ўмацаваць у каталіцкіх вернікаў пачуцці адданасці і лаяльнасці імперскай уладзе.

Следам за перакладам на рускую мову малітвы «За цара» ў расійскіх урадавых колах пачалі выказвацца прапановы аб пераводзе ўсяго дадатковага богаслужэння ў рымска-каталіцкіх касцёлах Паўночна-Заходняга краю з польскай на рускую мову. У выкарыстанні рускай мовы прыхільнікі гэтай рэформы бачылі сродак вызвалення Рымска-каталіцкай Царквы ад ідэй паланізму і ўзмацнення ўладнай прысутнасці ў рымска-каталіцкім богаслужэнні [74, с. 459, 603, 616, 632–639].

Напрыканцы 1869 г. Аляксандр II стварыў Спецыяльны камітэт па пытаннях выкарыстання рускай мовы ў справах рэлігій замежных веравызнанняў. І ўжо 25 снежня 1869 г. імператар зацвердзіў прапанову Камітэта аб дазволе выкарыстання рускай мовы ў дадатковых богаслужэннях «замежных» веравызнанняў [41, арк. 1–2]. У адпаведнасці з гэтым дакументам, выкарыстанне рускай мовы ў дадатковым богаслужэнні вызначалася як права іншаслаўных канфесій, але не з’яўлялася іх абавязкам. Такім чынам Аляксандр II адмяняў указ Мікалая I 1848 г., згодна з якім забаранялася ўжыванне рускай мовы ў богаслужэннях неправаслаўных канфесій. У той час улады баяліся, што выкарыстанне рускай мовы «замежнымі» Цэрквамі зробіць даступнымі іх веравучэнні для праваслаўных, і так апошнія будуць «совращены» ў іншыя веравызнанні [228, с. 571].

З 1870 г. асноўнай прасторай для рэалізацыі мерапрыемстваў па ўвядзенні рускай мовы ў дадатковае каталіцкае богаслужэнне была Мінская губерня, дзе разгарнулася дзейнасць ініцыятыўнага ксяндза Ф. Сенчыкоўскага, які стаў цэнтральнай фігурай мерапрыемстваў па дэпаланізацыі Рымска-каталіцкай Царквы. Наведваючы той ці іншы касцёл, ксёндз Фердынанд прапаноўваў мясцовым святарам падпісаць пісьмовае абавязацельства аб тым, што дадатковае богаслужэнне ў іх цэрквах будзе здзяйсняцца па-руску. Усяго на пачатку 1870-х гадоў Ф. Сенчыкоўскаму ўдалося атрымаць «падпіскі» ў 38 касцёлах. (Усяго ж на Міншчыне налічвалася 52 каталіцкія храмы) [263, с. 15].

Вясной 1876 г. ксёндз Ф. Сенчыкоўскі выступіў з ініцыятывай заснавання пасады візітатара касцёлаў. Візітатар павінен быў узяць на сябе функцыі ініцыятара ўвядзення

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рускамоўнага богаслужэння і памочніка ўпраўляючага Віленскай епархіі, які мае права здзяйсняць кананічныя рэвізіі касцёлаў. 9 ліпеня 1876 г. праект Сенчыкоўскага быў зацверджаны імператарам: для Мінскай губерні прадугледжваліся дзве пасады візітатараў. На гэтыя пасады прызначаліся Ф. Сенчыкоўскі і І. Юргевіч [74, с. 673, 263, с. 30]. Аднак дзейнасць візітатараў не была паспяховай. Ф. Сенчыкоўскім ажыццяўлялася спроба атрымаць кананічную санкцыю Святога Прастола на ўвядзенне рускамоўнага дадатковага богаслужэння. Аднак у адказ на гэту ініцыятыву 11 ліпеня 1877 г. Рым выдаў правілы, паводле якіх выкарыстанне рускай мовы катэгарычна забаранялася [16, с. 600]. Напрыканцы 1870-х гадоў кампанія «распалячвання» Рымска-каталіцкай Царквы канчаткова страціла падтрымку ў расійскай сталіцы. Рускамоўнае дадатковае богаслужэнне захавалася толькі ў 10 касцёлах Мінскай губерні [90, с. 277–278]. У 1879 г. абодва візітатары пазбавіліся сваіх пасад [74, с. 676–700].

Новая спроба «распалячвання» дадатковага богаслужэння ў касцёлах Міншчыны ажыццяўлялася ў 1882–1884 гг. па ініцыятыве губернатара А.І. Пятрова. Аднак і яна не прынесла станоўчых вынікаў [74, с. 963–965]. 3 красавіка 1897 г. імператар Мікалай ІІ сваім указам дазволіў прызначаць на вакантныя свяшчэнніцкія пасады ў тыя прыходы, дзе ў дадатковым богаслужэнні выкарыстоўвалася руская мова, ксяндзоў, якія будуць выкарыстоўваць лацінскую мову [259, арк. 216].

Неабходна адзначыць, што прынятыя у 1860–1870-я гады ў дачыненні да рымска-каталіцкага духавенства Паўночна-Заходняга краю гэтак званыя абмежавальныя цыркуляры захоўвалі сваю сілу да пачатку ХХ ст. Нягледзячы на тое, што тры беларускія губерні былі выведзены са складу Віленскага генерал-губернатарства яшчэ ў 1868–1872 гг., распараджэнні М.М. Мураўёва і яго пераемнікаў не згубілі сваёй юрыдычнай сілы на тэрыторыі Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў.

Напрыканцы ХІХ–пачатку ХХ ст., калі перад імперыяй паўставалі новыя выклікі ў выглядзе сацыялістычных, рабочых рухаў, у расійскіх афіцыйных колах усё часцей пачалі гучаць прапановы аб неабходнасці саступак рымска-каталіцкаму духавенству ў мэтах выкарыстання яго дысцыплінуючага ўплыву на вернікаў [9, с. 169–170].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прыхільнікам паслаблення адміністрацыйнага кантролю за рымска-каталіцкім духавенствам з’яўляўся Віленскі генерал-губернатар П.Д.Святаполк-Мірскі (1902–1904 гг.) [9, с. 176–186]. Генерал-губернатар лічыў празмернымі адміністрацыйныя пакаранні ксяндзоў (штрафы і змяшчэнні ў манастыры) за такія «дробныя» правапарушэнні, як, напрыклад, свавольныя адлучкі духавенства са сваіх прыходаў [221, с. 105]. Ён прапаноўваў цару адыйсці ад практыкі паўсюднага накладання забарон на будаўніцтва рымска-каталіцкіх касцёлаў і капліц [221, с. 106].

У гэты ж час Мікалай ІІ падпісаў Маніфест ад 26 лютага 1903 г. і ўказ «О предначертаниях к усовершенствованию государственного порядка» ад 12 снежня 1904 г., якія абвяшчалі намеры па ліквідацыі адміністрацыйнага свавольства ў дачыненні да «замежных» канфесій і ўмацаванні прававой базы імперскай верацярпімасці [193, с. 113–114 (№ 22581); 194, с. 1196–1198 (№ 25495)]. Спасылаючыся на гэтыя заканадаўчыя акты, рымска-каталіцкае духавенства ўсё часцей пачало заяўляць аб неабходнасці адмены цыркуляраў, якія абмяжоўвалі правы рымска-каталіцкага кліру ў краі і пярэчылі прававым нормам аб верацярпімасці. Так, у 1904 г. Магілёўскі мітрапаліт Г.Э. Шэмбек звярнуўся да П.Д. Святаполк-Мірскага, які ў той час ужо займаў пасаду міністра ўнутраных спраў, з комплексам прапаноў, якія, на яго думку, павінны былі садзейнічаць выкананню царскай волі аб ліквідацыі адміністрацыйнага свавольства ў дачыненні да Рымска-каталіцкай Царквы. Мітрапаліт лічыў неабходным дазволіць прамыя зносіны духавенства з Рымам, свабоднае перамяшчэнне кліру ў межах імперыі, замацаваць права епіскапаў прызначаць клірыкаў на духоўныя пасады без удзелу грамадзянскіх улад і г. д. [106, с. 97–98]. Сугучныя з вышэйапісанымі прапановы выказваліся і ва ўлонні Праваслаўя. Грамадскія і царкоўныя дзеячы ў адзін голас сцвярджалі аб неабходнасці вызвалення Праваслаўнай Царквы ад «дзяржаўных путаў» і выратавання аўтарытэту духавенства шляхам пазбаўлення апошняга ад «паліцэйскіх» абавязкаў [253, с. 39–53; 232, с. 27]. Так, у грамадстве адчуваўся подых надыходзячых кардынальных змен у імперскай веравызнаўчай палітыцы, што хутка ўвасобіліся ва Указе ад 17 красавіка і Маніфесце ад 17 кастрычніка 1905 г. [195, с. 257–258 (№ 26125), 754–755 (№ 26803)].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Чорнае духавенства.* Рымска-каталіцкае кананічнае права вызначала толькі самыя агульныя правілы прыняцця манаства. Прыватныя асаблівасці здзяйснення пастрыгу былі спецыфічнымі для кожнага манаскага ордэна. Так, абавязковым для ўсіх манаскіх фармацый з'яўлялася прахаджэнне жадаючым прыняць пострыг навіцыяту – перыяду паслушэнства, выпрабавання асоб (навіцыяў), якія мелі намер уступіць у манаскі ордэн. Навіцый мусіў быць католікам не маладзейшым за 17 гадоў, свабодным ад шлюбу і якіх бы там ні было зарокаў. Мінімальная працягласць навіцыяту складала адзін год. У гэты час паслушнік выконваў агульныя ордэнскія правілы, займаўся спецыяльнай духоўнай работай над сабой пад кіраўніцтвам настаўніка навіцыяў. Па сканчэнні тэрміну паслушэнства настаяцель манастыра прымаў рашэнне аб далейшым лёсе навіцыя: апошняга маглі дапусціць да прыняцця зарокаў, выдаліць з абшчыны, ці падоўжыць яму тэрмін навіцыяту [13].

Пасутнасці, вышэй апісаныя кананічныя нормы былі пераняты заканадаўствам Расійскай імперыі. У той час як мінімальны ўзрост, зафіксаваны ў «Законах о состояниях» для пастрыжэння ў манаства праваслаўных падданых, не адпавядаў канонам Праваслаўнай Царквы (быў істотна завышаны), імперскія законы не чынілі адпаведных перашкод католікам. Паводле «Законов о состояниях», жадаючыя ўступіць у каталіцкае манаства павінны былі мець узрост не менш за 19 гадоў і 3 гады заставацца на «іспыце ці спакусе». Па сканчэнні гэтага тэрміну асоба магла прыняць урачысты зарок і ўводзілася ў іпадыяканскі (паддыяканскі) сан [214, ст. 469]. Таксама як і ў выпадку праваслаўных, для паступлення католіка ў манастыр патрабавалася згода грамадзянскіх улад. Прэтэндэнты на манаства абавязваліся атрымаць ад губернскага начальства пасведчанне аб тым, што яны не знаходзяцца пад судом ці крымінальным следствам [214, ст. 467]. Губернскія ўлады перадавалі гэтыя звесткі ў Духоўную калегію. Калегія ж накіроўвала іх, разам са сваім заключэннем, на канчатковае вырашэнне ў Міністэрства ўнутраных спраў [214, ст. 468].

Устаноўленае ў «Законах о состояниях» абмежаванне грамадзянскіх правоў каталіцкага манаства, таксама як і праваслаўнага, цалкам вынікала з сутнасці манаскіх зарокаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Манаствуючым забаранялася валодаць нерухомай маёмасцю [214, ст. 471]. Напярэдадні прамаўлення зарокаў асоба абавязвалася «распарадзіцца» сваёй уласнасцю і адмовіцца ад маёмасці, якая магла перайсці ёй па спадчыне [214, ст. 472]. Неабходна адзначыць, што заканадаўства Расійскай імперыі не прадугледжвала мер адказнасці за складанне манаства падданымі-католікамі.

Некаторыя змены ў прававым становішчы рымска-каталіцкага манаства, як і белага духавенства, на беларускіх землях адбыліся пасля паўстання 1863–1864 гг. Актыўная падтрымка манаскім духавенствам паўстанцкага руху змусіла ўлады ўзмацніць адміністрацыйны кантроль за каталіцкімі манастырамі. 28 чэрвеня 1864 г. М.М. Мураўёў падпісаў цыркуляр, згодна з якім пастрыжэнне асоб рымска-каталіцкага веравызнання ў манаства дазвалялася толькі пасля непасрэднага дазволу генерал-губернатара [139, с. 22]. Так цыркуляр галоўнага начальніка краю падмяняў сабой артыкул 468 «Законов о состояниях», паводле якога канчатковы дазвол выдаваўся Міністэрствам унутраных спраў.

Цыркуляр Віленскага генерал-губернатара ад 14 ліпеня 1864 г. вызначаў лёс манахаў тых кляштараў, якія былі зачынены згодна з распараджэннямі расійскіх улад. «Здольныя да адукацыі і добранадзейныя» манахі пераводзіліся на навучанне ў духоўныя семінарыі з перспектывай залічэння ў «белае» духавенства, астатнія ж, «нездатныя да навучання і палітычна нядобранадзейныя», распараджэннем галоўнага начальніка краю накіроўваліся «в те общества и сословия, из которых они поступили в монастырь» [139, с. 22–23]. Такім чынам, законнікі пазбаўляліся манаскага сану рашэннем грамадзянскіх улад.

Узмацненне кантролю за паступленнем падданых у рымска-каталіцкае манаства паступова было зафіксавана і ў нормах імперскага заканадаўства. У другім выданні Статута Рымска-каталіцкай Царквы (1896 г.) з'явіліся артыкулы, якія адсутнічалі ў папярэдняй рэдакцыі гэтага дакумента. Артыкул 89 прадпісваў манастырскаму кіраўніцтву весці «шнуравыя кнігі» «за печатию Консистории и за скрепою одного из членов оной и Секретаря», у якіх павінны былі фіксавацца ўсе асобы, што прымаліся ў манастыр, «адлучкі» манахаў за межы манастыра, паступленні



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

законнікаў з іншых прыстанкаў [218, с. 26]. Настаяцелі манастыроў абавязваліся паведамляць мясцовай паліцыі аб паступленні новых паслушнікаў (артыкул 90). Назіранне за выкананнем устаноўленага законам парадку паступлення падданых у манастыры даручалася епархіяльнаму епіскапу і візітатару манастыроў [218, ст. 91–92]

З прыведзеных у раздзеле фактаў вынікае, што ў перыяд да паўстання 1863–1864 гг. прававое становішча рымска-каталіцкага духавенства (белага і манаскага), пасутнасці, не адрознівалася ад адпаведнага статусу духоўных асоб праваслаўнага («пануючага» ў імперыі) веравызнання. Заканадаўства гарантавала прадстаўнікам рымска-каталіцкага духавенства аналагічныя, што і праваслаўным клірыкам, прывілеі і ўскладала на іх аднолькавыя абавязкі. Прававое становішча каталіцкага духавенства (як і праваслаўных духоўных асоб) вызначалася нормамі свецкага заканадаўства і кананічнага права. Прычым шэраг каталіцкіх кананічных правілаў субсідыярна ахоўваўся імперскім правам (устанаўленне парадку паступлення ў белае і чорнае духавенства, абмежаванне грамадзянскіх правоў манаства і г. д.).

Аднак актыўная падтрымка рымска-каталіцкім духавенствам паўстанцкага руху прымусіла ўлады прыняць комплекс мер, скіраваных на далейшае прадухіленне ўдзелу духоўных асоб у антыўрадавых выступленнях, што істотна паўплывала на прававое становішча каталіцкага духавенства на беларускіх землях у 1863–1905 гг. Апошнія абставіны прывялі да таго, што некаторыя агульнаімперскія заканадаўчыя нормы былі заменены цыркулярамі генерал-губернатараў Паўночна-Заходняга краю (распараджэнні аб парадку прызначэнняў святароў у прыходы (ад 29 чэрвеня 1864 г.), перамяшчэнняў духавенства (ад 19 студзеня 1870 г.), прамаўлення казанняў (ад 10 верасня 1868 г.), рэгламентацыі богаслужэбных практык (ад 24 студзеня 1864 г., 11 жніўня 1867 г., 21 верасня 1867 г.), прыняцця паслушнікаў у манастыры (ад 28 чэрвеня 1864 г.) і інш.). Гэтыя падзаконныя акты мясцовых улад вызначалі спецыфіку прававога становішча рымска-каталіцкага духавенства Паўночна-Заходняга краю ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі імперыі, дзе працягвалі дзейнічаць нормы імперскага заканадаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 3.4 Прававое рэгуляванне маёмаснага становішча Рымска-каталіцкай Царквы

У адрозненне ад Праваслаўнай Царквы, згодна з асновамі якой права ўласнасці на царкоўную маёмасць прызнавалася за кожнай канкрэтнай рэлігійнай арганізацыяй (архірэйскім домам, манастыром, царквой і г. д.), ва ўлонні Рымска-каталіцкай Царквы ў Сярэднія вякі з’явілася тэорыя агульнацаркоўнай уласнасці, якая, пасутнасці, зводзілася да прызнання Папы Рымскага адзіным суб’ектам права ўласнасці на царкоўную маёмасць. Аднак з часоў Рэфармацыі свецкія ўлады, нават у каталіцкіх краінах, адмаўляліся прызнаваць наднацыянальную юрысдыкцыю Пантыфіка над царкоўнай маёмасцю, што размяшчалася ў межах адпаведных суверэнных дзяржаў [262, с. 265].

Зразумела, што і ў Расійскай дзяржаве не магло ісці гаворкі пра прызнанне Папы Рымскага ўласнікам маёмасці рымска-каталіцкіх духоўных устаноў, якія знаходзіліся ў імперыі. Згодна са Статутам Рымска-каталіцкай Царквы, суб’ектамі маёмасных правоў каталіцкай канфесіі з’яўляліся манастыры, касцёлы, духоўныя навучальныя і дабрачынныя ўстановы [218, ст. 111]. Так, Рымска-каталіцкая Царква ў цэлым, таксама як і Руская Праваслаўная Царква, не выступала ў Расійскай імперыі ўласнікам маёмасці духоўных устаноў, што ўваходзілі ў яе склад.

Паводле артыкула 112 Царкоўнага статута, функцыі загадвання маёмасцю рымска-каталіцкіх храмаў і манастыроў ускладаліся на настаяцеляў. Аднак у гэтым жа артыкуле падкрэслівалася, што выкананне адпаведных паўнамоцтваў настаяцелямі каталіцкіх цэркваў і манастыроў ажыццяўлялася пад непасрэдным наглядам епархіяльных епіскапаў і расійскага ўрада [218, с. 30].

У вызначэнні аб’ектаў маёмасных правоў рэлігійных арганізацый рымска-каталіцкай канфесіі імперскае заканадаўства зыходзіла з той жа класіфікацыі, што прымянялася ў дачыненні да Праваслаўнай Царквы (свяшчэнныя рэчы, неабходныя для здзяйснення богаслужэнняў; рэчы, асвечаныя пасродкам іх выкарыстання падчас богаслужэння; царкоўная маёмасць прызначаная для аплачвання выдаткаў на патрэбы богаслужэнняў, утрыманне кліру і рэалізацыю іншых агульнацаркоўных задач)



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

[219, ст. 264]. Дадзеныя заканадаўчыя нормы ў поўнай меры адпавядалі кананічным правілам, якія аднолькава прызнаваліся абедзвюма галінамі Хрысціянства [262, с. 266].

Рымска-каталіцкія епархіяльныя ўпраўленні, манастыры і касцёлы (разам з праваслаўнымі духоўнымі ўстановамі) у Паўночна-Заходнім краі былі пазбаўлены зямельнай уласнасці ў выніку секулярызацыйных мерапрыемстваў 1841–1842 гг. [185, с. 139–140 (№ 15153)]. Як адзначыла А. Філатава, да правядзення секулярызацыі рымска-каталіцкім духоўным установам у краі належалі вялізныя (несупараўнальныя з адпаведнымі валоданнямі праваслаўных рэлігійных арганізацый) плошчы населеных зямельных маёнткаў (больш за 630 тыс. дзесяцін), у складзе якіх налічвалася больш за 130 тыс. рэвізскіх душ прыгонных сялян. Агульны гадавы прыбытак з гэтых маёнткаў складаў не менш за 550 тыс. рублёў срэбрам [251, с. 70]. Згодна ж з імператарскім указам 1842 г., у валоданні каталіцкіх манастыроў заставаліся толькі ненаселеныя маёнткі памерам да 150 дзесяцін, касцёлам прадстаўляліся надзелы ў 33 дзесяціны [251, с. 70]. Аднак, як і ў выпадку Праваслаўнай Царквы, расійскі ўрад гарантаваў каталіцкім духоўным установам штогадовае казённае грашовае ўтрыманне. Згодна з указам Мікалая I ад 1 студзеня 1842 г., штатныя каталіцкія манастыры і епархіяльныя ўпраўленні атрымлівалі такое ж дзяржаўнае ўтрыманне, як і праваслаўныя прыстанкі і архірэйскія дамы [186, с. 1 (№ 15189); 187, с. 3].

«Штатныя» выплаты былі гарантаваны і рымска-каталіцкім прыходам. Прычым памер дзяржаўных асігнаванняў на карысць апошніх значна перавышаў адпаведныя выплаты праваслаўным цэрквам, што, як ужо было адзначана, увязвалася са значна большымі памерамі канфіскаваных у касцёлаў зямельных угоддзяў [251, с. 70]. Аднак, калі пагадзіцца з дадзеным тлумачэннем, паўстае пытанне, чаму ў такім выпадку дзяржава ўраўнавала штогадовыя выплаты рымска-каталіцкім і праваслаўным епархіяльным упраўленням і манастырам. На нашу думку, апошнюю акалічнасць неабходна ўвязваць з наяўнасцю ў Расійскай імперыі створанага яшчэ ў 1822 г. па ініцыятыве мітрапаліта С. Богуш-Сестранцэвіча дапаможнага капіталу рымска-каталіцкага духавенства [182, с. 662 (№ 29227)].

Справа ў тым, што, прыняўшы ў сваё ведамства населеныя маёнткі каталіцкіх епархіяльных упраўленняў і манастыроў,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзяржава адлічвала вызначаны працэнт прыбытку з гэтай маёмасці не напрамую на ўтрыманне адпаведных духоўных устаноў, а пералічвала іх на рахунак Духоўнай калегіі для залічэння ў дапаможны капітал [268, с. 43]. Згодна са Статутам Рымска-каталіцкай Царквы, дапаможны капітал знаходзіўся ў распараджэнні Духоўнай калегіі і з'яўляўся недатыкальным [218, ст. 130–131]. Гэта значыць, што Калегія мела права выдзяляць грашовыя сродкі, скіраваныя на дапамогу той ці іншай каталіцкай рэлігійнай арганізацыі, толькі з працэнтаў, якія паступалі ад знаходжання капіталу ў крэдытных установах. Больш за тое, дапаможныя выплаты маглі выдзяляцца Калегіяй толькі са згоды міністра ўнутраных спраў (сумы дапамогі духавенству да 900 руб. і да 10 тыс. руб. на пабудову альбо рамонт храмаў) ці імператара (у выпадку выдзялення больш значных сум) [218, ст. 130]. Як адзначыла В. Яноўская, па стане на 1 студзеня 1842 г. дадатковы капітал рымска-каталіцкага духавенства складаў 1 595 309 рублёў, а ўжо ў 1882 г. яго сума дасягнула 3 842 437 руб. [268, с. 43]. Такім чынам, епархіяльныя ўпраўленні і рымска-каталіцкія манастыры атрымлівалі ад дзяржавы аднолькавае з адпаведнымі праваслаўнымі ўстановамі ўтрыманне, аднак першыя маглі карыстацца яшчэ і выплатамі з працэнтаў ад дадатковага капіталу.

Тым не менш, перавод каталіцкіх рэлігійных арганізацый на «штатнае» ўтрыманне быў негатыўна ўспрыняты ў Ватыкане. Па ацэнках аднаго з экспертаў Рымскай курыі, у 1846 г. казённае ўтрыманне рымска-каталіцкіх рэлігійных арганізацый у Расійскай імперыі было на 200 тыс. рублёў меншым, чым ранейшыя прыбыткі ад секулярызаваных маёнткаў [74, с. 88]. Аднак назваць дадзеныя ўрадавыя мерапрыемствы рэпрэсіямі ў дачыненні да Рымска-каталіцкай Царквы ў імперыі Ватыкану не дазваляў той факт, што адпаведныя захады былі рэалізаваны дзяржавай і ў адносінах да праваслаўнай канфесіі. Больш за тое, секулярызацыйныя мерапрыемствы ў Паўночна-Заходнім краі ажыццяўляліся адначасова з такімі ж дзеяннямі ў заходнееўрапейскіх краінах: у 1834 г. былі ліквідаваны каталіцкія манастыры ў Партугаліі, у 1835 г. лацінскія прыстанкі Іспаніі былі цалкам пазбаўлены зямельнай маёмасці, у 1847 г. урад закрыў амаль усе рымска-каталіцкія манастыры Швейцарыі [237, с. 167].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У расійскім заканадаўстве адсутнічала норма, якая б абвяшчала касцёльныя землі ўласнасцю касцёлаў (аналагічна таму, як артыкул 446 «Законов о состояних» абвяшчаў царкоўныя землі недатыкальнай уласнасцю праваслаўных храмаў). Зыходзячы з гэтага і спасылаючыся на артыкул 515 «Законов гражданских», можна адзначыць, што ненаселеныя зямельныя надзелы, якія па вызначанай законам норме (150 дзесяцін для манастыроў і 33 дзесяціны для касцёлаў) заставаліся пасля секулярызацыі ў валоданні рымска-каталіцкіх рэлігійных арганізацый, з'яўляліся ўласнасцю дзяржавы [215, ст. 515].

У той жа час, імперскае заканадаўства дазваляла каталіцкім духоўным установам набываць ва ўласнасць нерухомую маёмасць. Для рымска-каталіцкіх рэлігійных арганізацый закон устанаўліваў такія ж, як і для праваслаўных духоўных устаноў, спосабы атрымання нерухомасці: купля, дарэнне і духоўнае завяшчанне [218, с. 113–114]. Згодна з Царкоўным статутам, каталіцкія манастыры маглі пакупаць нерухомую маёмасць толькі з непасрэднага дазволу імператара. Купля нерухомасці касцёламі на суму да 5 тыс. рублёў санкцыянавалася міністрам унутраных спраў, больш дарагія пакупкі патрабавалі дазволу імператара [218, ст. 113]. Лясныя надзелы, што знаходзіліся ва ўладанні каталіцкіх касцёлаў і манастыроў, таксама як і адпаведныя дзялянкі праваслаўных духоўных арганізацый, вызваляліся з-пад юрысдыкцыі Ўпраўлення казённых лясоў і знаходзіліся ў непасрэдным распараджэнні рымска-каталіцкіх рэлігійных арганізацый [220, ст. 113].

Царкоўны статут устанаўліваў парадак атрымання рэлігійнымі арганізацыямі маёмасці ў дар ці згодна з завяшчаннем: ненаселеныя зямельныя маёнткі дазвалялася прымаць са згоды імператара, грашовыя капіталы і рухомыя рэчы – з санкцыі міністра ўнутраных спраў. Аднак у выпадку ахвяравання на карысць духоўных устаноў сум, якія перавышалі 10 тыс. рублёў, міністр унутраных спраў павінен быў узгадняць сваё рашэнне з імператарам [218, ст. 113–114].

Згодна з артыкулам 117 Царкоўнага статута, забаранялася адчужэнне маёмасці рэлігійных арганізацый без «Высочайшего соизволения». Аднак гэта ж норма прадугледжвала магчымасць продажу «непатрэбнай» касцёлам маёмасці і «их обветшавших строений» [218, с. 31].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Неабходна адзначыць, што рэакцыяй расійскай адміністрацыі ў Паўночна-Заходнім краі на ўдзел рымска-каталіцкага духавенства ў паўстанні 1863–1864 гг. было выклікана парушэнне нормы Царкоўнага статута аб недапушчэнні адчужэння касцёльнай маёмасці без санкцыі імператара. Матывуючы сваё рашэнне тым, што рымска-каталіцкія касцёлы ў краі мелі празмерныя зямельныя багацці, якія давалі клірыкам магчымасці для матэрыяльнай падтрымкі паўстанцкага руху, генерал-губернатар М.М. Мураўёў выдаў цыркуляры ад 21 кастрычніка 1864 г. і 14 ліпеня 1865 г., згодна з якімі ў рэгіёне была праведзена люстрацыя маёнткаў, што знаходзіліся ў валоданні праваслаўных і рымска-каталіцкіх прыходаў. Вынікі люстрацыі паказалі, што ў адрозненне ад праваслаўных храмаў каталіцкія касцёлы падчас секулярызацыйных мерапрыемстваў 1841–1842 гг. былі надзелены добрай зямлёй, колькасць якой амаль паўсюдна пераўзыходзіла ўстаноўленую норму ў 33 дзесяціны. Апошняя акалічнасць увязвалася генерал-губернатарам з прыхільнасцю да касцёлаў мясцовых чыноўнікаў-католікаў. У выніку ж выяўленыя ў каталіцкіх прыходах зямельныя перавышэнні былі канфіскаваны [268, с. 42].

Паводле нормаў Царкоўнага статута, каталіцкім духоўным установам дазвалялася здача іх зямельных надзелаў у наём ці арэнду. Таксама як і ў адносінах да праваслаўных рэлігійных арганізацый, заканадаўства ўстанаўлівала максімальны 12-гадовы тэрмін перадачы зямельнай маёмасці рымска-каталіцкіх рэлігійных арганізацый у наём і патрабавала адпаведнай згоды епархіяльнага епіскапа [218, ст. 118].

Як і праваслаўныя прыстанкі, рымска-каталіцкія манастыры мелі права наследавання. Згодна з артыкулам 465 «Законов о состояниях», кляштары атрымлівалі ўсю маёмасць, што заставалася пасля смерці манаствуючых мужчынскага полу [214, с. 57]. А вось грашовыя капіталы манашак пасля іх смерці павінны былі перадавацца законным наследнікам, і толькі ў выпадку іх адмовы ад наследства капітал адыходзіў манастыру [214, ст. 466].

Царкоўны статут замацоўваў права наследавання і за рымска-каталіцкімі касцёламі. У сувязі з тым, што ксяндзы прымалі зарок бясшлюбнасці і адпаведна не стваралі ўласных сем’яў, чацвёртая частка рухомай маёмасці памерлых клірыкаў перадавалася ў выпадку, калі яны не зрабілі завяшчання, касцёлу [218, ст. 115].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Нормы Царкоўнага статута абавязвалі рэлігійныя арганізацыі змяшчаць свае грашовыя капіталы «для приращения» ў дзяржаўных банках. Аднак у адрозненне ад адпаведных патрабаванняў да праваслаўных духоўных устаноў, заканадаўства дазваляла каталіцкім арганізацыям з санкцыі міністра ўнутраных спраў размяшчаць свае грашовыя сродкі «с большой выгодою» і ў прыватных крэдытных установах [218, ст. 119]. У той жа час, артыкул 120 Статута ўстанаўліваў фінансавую падсправаздачнасць каталіцкіх рэлігійных арганізацый Духоўнай калегіі [218, ст. 120].

Як і праваслаўным рэлігійным арганізацыям, рымска-каталіцкім духоўным установам у Расійскай імперыі гарантаваліся падатковыя льготы: яны вызваляліся ад падатку на нерухомую маёмасць (акрамя аб'ектаў, здадзеных у наём) і пазямельнага збору [110, с. 39].

Такім чынам, рымска-каталіцкая канфесія, рэлігійныя арганізацыі якой з'яўляліся буйнымі землеўладальнікамі на беларускіх землях, абвострана ўспрыняла секулярызацыю зямельнай уласнасці 1841–1842 гг. Аднак дадзеныя падзеі не былі звязаны з рэпрэсіямі супраць Рымска-каталіцкай Царквы ў Паўночна-Заходнім краі, яны ажыццяўляліся ў адным рэчышчы з адпаведнымі працэсамі ў дачыненні да Рускай Праваслаўнай Царквы, з'яўляліся праявай характэрнай для «сінадальнай» формы дзяржаўна-царкоўных адносін тэндэнцыі «адзяржаўлення» канфесій і агульнаеўрапейскіх секулярызацыйных працэсаў. Нягледзячы на гэта, матэрыяльнае становішча рымска-каталіцкай канфесіі на беларускіх землях заставалася даволі ўстойлівым. Рымска-каталіцкія духоўныя ўстановы атрымлівалі ў валоданне ад дзяржавы ненаселеныя зямельныя надзелы, забяспечваліся штогадовым казённым утрыманнем. У імперскім заканадаўстве каталіцкім рэлігійным арганізацыям гарантавалася права на набыццё нерухомай ўласнасці (са згоды дзяржаўных улад), дазвалялася перадача іх зямельных надзелаў у наём і арэнду, прадугледжвалася наяўнасць значнага па сваіх памерах дадатковага капіталу рымска-каталіцкага духавенства. Нават падзеі паўстання 1863–1864 гг. не прынеслі істотных негатыўных тэндэнцый у парадак прававога рэгулявання маёмасці рымска-каталіцкай канфесіі на беларускіх землях.

Падводзячы вынікі главы, неабходна адзначыць, што прававое становішча рымска-каталіцкай канфесіі, таксама як і

Праваслаўнай Царквы, на беларускіх землях у 1863–1905 гг. абумоўлівалася спецыфікай «сінадальнай» формы дзяржаўна-царкоўных адносін у Расійскай імперыі і асаблівасцямі канфесійнай сітуацыі ў Паўночна-Заходнім краі.

Па-першае, зыходзячы з таго, што Расійская дзяржава абвяшчалася праваслаўнай хрысціянскай манархіяй і брала на сябе абавязацельствы аховы не толькі Праваслаўя, але і іншых хрысціянскіх канфесій, Рымскаму каталіцызму гарантавалася прывілеяванае (у параўнанні з нехрысціянскімі канфесіямі) становішча ў імперыі. Зыходзячы з гэтага, прававое становішча рымска-каталіцкай канфесіі ў Расійскай імперыі рэгламентавалася нормамі дзяржаўнага заканадаўства і кананічнага права. Прычым шэраг каталіцкіх кананічных правілаў субсідыярна ахоўваўся імперскім правам (напрыклад, устанаўленне парадку паступлення ў белае і чорнае каталіцкае духавенства, абмежаванне грамадзянскіх правоў манаства, рэгуляванне шлюбна-сямейных адносін падданых-католікаў, прымяненне ў дачыненні да падданых каталіцкага веравызнання царкоўных пакаранняў за здзяйсненне некаторых злачынстваў). Згодна з імперскім заканадаўствам, прававое становішча рымска-каталіцкага духавенства, пасутнасці, не адрознівалася ад адпаведнага статусу духоўных асоб праваслаўнага веравызнання. Заканадаўства гарантавала прадстаўнікам рымска-каталіцкага духавенства аналагічныя, што і праваслаўным духоўным асобам, прывілеі і ўскладала на іх аднолькавыя абавязкі. Імперскія законы гарантавалі рэалізацыю маёмасных правоў канфесіі. У Статуце Рымска-каталіцкай Царквы, распрацаваным на падставе канкардату 1847 г. паміж Пецярбургам і Рымам, дзяржава пацвярджала сваю прыхільнасць захаванню кананічнага ўладкавання рымска-каталіцкай канфесіі ў імперыі: прызнавала вяршынства Папы Рымскага над Рымска-каталіцкай Царквой, стварыла сетку рымска-каталіцкіх епархій і іншых царкоўных адміністрацыйных адзінак.

Па-другое, характэрная для «сінадальнай» мадэлі тэндэнцыя «адзяржаўлення» Праваслаўнай Царквы па меры пашырэння межаў імперыі і пераўтварэння яе ў поліканфесійную дзяржаву распаўсюджвалася і на іншыя канфесіі, у тым ліку і на Рымска-каталіцкую Царкву. У выніку чаго дзяржава імкнулася падначаліць сабе канфесію, інтэграваць царкоўныя структуры ў адміністрацыйны апарат імперыі, выкарыстаць іх патэнцыял

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сацыяльнага дысцыплінавання і забеспячэння лаяльнасці вернікаў манархіі. Апошнімі акалічнасцямі абумоўліваліся абмежаванне зносін каталіцкіх духоўных устаноў з Ватыканам і стварэнне Рымска-каталіцкай Духоўнай калегіі (своеасаблівага аналага праваслаўнага Найсвяцейшага Сінода), устанаўленне падкантрольнасці епархіяльных структур дзяржаўнай адміністрацыі, замацаванне падсуднасці духавенства свецкім судам, ажыццяўленне секулярызацыі зямельных валоданняў каталіцкіх рэлігійных арганізацый.

Па-трэцяе, спецыфіка прававога становішча каталіцкай канфесіі на беларускіх землях прадвызначалася антыўрадавымі пазіцыямі Рымска-каталіцкай Царквы. Устанаўленне прававых рамак дзейнасці канфесіі, наданне ёй статусу «цярпімага» ў імперыі веравызнання ўспрымалася Каталіцкай Царквой як рэпрэсіўныя меры, несправядлівае прыніжэнне афіцыйнага статусу канфесіі, якая зусім нядаўна (да моманту трох падзелаў Рэчы Паспалітай) была «пануючай» Царквой, а яе веравучэнне адыгрывала ролю важнейшай каштоўнаснай крыніцы дзяржаўнага светапогляду. Імкненне Рымска-каталіцкай Царквы аднавіць свой ранейшы афіцыйны статус пераварала яе ў асноўны ідэалагічны цэнтр паўстанцкага руху за аднаўленне дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай. Зразумела, што гэта непасрэдным чынам уплывала на прававое становішча Рымска-каталіцкай Царквы ў Расійскай дзяржаве. Удзел рымска-каталіцкага духавенства ў паўстанні 1863–1864 гг. выклікаў рэпрэсіўную рэакцыю ўлад: духоўныя асобы, якія прымалі непасрэдны ўдзел у паўстанні ці аказвалі падтрымку паўстанцкаму руху, прыцягваліся да крымінальнай альбо адміністрацыйнай адказнасці, ажыццяўлялася закрыццё значнай колькасці каталіцкіх манастыроў і касцёлаў, у 1866 г. была прыпынена дзейнасць канкардату 1847 г., у 1869 г. адбылася ліквідацыя Мінскай епархіі, некаторыя агульнаімперскія заканадаўчыя нормы, што рэгламентавалі прававое становішча каталіцкага кліру, былі заменены цыркулярамі генерал-губернатараў Паўночна-Заходняга краю. Гэтыя падзаконныя акты мясцовых улад устанаўлівалі дадатковыя меры кантролю за духавенствам і абмяжоўвалі публічнае адпраўленне шэрагу каталіцкіх культавых практык.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. У ходзе даследавання былі выяўлены асаблівасці працэсу заканадаўчага афармлення прававога статусу Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў у Расійскай імперыі. Замацаванне прававога становішча праваслаўнай канфесіі ў імперскім заканадаўстве распачалося ў перыяд пятроўскіх пераўтварэнняў, калі манархам быў выдадзены ў 1721 г. Духоўны Рэгламент – заканадаўчы акт, які канстытуяваў асновы функцыянавання кіруючых органаў Рускай Праваслаўнай Царквы на працягу ўсяго сінадальнага перыяду (1721–1917 гг.). Прыняцце дадзенага закона прывяло да дэфармацыі дактрыны «сімфоніі» свецкай і царкоўнай улад, на падставе якой функцыянавала сістэма дзяржаўна-царкоўных адносін у Маскоўскай дзяржаве.

Фарміраванне ў Расійскай імперыі абсалютысцкай формы праўлення дыктавала неабходнасць укаранення характэрнай для заходнееўрапейскіх абсалютных манархій пратэстанцкай дактрыны «дзяржаўнай царкоўнасці», якая прадугледжвала інтэграцыю адміністрацыйнага апарату Царквы ў бюракратычную структуру імперыі і выкарыстанне патэнцыялу канфесіі ў мэтах сацыяльнага дысцыплінавання, забеспячэння законапаслухмянасці і лаяльнасці вернікаў дзяржаве. У той жа час «дзяржаўная царкоўнасць» у Расійскай імперыі канчаткова не адмаўляла прынцыпы дактрыны «сімфоніі» (супрацоўніцтва, узаемапавагі і згоды паміж Царствам і Свяшчэнствам). У адпаведнасці з гэтымі прынцыпамі праваслаўная рэлігія выступала важнейшай крыніцай духоўных каштоўнасцей, светапогляднай асновай дзяржаўнай ідэалогіі, Праваслаўе непасрэдным чынам уплывала на афармленне нормаў імперскага права, з'яўлялася індыкатарам асноў маральнасці права. Зыходзячы з гэтага, у даследаванні была зроблена выснова, што ў Расійскай імперыі сфарміравалася «сінадальная» мадэль адносін Царквы і дзяржавы, у аснове якой ляжаў своеасаблівы сімбіёз дактрын «сімфоніі» і «дзяржаўнай царкоўнасці».

Згодна з «сінадальнай» мадэллю, Праваслаўе абвяшчалася ў расійскім заканадаўстве «пануючым» (дзяржаўным) веравызнаннем. Аднак пашырэнне правасуб'ектнасці «пануючай» Царквы ў дзяржаве не памяншала права іншых канфесій на рэлігійную і іншую звязаную з ёй дзейнасць. У «Асноўных дзяржаўных законах Расійскай імперыі» гарантавалася права

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

свабоднага адпраўлення рэлігійных культаў неправаслаўных веравызнанняў у выпадку, калі «замежныя» канфесіі не пасягалі на асновы імперскага ладу і не распаўсюджвалі сваю місію на праваслаўнае насельніцтва.

Больш за тое, па меры пашырэння межаў імперыі і пераўтварэння Расіі ў поліканфесійную дзяржаву двор Раманавых імкнуўся пазіцыянаваць сябе як праваслаўная хрысціянская манархія, якая стаіць на варце агульнахрысціянскіх каштоўнасцей. У Зводзе законаў Расійскай імперыі прадугледжвалася дзяржаўная ахова ўсіх хрысціянскіх веравызнанняў, вызначаўся прывілеяваны статус хрысціянскага духавенства, гарантаваліся маёмасныя правы хрысціянскіх канфесій і іх дзяржаўнае забеспячэнне. У 1847 г. Расійская імперыя пайшла на самае цеснае супрацоўніцтва з Ватыканам, у выніку чаго паміж бакамі быў заключаны канкардат, які вызначаў асновы прававога статусу Рымска-каталіцкай Царквы ў Расійскай дзяржаве: фіксаваў епархіяльную структуру Царквы, устанаўліваў парадак прызначэння і звальнення духоўных асоб, працэдуру фарміравання і кампетэнцыю епархіяльных кансісторый, капітулаў, правы і абавязкі епіскапату, прыходскага і манаскага духавенства. Нормы канкардату 1847 г. былі закладзены ў аснову Статута Рымска-каталіцкай Царквы ў Расіі (1857 г.). Выданне Статута сведчыла аб завяршэнні працэсу афармлення прававога статусу рымска-каталіцкай канфесіі ў Расійскай імперыі.

Аднак прававая рэгламентацыя становішча рымска-каталіцкай канфесіі, наданне апошняй статусу «цярпімага» «замежнага» веравызнання ўспрымаліся Каталіцкай Царквой на беларускіх землях як рэпрэсіўныя меры, несправядлівае прыніжэнне афіцыйнага статусу канфесіі, якая да моманту ліквідацыі дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай была пануючай рэлігіяй у рэгіёне, адыгрывала ролю асноўнай каштоўнаснай крыніцы дзяржаўнага светапогляду, з’яўлялася важнейшым механізмам культурнай і нацыянальнай (польскасць) гамагенізацыі мясцовага грамадства. Імкненне Рымска-каталіцкай Царквы аднавіць свой ранейшы афіцыйны статус ператварала яе ў асноўны ідэалагічны цэнтр паўстанцкага руху за аднаўленне дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай. Гэта акалічнасць непасрэдным чынам уплывала на прававое становішча Рымска-каталіцкай Царквы ў Расійскай дзяржаве: антыўрадавая дзейнасць канфесіі выклікала рэпрэсіўную рэакцыю ўлад.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У 1866 г., ва ўмовах абвастрэння ўзаемаадносін Расійскай імперыі і Рыма, што было звязана з падтрымкай паўстанцкага руху 1863–1864 гг. з боку Ватыкана, расійскі ўрад абвясціў аб аднабаковым разрыве канкардату са Святым Прастолам. Прыпыненне дзейнасці канкардату зрабіла магчымым абмежаванне шэрагу правоў Рымска-каталіцкай Царквы ў Паўночна-Заходнім краі, што было выклікана неабходнасцю далейшага прадухілення ўдзелу канфесіі ў антыўрадавых выступленнях.

2. Прававое становішча праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій на беларускіх землях у 1863–1905 гг. фарміравалася пад уздзеяннем шэрагу тэндэнцый. Па-першае, тэндэнцыя «адзяржаўлення» Рускай Праваслаўнай Царквы, якая вынікала з сутнасці дактрыны «дзяржаўнай царкоўнасці», прадугледжвала ўстанаўленне падкантрольнасці канфесіі дзяржаве і інтэграцыю царкоўных структур у адміністрацыйны апарат імперыі, суправаджалася парушэннямі некаторых асноў кананічнага ўладкавання канфесіі (ліквідацыя патрыяршаства, стварэнне Найсвяцейшага Сінода і інш.). У адпаведнасці з гэтым пашыралася кола дзяржаўных абавязкаў кліру, замацоўвалася падсуднасць духавенства свецкім судам, ажыццяўлялася секулярызацыя населеных зямельных валоданняў рэлігійных устаноў. Па меры пашырэння межаў імперыі і ператварэння яе ў поліканфесійную дзяржаву гэта тэндэнцыя распаўсюджвалася і на іншыя канфесіі, у тым ліку і на Рымска-каталіцкую Царкву.

Па-другое, тэндэнцыя супрацоўніцтва і ўзаемапавагі паміж дзяржавай і Царквой, якая вынікала з сутнасці дактрыны «сімфоніі» і абумоўлівалася пазіцыянаваннем Расійскай імперыі як праваслаўнай хрысціянскай дзяржавы, прадвызначала прывілеяванае становішча хрысціянскіх канфесій у імперыі. Прававы статус праваслаўнай і рымска-каталіцкай канфесій вызначаўся не толькі расійскім заканадаўствам, але і нормамі кананічнага права. У дзяржаве адбывалася рэцэпцыя кананічнага права: рэлігійныя нормы знаходзілі сваё замацаванне ў імперскім заканадаўстве. У Расійскай імперыі захоўвалася даволі шырокая (у параўнанні з іншымі еўрапейскімі краінамі) прастора грамадскіх адносін (шлюбная сфера, прымяненне царкоўных пакаранняў у сферы крымінальнага права, рашэнне некаторых маёмасных спрэчак з удзелам духоўных устаноў), урэгуляваных рэлігійнымі нормамі, калі права толькі пацвярджала легітымнасць рэлігійна-маральных нормаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Па-трэцяе, тэндэнцыя аднаўлення пазіцый Рускай Праваслаўнай Царквы на беларускіх землях абумоўлівала спецыфіку прававога становішча праваслаўнай канфесіі ў рэгіёне. Доўгачасовае (ад 1385 г.) існаванне праваслаўнай канфесіі Беларусі ва ўмовах палітыка-прававой дыскрымінацыі, балансаванне на мяжы канчатковага паглынання Праваслаўя Рымска-каталіцкай Царквой прывялі да катастрафічнага стану Праваслаўнай Царквы на яе кананічнай тэрыторыі. Гэтыя абставіны вымагалі пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ажыццяўлення комплексу ўрадавых мерапрыемстваў (стварэнне праваслаўных епархій, вяртанне ўніятаў ва ўлонне Царквы, храмабудаўніцтва, паляпшэнне матэрыяльнага становішча кліру і інш.), скіраваных на адраджэнне Праваслаўнай Царквы.

Па-чацвёртае, тэндэнцыя прадухілення ўдзелу Рымска-каталіцкай Царквы ў антыўрадавых выступленнях, скіраваных на аднаўленне дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай і, адпаведна, пануючага становішча Каталіцызму ў рэгіёне. Актыўная падтрымка Рымска-каталіцкай Царквой паўстанцкіх рухаў 1830–1831 і 1863–1864 гг. сведчыла аб калізіі інтарэсаў Каталіцкай Царквы, якая была незадаволена сваім афіцыйным статусам у Расійскай імперыі, і дзяржавы, якая вымагала ад канфесіі лаяльнасці імперскаму правапарадку ўзамен на гарантыі верацярпімасці.

3. На падставе аналізу нормаў імперскага заканадаўства і кананічнага права ў манаграфіі дадзена аўтарская характарыстыка адміністрацыйнай структуры Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг. Асновы адміністрацыйнай структуры Рускай Праваслаўнай Царквы ў Расійскай імперыі закладаліся Духоўным Рэгламентам, паводле якога Царква пазбавілася свайго вышэйшага кананічнага органа – Памеснага Сабора – і патрыяршага праўлення. Кіраўніком Царквы ў расійскім заканадаўстве быў абвешчаны свецкі манарх. У якасці вышэйшага органа кіравання канфесіяй быў створаны Найсвяцейшы Сінод, які падначальваўся непасрэдна імператару. Секулярнымі прававымі нормамі быў зменены кананічны парадак абрання епіскапату, устаноўлена падкантрольнасць епархіяльных структур свецкай адміністрацыі.

Асаблівасці працэсу фарміравання адміністрацыйнай структуры праваслаўнай канфесіі на беларускіх землях пасля іх далучэння да Расійскай імперыі вынікалі з тэндэнцыі адраджэння Праваслаўнай Царквы ў рэгіёне: ажыццяўлялася стварэнне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

праваслаўных епархій (Мінскай (1793 г.), Полацкай (1833 г.), Літоўскай (1839 г.), Гродзенскай (1900 г.)), адбылося далучэнне ўніятаў да Праваслаўя (1839 г.), паступова (асабліва актыўна ў перыяд пасля паўстання 1863–1864 гг.) пашыралася сетка праваслаўных прыходаў і манастыроў. У выніку гэтых мерапрыемстваў Руская Праваслаўная Царква здолела аднавіць пазіцыі на сваёй кананічнай тэрыторыі і вярнуць сабе статус найбуйнейшай канфесіі на беларускіх землях.

Тэндэнцыя «адзяржаўлення» Царквы ў Расійскай імперыі ўплывала і на спецыфіку фарміравання *адміністрацыйнай структуры Рымска-каталіцкай Царквы*. Па аналогіі з Найсвяцейшым Сінодам Рускай Праваслаўнай Царквы расійскія ўлады ініцыявалі стварэнне Рымска-каталіцкай Духоўнай Калегіі – вышэйшага органа кіравання канфесіяй у Расійскай імперыі. Калегія была заклікана абмежаваць наднацыянальную юрысдыкцыю Папы Рымскага над імперскімі падданымі-католікамі. Дадзеныя мерапрыемствы расійскіх улад у поўнай меры адпавядалі агульнаеўрапейскім секулярызацыйным працэсам, скіраваным на абмежаванне ўплыву Ватыкана на ўнутраную палітыку суверэнных еўрапейскіх дзяржаў. У той жа час, Рымскаму каталіцызму гарантавалася захаванне фундаментальных асноў кананічнага ўладкавання канфесіі: расійскія ўлады прызнавалі вяршынства Пантыфіка над Каталіцкай Царквой, паводле канкардату 1847 г. у Расійскай імперыі прадугледжвалася функцыянаванне разгалінаванай сеткі рымска-каталіцкіх епархій, дэканатаў, прыходаў і манастыроў.

Аднак падтрымка Рымска-каталіцкай Царквой паўстання 1863–1864 гг. прадвызначыла меры дзяржаўнага рэагавання, скіраваныя на забеспячэнне ўнутранай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці імперыі, што прывяло да парушэння некаторых асноў кананічнага ўладкавання Рымска-каталіцкай Царквы на беларускіх землях. У выніку прыпынення дзейнасці канкардату (з 1866 г.) стала магчымай ліквідацыя Мінскай епархіі (1869 г.), а таксама значнай колькасці прыходаў і манастыроў, адмена аўтаномнага статусу манаскіх ордэнаў. Аднак нават ва ўмовах даволі складаных стасункаў паміж Расійскай імперыяй і Святым Прастолам Пецярбург не пайшоў на канчатковы разрыў адносін з Ватыканам, што сведчыла аб прызнанні Расійскай імперыяй непарушнасці фундаментальных асноў кананічнага ўладкавання Рымска-каталіцкай Царквы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4. На падставе шырокага кола архіўных і апублікаваных крыніц быў праведзены параўнальны аналіз прававога становішча праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства на беларускіх землях у 1863–1905 гг. Па выніках даследавання было ўстаноўлена, што згодна з заканадаўствам Расійскай імперыі, прававы статус праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства ў Беларусі да падзей паўстання 1863–1864 гг. не меў істотных адрозненняў. Згодна з прынцыпам «сімфоніі» («Свяшчэнства – партнёр Царства») хрысціянскаму духавенству гарантавалася прывілеяванае становішча ў структуры імперскага грамадства. Духоўныя асобы вызваляліся ад воінскай павіннасці, цялесных пакаранняў, асноўных натуральных павіннасцей (пажарнай, вартаўнічай, пастойнай і інш.), ім гарантавалася права набываць і адчужаць нерухомую маёмасць. Згодна з расійскім крымінальным заканадаўствам, замах на хрысціянскага свяшчэннаслужыцеля падчас здзяйснення богаслужэння лічыўся кваліфікаваным злачынствам. Духоўныя асобы мелі права на ўзнагароджанне ордэнамі Расійскай імперыі. Праваслаўнае, рымска-каталіцкае і пратэстанцкае духавенства надзялялася аднолькавымі дзяржаўнымі абавязкамі: вядзенне запісаў актаў грамадзянскага стану (метрыкацыя нараджэнняў, улік шлюбаў, смярцей прыхаджан ), інфармаванне насельніцтва (абнародаванне заканадаўчых актаў), кантроль за лаяльнасцю паствы грамадзянскім уладам. Акрамя палажэнняў дзяржаўнага заканадаўства, прававы статус духавенства вызначаўся нормамі кананічнага права. Прычым шэраг кананічных правілаў субсідыярна ахоўваўся імперскім правам (напрыклад, абмежаванне грамадзянскіх правоў манаства, вызначэнне відаў дзейнасці, несумяшчальных са свяшчэнствам).

Аднак падтрымка рымска-каталіцкім духавенствам паўстанцкага руху 1863–1864 гг. прымусіла ўлады прыняць комплекс мер, скіраваных на далейшае прадухіленне ўдзелу духоўных асоб у антыўрадавых выступленнях, устанаўленне дадатковых мер кантролю за духавенствам і абмежаванне публічных адпраўленняў некаторых каталіцкіх культавых практык. Апошнія абставіны прывялі да таго, што шэраг агульнаімперскіх заканадаўчых нормаў быў заменены цыркулярамі генерал-губернатараў Паўночна-Заходняга краю (распараджэнні аб парадку прызначэнняў святароў у прыходы (ад 29 чэрвеня 1864 г.), перамяшчэнняў духавенства (ад 19 студзеня 1870 г.), прамаўлення казанняў (ад 10 верасня 1868 г.),

рэгламентацыі богаслужэбных практык (ад 24 студзеня 1864 г., 11 жніўня 1867 г., 21 верасня 1867 г.), прыняцця паслушнікаў у манастыры (ад 28 чэрвеня 1864 г.) і інш.). Гэтыя падзаконныя акты мясцовых улад вызначылі спецыфіку прававога становішча рымска-каталіцкага духавенства Паўночна-Заходняга краю ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі імперыі, дзе працягвалі дзейнічаць нормы імперскага заканадаўства.

Адначасова з гэтым імперскія ўлады ініцыявалі шэраг мерапрыемстваў, скіраваных на ўмацаванне становішча праваслаўнага духавенства на беларускіх землях. Прыняцце і рэалізацыя ў 1860–1880-х гадах комплексу заканадаўчых актаў прывялі да паляпшэння матэрыяльнага становішча і павышэння сацыяльнага прэстыжу духоўных асоб: павялічвалася жалаванне клірыкаў, яны забяспечваліся дадатковымі зямельнымі ўгоддзямі і дровамі з казённых лясоў,ажыццяўляліся пабудова і рамонт прычтавых памяшканняў, з паўсядзённага жыцця і знешняга выгляду духавенства пачалі выкараняцца элементы каталіцкай традыцыі (нашэнне сутан, галенне барод, карыстанне польскай мовай).

Істотны ўплыў на прававое становішча праваслаўнага духавенства аказала Царкоўная рэформа Аляксандра II, якая прывяла да ліквідацыі замкнёнасці духоўнага саслоўя і паспрыяла вяртанню Царквы да кананічнага парадку прызначэння духоўных асоб у прыходы: была забаронена практыка наследавання прыходаў (1867 г.), дзецям праваслаўнага духавенства было дазволена пакідаць духоўнае саслоўе (1869 г.), у 1871 г. дзеці клірыкаў атрымалі правы ганаровых грамадзян.

5. У манаграфіі прааналізавана спецыфіка прававога рэгулявання маёмаснага становішча Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў на беларускіх землях у 1863–1905 гг. Імперскае заканадаўства прызнавала ў якасці суб’ектаў маёмасных правоў канфесій епархіяльныя ўпраўленні, цэрквы, манастыры, духоўна-навучальныя і дабрачынныя царкоўныя ўстановы. Кожная канкрэтная ўстанова (рэлігійная арганізацыя) Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў з’яўлялася самастойнай юрыдычнай асобай, канфесіі ў цэлым не выступалі ўласнікамі маёмасці рэлігійных арганізацый, што ўваходзілі ў іх склад.

Тэндэнцыя «адзяржаўлення» канфесій у Расійскай імперыі абумовіла секулярызацыю населеных зямельных маёнткаў праваслаўных і рымска-каталіцкіх духоўных устаноў: дзяржава імкнулася за кошт ліквідацыі фінансавай самастойнасці

рэлігійных арганізацый забяспечыць падначаленне апошніх дзяржаўным структурам. На беларускіх землях дадзеныя мерапрыемствы праводзіліся ў 1841–1842 гг.

Аднак пазбаўленне рэлігійных арганізацый значнай колькасці зямельнай маёмасці актуалізавала перад дзяржавай задачу забеспячэння годнага матэрыяльнага становішча хрысціянскіх канфесій (партнёраў улад) у Расійскай імперыі. Згодна з заканадаўствам, рэлігійныя ўстановы Рускай Праваслаўнай і Рымска-каталіцкай Цэркваў атрымлівалі ў валоданне ад дзяржавы ненаселеныя зямельныя надзелы, забяспечваліся штогадовым казённым утрыманнем. Са згоды ўлад ім гарантавалася права на набыццё нерухомай уласнасці, дазвалялася перадача зямельных надзелаў у наём.

Так, матэрыяльнае становішча Рымска-каталіцкай Царквы на беларускіх землях у 1863–1905 гг. заставалася ўстойлівым. Зыходзячы з таго, што да секулярызацыі населеных зямельных маёнткаў рымска-каталіцкія духоўныя ўстановы з'яўляліся буйнымі землеўладальнікамі ў рэгіёне, ім гарантаваўся значна большы ў параўнанні з праваслаўнымі рэлігійнымі арганізацыямі памер казённага ўтрымання. Акрамя таго, заканадаўствам прадугледжвалася наяўнасць дадатковага капіталу рымска-каталіцкага духавенства. Нават падзеі паўстання 1863–1864 гг. не прынеслі істотных негатыўных тэндэнцый у парадак прававога рэгулявання маёмасці Рымска-каталіцкай Царквы на беларускіх землях.

Матэрыяльнае становішча Рускай Праваслаўнай Царквы ў Беларусі ў даследуемы перыяд (па прычыне доўгатэрміновай палітыка-прававой дыскрымінацыі Праваслаўя ў Рэчы Паспалітай і беднасці праваслаўнай паствы) знаходзілася ў нездавальняючым стане. Дзеля выпраўлення сітуацыі дзяржава прымала шэраг заканадаўчых актаў, скіраваных на забеспячэнне праваслаўных рэлігійных арганізацый дадатковымі фінансавымі сродкамі, зямельнымі надзеламі, ляснымі і іншымі ўгоддзямі.

Змешчаны ў манаграфіі матэрыял можа быць выкарыстаны ў працэсе далейшай навуковай распрацоўкі рэлігійнага права, праблем свабоды сумлення ў Беларусі, гісторыі канфесій. Вывучэнне дзяржаўна-канфесійных узаемаадносін і зробленыя на гэтай падставе высновы могуць аказаць дапамогу дзяржаўным органам у дзейнасці па аптымізацыі дзяржаўна-царкоўных і міжканфесійных стасункаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Алексеева, С.И. Святейший Синод в системе высших и центральных государственных учреждений пореформенной России, 1856–1904гг. / С.И. Алексеева. – СПб. : Наука, С.-Петерб. изд. фирма, 2006. – 275 с.

2. Архирейская, Т.Ю. Правовые основы деятельности религиозных объединений в России : история и современность : автореф. дис. … канд. юрид. наук : 12.00.02 / Т.Ю. Архирейская ; Мос. гос. юрид. акад. – М., 2001 – 32 с.

3. Бабкин, М.А. Духовенство Русской православной церкви и свержение монархии (начало XX в.–конец 1917 г.) / М.А. Бабкин. – М. : ГПИБ, 2007. – 530 с.

4. Батюшков, П.Н. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края / П.Н. Батюшков. – СПб. : Синод. тип., 1890. – 184 с.

5. Белоголов, И. Акты и документы, относящиеся к устройству и управлению римско-католической церкви в России : в 2 т. / И. Белоголов. – Петроград, 1915. – Т. 1. – 482 с.

6. Бендин, А.Ю. Вероисповедная система Российской империи (конец XIX–нач. XX в.) / А.Ю. Бендин // VII Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвящённые Дням славянской письменности и культуры : материалы чтений, Минск, 22–24 мая 2001 г.: в 2 ч. / Европ.гум. ун-т, фак. теол., Белор. гос. ун-т к-ры ; редкол. : А.Ю. Бендин [и др.]. – Минск : Ковчег, 2002. – Ч.1, кн. 1. – С. 153–171.

7. Бендин, А.Ю. Генезис проблем веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1904 гг.) / А.Ю. Бендин // XIII Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвящённые дням славянской письменности и культуры : материалы чтений «Церковь перед вызовом глобальных цивилизаций», Минск, 24–26 мая 2007 г. / Ин-т теол. им. Св. Мефодия и Кирилла, Бел. гос. ун-т кул-ры и иск. ; отв. ред. и сост. А.Ю. Бендин. – Минск : Ковчег, 2008. – С. 187–207.

8. Бендин, А.Ю. О содержании понятия веротерпимости накануне указа 17 апреля 1905 г. / А.Ю. Бендин // XI Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвящённые дням славянской письменности и культуры : материалы чтений «Социальная миссия Церкви в современном мире», Минск,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

24–26 мая 2005 г. / Ин-т теол. им. Св. Мефодия и Кирилла, Бел. гос. ун-т кул-ры и иск. ; отв. ред. и сост. А.Ю. Бендин. – Минск : Ковчег, 2006. – С. 79–108.

9. Бендин, А.Ю. Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.) / А.Ю. Бендин. – Минск : БГУ, 2010. – 439 с.

10. Бердников, И.С. Краткий курс церковного права Православной Греко-российской Церкви с указанием главнейших особенностей католического и протестантского церковного права / И.С. Бердников. – Казань : Тип. Имп. ун-та, 1888. – 294 с.

11. Бердников, И.С. Новое государство в его отношении к религии (к вопросу о свободе совести) : речь, произнесённая на торжественном годичном собрании Казанской духовной академии. 1888 г. / И.С. Бердников – Казань : Типо-лит. Имп. ун-та, 1904 г. – 68 с.

12. Богословский, К. Государственное положение римско-католической церкви в России от Екатерины Великой до настоящего времени / К. Богословский. – Харьков : Тип. губ. правл., 1898. – 374 с.

13. Борисов, А. Католическое монашество сегодня / А. Борисов // [Электронный ресурс] Богослов.ru. Научный богословский партал. – Режим доступа : http://www.bogoslov.ru/text/304258.html. – Дата доступа : 21.01.2011.

14. Брольо, Ф.М. Религия и юридические системы. Введение в сравнительное церковное право / Ф.М. Брольо, Ч. Мирабелли, Ф. Онида. – М.: Библ.-богосл. ин-т св. апостола Андрея, 2008. – 437 с.

15. Васькоў, У. Каталікі на абшарах Панізоўя і Северщчыны. Гісторыя Гомельскага дэканата / У. Васькоў. – Мінск : Про Хрысто, 2011. – 360 с.

16. Викс, Т.Р. «Мы» или «они»? Белорусы и официальная Россия, 1863–1914 / Т.Р. Викс // Российская империя в зарубежной историографии. Работы последних лет : антология / сост. П. Верт [и др.]. – М. : Новое изд-во, 2005. – С. 589–607.

17. Винтер, Э. Папство и царизм / Э. Винтер. – М. : Прогресс, 1964. – 531 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

18. Вишленкова, Е.А. Религиозная политика : официальный курс и «общее мнение» России Александровской эпохи / Е.А. Вишленкова. – Казань : Форт диалог, 1997. – 188 с.
19. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дап. / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – 319 с.
20. Владимиров, А.П. История плана располячения католицизма в Западной России / А.П. Владимиров. – М. : Рус. обозрение, 1896. – 122 с.
21. Владимиров, А.П. О положении православия в Северо-Западном крае / А.П. Владимиров. – М. : Рус.обозрение, 1893. – 92 с.
22. Воейков, Н.Н. Церковь, Русь и Рим / Н.Н. Воейков. – Минск : Лучи Софии, 2000. – 656 с.
23. Вортман, Р. «Официальная народность» и национальный миф российской монархии XIX века / Р. Вортман // РОССИЯ / RUSSIA. – Вып. 3 (11) : Культурные практики в идеологической перспективе. Россия, XVIII – начало XX века. – М. : ОГИ, 1999. – С. 233–244.
24. Воцелка, К. История Австрии: культура, общество, политика / К. Воцелка. – М. : Изд. Весь мир, 2007. – 512 с.
25. Вульпиус, Р. Вестернизация России и формирование российской цивилизаторской миссии в XVIII веке / Р. Вульпиус // Imperium inter pares : Роль трансферов в истории Российской империи (1700–1917) : сб. ст. / ред. М. Ауст, Р. Вильпиус, А. Миллер. – М. : НЛО, 2010. – 392 с.
26. Ганчар, А.И. Римско-католический костёл в Беларуси (1864–1905 г.) / А.И. Ганчар. – Гродно : ГГАУ, 2008. – 276 с.
27. Ганчарук, І. Каталіцкія манаскія ордэны на Беларусі ў 1770–1820-ыя гады / І. Ганчарук // [Электронны рэсурс] Наша вера. – 2004. – № 4. – Рэжым доступа : http://www.media.catholic.by/nv/n30/art15.htm. – Дата доступа : 12.03.2012.
28. Ганчарук, І. Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай царквы (1772 – 1830 гг.) / І. Ганчарук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 1. – С. 39–46.
29. Ганчарук, І. Становішча і арганізацыйная структура рымска-каталіцкага касцёла на беларускіх землях у складзе Расейскай імперыі / І. Ганчарук // Гістарычны альманах. – 2002. – Т. 6. – С. 97–116.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

30. Гаранова, Е.П. Церковное право в правовой системе российского общества (общетеоретический и исторический аспекты) : автореф. дис. … канд. юрид. наук : 12.00.01 / Гаранова Е.П. ; Костромской гос. технол. ун-т. – Нижн. Новгород, 2004. – 27 с.

31. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII ст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2004. – 343 с.

32. Горизонтов, Л.Е. «Большая русская нация» в имперской и региональной стратегии самодержавия / Л.Е. Горизонтов // Пространство власти: исторический опыт России и вызовы современности / под ред. Ананьич Б.В., Барзилова С.И. – М. : Мос. общ. науч. фонд, 2001. – С. 129–150.

33. Горизонтов, Л.Е. Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше ( XIX–нач. XX в.) / Л.Е. Горизонтов. – М. : Индрик, 1999. – 272 с.

34. Горчаков, М. О тайне супружества / М. Горчаков. – СПб. : Синод. тип., 1880. – 384 с.

35. Грекулов, А.Ф. Церковь, самодержавие, народ (вторая половина XIX – начало XX вв.) / А.Ф. Грекулов. – М. : Наука, 1969. – 237 с.

36. Григоровский, С. О разводе. Причины и последствия развода и бракоразводное судопроизводство. Историко-юридические очерки / С. Григоровский. – СПб. : Синод. тип., 1911. – 344 с.

37. Гуденица, А.Н. Правовой статус Русской православной церкви: нормативно-институциональный аспект: автореф. дис. … канд. юрид.наук: 23.00.02 / А.Н. Гуденица ; Северо-кавказ. науч. центр. высш. шк. – Ростов-на-Дону, 2002. – 25 с.

38. Декларация о правах и достоинстве человека X Всемирного Русского Народного Собрания // Официальный портал Русской Православной Церкви [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http:// www.mospat.ru/index.php?page=30728. – Дата доступа: 3.09.2012.

39. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі / пад рэд. М.М. Нікольскага [і інш.] : у 3 т. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1936–1953. – Т. 2. – 423 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

40. Дело во вторую инстанцию духовного суда о расторжении брака супругов Аркадия и Амелии Корвин-Коссаковских. 1902 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (НГАБ у г. Мінску). – Фонд 1781. – Воп. 21. – Спр. 44.

41. Дело о введении в иноверческих церквях дополнительной службы на русском языке. 1870 г. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 2185.

42. Дело о взыскании строгого выговора ксендзу Домашевичу за совершение без разрешения крестного хода в ограде костёла // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 2845.

43. Дело о взыскании штрафа за совершение без разрешения крестного хода с настоятеля Сегневичского костёла ксендза Буйко // НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 2552.

44. Дело о вступлении в брак Брониславы Толярчик при существовании первого ея брака. 1902 г. // НГАБ у г. Минску. – Фонд 1781. – Воп. 21. – Спр. 67.

45. Дело о двоебрачии ВладимираЭльяшевича 1884 г. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 20. – Спр. 12.

46. Дело о доставлении сведений католическими деканами о количестве намечавшихся в 1882 г. крестных ходов и о количестве командированных ксендзов в приходы вспомощь настоятелям // НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 8. – Спр. 701.

47. Дело о запрещении консистории расторжения браков разным лицам. 1903–1904 гг. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 36962.

48. Дело о запрещении разным лицам расторжения брака. 1902–1903 гг. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 36870.

49. Дело о наложении епитимии на священника Сторожовецкой церкви Мозырского уезда Ф. Струковского за нарушение обряда венчания. 1896–1898 гг. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 36601.

50. Дело о наложении штрафа на помещика Конопинского Николая за уход из костёла в момент начала богослужения за здравие царя. 1868–1869 гг. // НГАБ у г. Гродна. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 1313.

51. Дело о переводе воспитанников Минско-Могилёвской семинарии в священнический сан. 1865–1867 гг. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 1753.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

52. Дело о разрешении крестьянину Мозырского уезда Д. Барану вступить во второй брак в связи с многолетним отсутствием первой жены. 1863–1867 гг. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30360.

53. Дело о расторжении брака между И. Ястржембцем-Демяновичем и Е. Старатанович в связи с болезнью первого. 1863 г. // НГАБу г. Мінску. – Фонд 136. – Воп. 1. – Спр. 30154.

54. Дело о расторжении брака супругов графов Михаила и Марии княжны Радзивилл Тышкевичей. 1884 г. // НГАБ у Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 1. – Спр. 8918.

55. Дело о ходатайстве католиков допустить богослужение и проповеди на их родном языке. 1884–1904 гг. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 1781. – Воп. 1. – Спр. 46.

56. Дело об обнаружении в подвале Бялыничского римско-католического костёла Могилёвского уезда пуль и свинца. 1866–1867 гг. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 181.

57. Дело об обнаружении при разборе органа в закрытом Горецком костёле книг, бумаг и фотографий революционного содержания. 1866–1867 гг. // НГАБ у г. Мінску. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 183.

